№ 27 (433) 21 ліпеня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Адмарожаны сьпёкай**
Андрэй Хадановіч.
старонка 18

**«Беларуская стае мовай багатых»**
Гутарка з Алегам Трусавым.
старонка 5

**Як азяркоўцы сьвятыню ад папа абаранялі**
Сяляне супраць крымінальнікаў.
старонка 8

# Бэш адказаў за Буша

Зь Беларусі высланы прафэсар **Тэры Бэш (на фота)** зь дзвьюма малымі дочкамі. Хто ён і што ён быў? **Замежнікі ў Беларусі**: шчырая любоў да краіны, панічны страх уладаў і поўная зьмена звычак. Яны пазьбягаюць тэлефонных размоваў, кантактаў зь незнаёмымі, ніколі не выкладаюць з кішэні пашпарт. Дасьледуе **Алесь Кудрыцкі**. Старонка3.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## ПАЛІТЫКА

**Два берагі ў адной ракі**

Візыт у Менск шэфа Бюро нацыянальнай бясьпекі Польшчы Ежы Бара прайшоў незаўважана. Апроч сьціслага паведамленьня БелТА пра тое, што ў госьця з Варшавы адбылася сустрэча зь дзяржсакратаром Рады бясьпекі Генадзем Нявыгласам, СМІ ніяк не адрэагавалі. Польскія мас-медыя таксама былі незвычайна маўклівыя. **Старонка 2.**

## З УСЁЙ КРАІНЫ

**Магілёўскія дзівосы**

Сярэдняя тэмпэратура тыдня — 30 градусаў. Плавяцца мазгі. Юпітэр зайшоў за Вэнэру, а Леў апынуўся ў доме Блізьнятаў. У Магілёве — каскад няшчасных выпадкаў і злачынстваў. Піша Аляксей Бацюкоў. **Старонка 7.**

## З УСІХ СТАРОН

**Магнітнае ашуканства**

Польскія базары, таўкучкі ды інтэрнэт-аўкцыёны займелі ў асартымэнце навамодную «фішку» — нэадымавыя магніты. Лічыльнік вады ці току перастае спраўна адлічваць кубамэтры ці кілявати, калі прычапіць да яго такую штуку. І хоць гэта, калі казаць без эўфэмізмаў, прылада крадзяжу, людзі адрываюць такія магніты з рукамі. **Старонка 11.**

## КАМЭНТАРЫ

**Ад Res Privata да Рэспублікі**

Ліпень — месяц своеасаблівых сьвятаў, якія так ці інакш выконваюць «нацыязлучальную» функцыю, «гатуюць» народ, піша Пётра Рудкоўскі. **Старонка 14.**

## У цэнтры ўвагі беларускіх паслоў

МЗС чакаюць кадравыя ратацыі на міністэрскім і пасольскім узроўні. Таму сярод сваіх галоўных задач кіраўнікі МЗС і беларускія паслы найбольш абмяркоўвалі на менскім сэмінары пэрспэктывы найбліжэйшай будучыні. Аналіз–прагноз **Рамана Якаўлеўскага**.

Як запэўнілі ў МЗС, цяперашняя праграма вучобы дыпламатаў, што праходзіць падчас іх летніх адпачынкаў, мае больш прыкладны, чым тэарэтычны характар. Перад тым як звазіць на айчынныя прадпрыемствы, кіраўнікам замежных установаў, большасьць зь якіх маюць ранг надзвычайнага і паўнамоцнага пасла, ставілі на менскім сэмінары новыя задачы ў замежнапалітычнай і эканамічнай дзейнасьці Беларусі. Задачы гэтыя агучвалі рэктар Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнце Станіслаў Князеў, міністар замежных спраў Сяргей Мартынаў, намесьнік міністра эканомікі Андрэй Тур. Наколькі іх бачаньне міжнародных рэалій і пэрспэктыў для Беларусі супадала з тым, што бачаць і адчуваюць у сваёй штодзённай замежнай рабоце беларускія дыпляматы, сказаць цяжка.

Працяг на старонцы 14.

## У начоўках плешчацца мора

Зьезд беларусаў сьвету прайшоў на аптымістычнай ноце. Згуртаваньне беларусаў сьвету ўзначалілі **Алесь Марачкін** і **Алена Макоўская**. Рэпартаж **Алега Раяўца**.

Да самага пачатку зьезду не было пэўнасьці, што ён адбудзецца. Супрацоўнікі Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» апошні тыдзень днявалі і начавалі ў сваім офісе, вырашаючы ўсе справы — ад сустрэчы ў аэрапорце, разьмяшчэньня ў найлепшых гатэлях да наяўнасьці DVD-камэры.

Працяг на старонцы 12.

**Дык падпісвайся!**

На любой пошце можна аформіць падпіску на ліпень—сьнежань. Падпісны індэкс газэты «Наша Ніва» 63125. Падпіска для прыватных асобаў будзе каштаваць 4510 рублёў у месяц, для арганізацыяў — 5631 рубель. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3340 рублёў на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень.

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

### Экспарт культуры

Беларусь застаецца краінай вялікай культуры. Культуры, якая рэагуе і на якую рэагуюць. Як на новую выставу Арлена Кашкурэвіча (**старонка 9**). Ці на рок «Партызону» (**старонка 10**).

На тым тыдні зьявіліся таксама адразу тры этапныя кнігі.

Дзяржаўнае выдавецтва «Беларуская энцыкляпэдыя» надрукавала першы том шыкоўнай энцыкляпэдыя «Вялікае Княства Літоўскае»: на крайдаванай паперы, з рэдкімі ілюстрацыямі, якія сабраў аўтар бэстсэлеру «Краіна Беларусь» Зьміцер Герасімовіч.

Іншая дарагая ва ўсіх сэнсах навінка называецца «Ix Мроя. Ix N.R.M.». Пра рокераў напісаў Віктар Дзятліковіч, тэлерэпартэр каналу «Расія», які паходзіць зь Беларусі — той самы, які рыхтаваў рэпартаж зь месца забойства Масхадава. Кнігу выдаў «Сучасны літаратар».

А ў «Лімарыюсе» выйшаў эпісталяр Ларысы Геніюш «Каб вы ведалі». 355 каштоўных лістоў сабраў і апрацаваў Міхась Скобла.

Не малыя для сваіх жанраў і наклады ўсіх выданьняў. Рэцэнзіі на іх мы рыхтуем у наступныя нумары «НН».

У гэтым кантэксьце як даўно чаканае і належнае ўспрымаецца вестка, што зь верасьня ў Гарвардзкім унівэрсытэце пачнуць выкладаць беларускую мову. Як і ініцыятыва шэрагу духоўных асобаў аб вылучэньні на Нобэлеўскую прэмію ў галіне літаратуры народнага паэта Рыгора Барадуліна.

Змаганьне за прэміі — частка складанай лягістычнай задачы: адкрыць нашу культуру сьвету. Гэтак і дыпламаты мараць пра вяртаньне краіны ў мэйнстрым эўрапейскай гісторыі (**старонка 14**). Гэтак і гаспадарнікі займаюцца інтэграцыяй гаспадаркі ў эўрапейскую эканоміку. Прычым усе б'юцца над праблемай выкарыстаньня выгадаў і пераадоленьня заганаў наяўнае палітычнае сыстэмы для вырашэньня сваіх задачаў.

# Два берагі ў адной ракі

У адносінах Менску і Варшавы нарастаюць ускладненьні, якія могуць трансфармавацца ў вялікую праблему. Каб гэтага пазьбегнуць, бакі спрабуюць абмяркоўваць наяўную сытуацыю на розных узроўнях. Шэф Бюро нацыянальнай бясьпекі Польшчы Ежы Бар сустрэўся зь дзяржсакратаром Рады бясьпекі Генадзем Нявыгласам. Піша **Раман Якаўлеўскі**.

Візыт у Менск шэфа Бюро нацыянальнай бясьпекі Польшчы Ежы Бара прайшоў амаль не заўважана. Толькі БелТА сьцісла паведаміла, што госьць з Варшавы сустрэўся зь дзяржсакратаром Рады бясьпекі Генадзем Нявыгласам. Астатнія СМІ ніяк не адрэагавалі на падзею. Польскія мас-мэдыя таксама былі незвычайна маўклівыя.

У паведамленьні БелТА гаварылася толькі, што суразмоўнікі выказалі пункты гледжаньня абодвух бакоў на сытуацыю вакол Саюзу палякаў Беларусі і на шэраг міжнародных праблем. У тым ліку і ў сфэры супрацоўніцтва. Паводле некаторых зьвестак, супэрзакрытая сустрэча адбылася ва ўрадавай рэзыдэнцыі ў Заслаўі.

Каб зразумець тое, што адбылося, варта прыгадаць некаторыя падзеі, якія папярэднічалі сустрэчы пад Менскам і пасьля яе. Насуперак пашыранай думцы, перапалка з высылкай «вока за вока» беларускіх і польскіх дыпламатаў пачалася не з аб'яўленьня ўладамі непажаданай пэрсонай дарадца польскага пасольства Марка Буцькі. Спачатку польскія ўлады «папрасілі» з Варшавы супрацоўніка беларускай амбасады К., які афіцыйна загадваў пытаньнямі бясьпекі. Выгнаньне Буцькі стала толькі адказам Менску на гэтае рашэньне Варшавы. І ўсё гэта адбывалася на фоне сытуацыі вакол Саюзу палякаў Беларусі.

Трэба меркаваць, зразумелая занепакоенасьць па той бок Бугу неспрыяльным разьвіцьцём дачыненьняў з суседам на другім баку і падштурхнула Варшаву ініцыяваць сустрэчу шэфа Бюро нацыянальнай бясьпекі Ежы Бара са сваім беларускім калегам. Трэба адзначыць, што гэта першая такая сустрэча Бара ў новай якасьці. Да нядаўняга часу ён працаваў паслом Польшчы ў Вільні. І няма сумневаў, што Ежы Бар цалкам валодае пытаньнямі рэгіянальнага супрацоўніцтва і бясьпекі. Гаворачы пра сустрэчу Бара зь Нявыгласам, прэс-сакратар МЗС Польшчы Аляксандар Хэцька сказаў: «Размова насіла дзелавы характар, і ёсьць надзея, што такія сустрэчы працягнуцца. Справы, якія выклікаюць эмоцыі і зацікаўленасьць мас-мэдыя, павінны адысьці на другі плян. А бакі спрабуюць вырашыць існуючыя праблемы папартнэрску, каб палепшыць нашы адносіны».

Аднак пасьля сустрэчы ў Заслаўі адбыўся новы ўсплёск нэгатыўных праяў паміж Менскам і Варшавай. Спачатку ў Ашмянах быў з шумам затрыманы намесьнік старшыні СПБ Ю.Пажэцкі. А затым настала чарга новага патрабаваньня беларускіх улад. Гэтым разам Беларусь мусіў пакінуць кіраўнік консульскага аддзелу ў Менску Анджэй Бучак. У афіцыйным паведамленьні МЗС Беларусі адзначаецца, што гэтае патрабаваньне ўзьнікла ў адказ на прынятае рашэньне польскіх улад выслаць намесьніка пасла Беларусі ў Варшаве Максіма Рыжанкова. Як прызнаў прэс-сакратар МЗС Польшчы, «гэтае рашэньне магло б быць перагледжана ў выпадку, калі б былі выкананы патрабаваньні польскага боку адносна Саюзу палякаў. Гэта для нас галоўнае». Калі ўсё, што адбываецца, і ёсьць вынікам «дзелавой размовы» Бара зь Нявыгласам, дык надзей на хуткае вырашэньне ўзьніклых спрэчак на абодвух берагах Бугу застаецца мала.

Былы пасол Польшчы ў Беларусі Марыюш Машкевіч у інтэрвію газэце «Жэчпасполіта» заявіў, што ў дадзеным выпадку палітыка польскага МЗС — гэта «дыпляматычная гульня». Такая крытыка апанэнта палітыкі цяперашняй улады ў Варшаве можа быць выклікана парлямэнцкімі і прэзыдэнцкімі выбарамі ў Польшчы, пасьля якіх можна чакаць натуральных кадравых зьмен у эшалёнах польскай улады. У тым ліку і ў МЗС. Але ёсьць і такія наглядальнікі, якія схільны зьвязваць дыпляматычную гульню, што распачалася пасьля візыту Ежы Бара, зь візытам у Менск намесьніка міністра замежных спраў Расеі Рыгора Карасіна. Бо замежная ж палітыка ў партнэраў па саюзным будаўніцтве ўзгадняецца. Вось і выходзіць, што як толькі Пуцін «пахаладнеў» да свайго нядаўняга сябра Квасьнеўскага, дык цёзка свайго раўналетка з-за Бугу і зусім вырашыў учыніць «замаразкі».




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Беларуская Энцыкляпэдыя» выдала энцыкляпэдыю «Вялікае Княства Літоўскае». На фота: рэдактар Ларыса Языковіч з навінкай.**

## IN MEMORIAM

### Аляксандра Бэргман

Здаецца, побач дзьве краіны, але пра сьмерць Аляксандры Бэргман я даведаўся толькі на другі дзень Зьезду беларусаў сьвету.

Хава (Эва) Кучкоўская, дачка Гірша-Мойшы і Цыны Кучкоўскіх з Горадні, нарадзілася ў рэвалюцыйным 1906-м у дзень Сьвята працы, калі па ўсёй імпэрыі адбываліся дэманстрацыі пад чырвонымі сьцягамі.

Яшчэ гімназісткаю яна, дачка загадчыка складу на гарадзенскай тытунёвай фабрыцы Шарашэўскага, стала камсамолкаю, падпольшчыцаю, а з 19 гадоў — камуністкаю. Горадня, Берасьце, Баранавічы, Вільня... У розных гарадох і мястэчках Заходняе Беларусі пад рознымі імёнамі яна выконвала даручэньні партыйнага кіраўніцтва. Яна была ідэйнаю камуністкаю: апынуўшыся ў СССР, папрасілася працаваць на завод, вывучылася на зваршчыцу; трапіўшы на восем год у ГУЛАГ, не расчаравалася ў камунізьме. Застаючыся дачкою свайго народу, яна для многіх стала ўзорам інтэрнацыяналісткі.

З пачатку 1960-х імя Аляксандры Бэргман стала прыцягваць увагу чытачоў беластоцкіх «Нівы» і «Беларускага календара». Яна адчула свой маральны абавязак пісаць пра тых, побач з кім прайшла яе рэвалюцыйная маладосьць і хто — у большасьці выпадкаў — быў ператвораны ў «лягерны пыл». Гэта былі людзі, якіх партыя прывабіла і ашукала. Яна пісала пра тых, пра каго ў БССР не пісалі адмыслова, — Тарашкевіча, Дварчаніна, Рак-Міхайлоўскага, Мятлу, Валошына... І пра тых, хто не паддаўся чарам бальшавізму і быў праклятьі ў БССР «навечна», — найперш пра Антона Луцкевіча...

Для тых, хто пачынаў і пачынае вывучаць трагічную гісторыю Беларускае рэвалюцыйнае арганізацыі, беларускае сацыял-дэмакратыі, БСРГ і КПЗБ, артыкулы, манаграфіі і кнігі Аляксандры Бэргман зьяўляюцца незаменнымі дапаможнікамі.

І ня трэба думаць, што ў тагачаснай Польшчы, у якой жыла А.Бэргман, былі спрыяльныя ўмовы для дасьледчыкаў. «Старэйшы брат» сачыў за тымі публікацыямі. Ужо ў новых умовах аўтарка падзялілася ўспамінамі, як ёй даводзілася вяртаць імя А.Луцкевіча, якія перашкоды пры гэтым адольваць... Кніга пра Тарашкевіча мусіла доўга «адлежвацца» яшчэ і таму, што ў аўтаркі была «ня тая» нацыянальнасьць, а ў Польшчы з 1968 г. паднялася хваля паўафіцыйнага антысэмітызму...

Як піша Алена Глагоўская, пра турботы, зьвязаныя з публікацыяй сваіх прац, А. Бэргман напісала ўспаміны, якія яшчэ чакаюць выдаўца.

Яе пахавалі на Габрэйскіх могілках у Варшаве. Над яе дамавінаю прамаўлялі беларус Алесь Барскі і паляк, даўні дасьледчык беларускае праблематыкі Ежы Тамашэўскі.

У смутку схіляючы галаву перад памяцьцю Аляксандры Бэргман, мы ўшаноўваем нашу суайчынніцу і выдатнага беларускага гісторыка.

**Анатоль Сідарэвіч**

### Сэанс адначасовай гульні

Сэанс адначасовай гульні 19 ліпеня, дзе чытачы і аўтары «НН» на васьмі дошках выпрабоўвалі сілу міжнароднага гросмайстра ІКЧФ, шахматнага арбітра міжнароднай катэгорыі Зьмітра Лыбіна, скончыўся на карысьць сэансэра. Ганаровы госьць рэдакцыі атрымаў шэсьць перамог, дзьве партыі зьвёў унічыю. «Узмок», — вось і ўсё, што ён сказаў пасьля сэансу. Асабліва ўпарта супраціўляліся выхаванцы трэнэра Алеся Станішэўскага, не адпускаючы гросмайстра больш як тры гадзіны.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Дзень адʼезду супаў з днём народзінаў малодшай дачкі Тэры Бэша. Бацька проста на вакзале падараваў ёй букет валошак.

# Тэры Бэш: Дочкі плакалі, баючыся арышту

Перад самым ад'ездам зь Беларусі амэрыканскі прафэсар знайшоў час, каб адказаць на пытаньні карэспандэнта «НН».

**«НН»: Спадар Бэш, чаму вы вырашылі прыехаць у Беларусь?**

**Тэры Бэш:** Я вельмі люблю славянскія народы. 100 год таму мая бабуля эмігравала з Польшчы ў ЗША. За часамі халоднай вайны я нават у марах ня мог спадзявацца, што некалі змагу наведаць Усходнюю Эўропу. Але сытуацыя зьмянілася. Пяць год таму я меў магчымасьць выкладаць у Літве. Але хацелася пажыць яшчэ і сярод славянаў, таму я быў вельмі ўзрадаваны, калі БДУ запрасіў мяне ў Менск.

**«НН»: Пасьля таго як Вам было прад'яўлена патрабаваньне пакінуць краіну, вы заявілі, што баіцеся за бясьпеку сваіх дзяцей. Вы сапраўды лічыце, што ўсё настолькі сур'ёзна?**

**ТБ:** Вы павінны разумець сытуацыю. 13 ліпеня ўрад падоўжыў візу на 30 дзён. Але ў пятніцу мяне выклікалі ва ўнівэрсытэт а 5-й вечара і паведамілі, што я мушу пакінуць краіну цягам дзьвюх гадзін. Можаце ўявіць стан, у якім я вяртаўся дахаты. Ні ў мяне, ні ў маіх дзяцей не было на руках пашпартоў — яны знаходзіліся ў міграцыйнай службе. І ў мяне былі ўсе падставы меркаваць, што мяне й дзяцей сілай могуць вывезьці на беларускую мяжу. Дочкі плакалі, бо баяліся, што нас усіх арыштуюць. Толькі пасьля таго, як амэрыканскія дыпляматы зьвязаліся з МЗС, беларускія ўлады згадзіліся пачакаць некалькі дзён, пакуль нам не аддадуць пашпартоў.

**«НН»: Калі ў будучыні зьявіцца магчымасьць вярнуцца ў Беларусь, ці скарыстаецеся Вы ёй?**

**ТБ:** Я ўсім сэрцам жадаю вярнуцца. Усё што адбылося, вельмі балюча. Я адчуваю, што ўва мне нешта памерла на гэтым тыдні.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

# Бэш адказаў за Буша

Чарговай ахвярай зачысткі Беларусі ад лішніх замежнікаў стаўся прафэсар з ЗША Тэры Бэш. Два гады таму ён прыехаў у Менск выкладаць міжнароднае права ў БДУ. З бацькам паехалі дзьве дачкі 10 і 13 год, жонка засталася ў Амэрыцы. Дзяцей вучылі беларускія настаўнікі.

Апошнім вялікім праектам Тэры Бэша была арганізацыя ў БДУ буйной студэнцкай канфэрэнцыі ў красавіку, у якой удзельнічалі больш за 500 студэнтаў з 27 беларускіх і замежных унівэрсытэтаў. Ён таксама зладзіў на базе БДУ курсы ангельскай мовы, прычым недарагія — тыдзень інтэнсіўнага навучаньня каштаваў 54 тыс. Рэпэтытары бяруць столькі за тры гадзіны, а тут — ажно сем дзён.

Апроч гэтага, Тэры Бэш падарыў школам 40 тысячаў падручнікаў па ангельскай мове, бясплатна працаваў у праекце Нацыянальнай бібліятэкі, зьвязаным зь перакладамі з беларускай мовы, прывёз з Амэрыкі тузін лектараў ды патэнцыйных інвэстараў, а летась адмыслова езьдзіў у Нігерыю, дзе дапамагаў адбіраць 53 студэнты, якія пасьля прыехалі на вучобу ў Беларусь.

Што праўда, як мы даведаліся, Тэры Бэш у прыватных гутарках даваў інфармацыю пра курсы ангельскай мовы, якія ладзяць у Беларусі амэрыканскія пратэстанцкія суполкі, аднак рабіў гэта ненавязьліва і ня ў зьвязку са сваёй выкладчыцкай дзейнасьцю.

## Апалітычны прафэсар

Тэры Бэш кажа, што пазьбягаў палітыкі на любых узроўнях. «Я ні разу не выказаў незадаволеньня ўладамі гэтай краіны», — напісаў ён у лісьце на Хартыю'97. Прафэсар ні разу ня браў удзелу ў палітычных акцыях і нават зьвёў да мінімуму свае кантакты з пасольствам ЗША.

Аднак, нягледзячы на гэта, пасьля прызначэньня Васіля Стражава рэктарам БДУ Тэры Бэш пачаў адчуваць ціск з боку ўнівэрсытэцкай адміністрацыі. Ён узмацніўся цягам апошніх трох месяцаў. Цяпер зразумела, да чаго ўсё ішло. «Я думаю, што я апошні чалавек з Захаду ў Беларусі, які спрабаваў зразумець беларускія ўлады і працаваць зь імі, каб дапамагчы гэтай краіне. Я ўпэўнены, што цяпер сытуацыя для беларускіх уладаў безнадзейная. Вяртаньня назад няма», — сказаў Тэры Бэш, ад'яжджаючы з дачкамі ў Літву.

## Замежнікі баяцца

Уладзіслаў Белавусаў, выпускнік факультэту міжнародных адносінаў і арганізатар інтэрнэт-рэсурсу praunik.org, кажа, што студэнты зболышага пазытыўна адгукаліся пра тое, як Бэш вёў лекцыі, хоць некаторыя і лічаць, што ягонаму выкладаньню бракавала сыстэмнасьці. «Цалкам звычайны амэрыканскі дзядзька, — кажа Уладзіслаў, — толькі кімсьці страшэнна запалоханы».

Чаму замежныя выкладчыкі ды лектары прыяжджаюць у Беларусь? Для многіх выкладчыцкая праца за мяжой, тым больш — у экстрэмальных умовах Усходняй Эўропы — добры дадатак у рэзюмэ, які дазволіць падняцца па кар'ернай лесьвіцы. Да таго ж, жывуць яны тут найчасьцей не на беларускія заробкі, а на грошы, якія атрымліваюць з-за мяжы — хто з дабрачынных фондаў, хто ад сваіх унівэрсытэтаў. Гэта дае магчымасьць няблага зэканоміць, улічваючы недарагі кошт жыцьця ў Беларусі.

Гутарачы з тымі замежнікамі, хто жыве ў Беларусі больш чым паўгоду, заўважаеш дзьве агульныя рысы: яны пачынаюць шчыра любіць гэтую краіну і панічна баяцца беларускіх уладаў. Яны цалкам мяняюць звычкі: пазьбягаюць тэлефонных размоваў, шчырых гутарак у тлумных рэстарацыях, ніколі не выкладаюць з кішэні пашпарт і не пагаджаюцца на інтэрвію. Ад'яжджаючы на час з кватэраў, замежнікі адмысловым чынам кладуць вопратку ці аркушы паперы, каб потым пераўнаць, ці ня было ў доме няпрошаных гасьцей.

Адзін зь немцаў расказваў гісторыю пра тое, што, вярнуўшыся дадому і зайшоўшы ў лазенку, ён быў шакаваны — нехта памяняў месцамі кранікі, што пазначаюць гарачую і халодную ваду, нібыта падказваючы: «мы за табой віжуем».

Тэры Бэш баяўся за сваіх дзяцей. Камусьці гэта можа падацца паранояй. Але, можа быць, гэта мы прызвычаіліся і нічога не заўважаем, а яны ацэньваюць сытуацыю адэкватна? Бо тое, што ты не займаесься палітыкай, зусім ня значыць, што ў цябе ня могуць узьнікнуць праблемы.

Тэры Бэш — другі пасьля Алана Флаўэрза, брытанскага дасьледчыка чарнобыльскіх праблемаў, прыклад, калі яўна дзеля палітычных патрэбаў дэпартуюць цалкам апалітычных людзей. Гэта кажа пра тое, што ўлады хацелі б зьвесьці любую замежную актыўнасьць да нуля. Уладу пужае нават ня крытыка, а любая прысутнасьць заходняга ладу думак. Сам жывы кантакт з іншаземцамі абавязкова прывядзе да росту незадаволенасьці сучасным станам рэчаў у краіне, — так, бадай, мяркуюць у «кампэтэнтных органах».

**АК**

**Сёлета з краіны былі па палітычных прычынах былі высланыя ўжо 9 замежніка – абсалютны рэкорд за час прэзыдэнцтва Аляксандра Лукашэнкі. А год жа яшчэ ня скончыўся...**

Сваю першую гучную высылку малады рэжым зьдзейсьніў у 1995 г. Марыюша Кшаклеўскага, лідэра польскай «Салідарнасьці» абвінавацілі ў агітацыі супраць уладаў. У 1996 была дэпартаваная група актывістаў украінскай арганізацыі УНА–УНСО, гасьцей гарачай вясны–96. У 1997 Беларусь пакінуў карэспандэнт НТВ Аляксандар Ступнікаў: уладам не спадабалася тое, як расейскі тэлеканал асьвятляе беларускія падзеі. У тым жа годзе быў высланы Пітэр Бэрн, кіраўнік Беларускага Фонду Сорасу. Потым замежнікам далі «перадышку», але ў 2001 г. выслалі ўжо трох чалавек: пэрсонаю нон грата быў абвешчаны першы сакратар пасольства ЗША Серж Аляксандраў. Былі высланыя таксама Робэрт Філдынг, супрацоўнік Цэнтру салідарнасьці Амэрыканскай федэрацыі працы – Кангрэсу прамысловых прафсаюзаў і супрацоўнік Чэскага гуманітарнага фонду «Чалавек у нядолі» Міхал Плавец. У 2002 праблемы займеў лідэр СПС Барыс Нямцоў, у 2003–сябры крыла «Маладыя сацыялісты» СДП Нямеччыны Ян Буш і Штэфан Кэмэрлінг, дарадца віцэ–прэм'ера Польшчы Катажына Матушэўская і карэспандэнт НТВ Павал Селін. У 2004 г. выслалі брытанскага вучонага Алана Флаўэрса, журналіста Міхаіла Падаляка і ваеннага аташэ польскай амбасады Казімежа Віташчыка. У 2005 дэпартавалі пяцёра актывістаў украінскай моладзевай арганізацыі «Нацыянальны альянс», чэскага дыплямата Паўла Кжываглавага і польскіх дыплыматаў Марка Буцьку і Анджэя Бучака.

## СЬЦІСЛА

### Рыхтуецца трансгенная бульба

У найбліжэйшыя семвосем гадоў у Беларусі зьявіцца трансгенная бульба, устойлівая да каларадзкага жука. Акадэмія навук ужо распрацоўвае ген устойлівасьці. Пра гэта заявіў на прэс-канфэрэнцыі ў Менску намесьнік кіраўніка Нацыянальнага каардынацыйнага цэнтру біябясьпекі Барыс Аношанка. Ён таксама лічыць беспадстаўнымі непакоі, што жук хутка прыстасуецца да трансгеннай бульбы.

### Зьніжэньне стаўкі рэфінансаваньня

Стаўка рэфінсаваньня і ўліковая стаўка Нацбанку з 20 ліпеня зьніжана на адзін працэнтны пункт, да 12% гадавых. Гэта пятае зьніжэньне стаўкі сёлета, папярэдняя стаўка была ўсталявана з 1 чэрвеня.

### Несуцяшальныя лічбы

Каля 75 тыс. чалавек памірае штогод ад захворваньняў сыстэмы кровазвароту. Пра гэта паведаміў журналістам дырэктар НДІ «Кардыялёгія» Ігар Адзярыха. Цяпер у краіне зарэгістравана 1,7 млн чалавек, што пакутуюць на такія хваробы, і з кожны годам такая лічба расьце.

### Вандалізм па-магілёўску

Невядомыя нахілілі да зямлі ўсталяваны ў абласным цэнтры мэталічны крыж памяці ахвяраў Чарнобылю. Мясцовыя актывісты кажуць, што зроблена гэта было з дапамогай аўтамабільнага тросу. Цяпер для выпраўленьня крыжа патрэбная тэхніка — падняць яго рукамі немагчыма.

### Зірні на Месяц

Незвычайна вялікі Месяц можна пабачыць у ноч на пятніцу. Ля апоўначы ён пройдзе цераз пэрыгей — найбліжэйшую да Зямлі кропку месяцавай арбіты. Адлегласьць ад Месяца да Зямлі складзе 360 тыс. км. Калі ён зьвіцца над даляглядам, яго плошча візуальна павялічыцца на трацііну. Такая зьява назіраецца раз на 20 год.

**АГ; belapan.com, svaboda.org**

# Паміж глябалізмам і тэрарызмам

ВІТАЛЬ ТАРАС

Напярэдадні Зьезду беларусаў свету ў Менску адбыўся круглы стол на тэму «Магчымасьці захаваньня каштоўнасьцяў нацыянальнай культуры ў шматкультурным грамадзтве: досьвед Эўразьвязу й Беларусі». У круглым стале, які праходзіў у будынку, дзе месьціўся некалі славуты Інбелкульт, бралі ўдзел, сярод іншых, дэлегаты зьезду з ЗША Янка Запруднік і Вітаўт Кіпель, а таксама навукоўцы, журналісты, актывісты НДА з рэгіёнаў.

Апошнім часам ня толькі ўлады, але ж і многія грамадзкія арганізацыі ды іх актывісты, якія лічаць сябе прыналежнымі да дэмакратычнага лягеру, імкнуцца адсунуць тэму беларускай саматоеснасьці й нацыянальных каштоўнасьцяў на пэрыфэрыю грамадзкай сьвядомасьці й палітычнага жыцьця.

Як падаецца, галоўнай мэтай арганізатараў дыскусіі было ня столькі пераламіць гэтую тэндэнцыю, колькі разбурыць прыкрыя штампы. Стэрэатыпы часткова перайшлі ў спадчыну з савецкага часу, часткова навязваюцца звонку, але ў аднолькавай ступені яны памылкова падаюцца зручнымі тым палітолягам і палітыкам, якія спрабуюць карыстацца імі ў практыцы. Гэтыя нататкі не адлюструюць выступаў, што гучалі падчас круглага стала. Яны — вынік роздуму, стымулам да якога стала сама дыскусія, а таксама міжнародны ды ўнутрыпалітычны кантэкст, у якім яна адбывалася.

## Новая гістарычная супольнасьць

Самы пашыраны стэрэатып заключаецца ў тым, што нацыі адыгралі сваю ролю ў індустрыяльным грамадзтве і ў наш постындустрыяльны час нацыянальная прыналежнасьць, імкненьне да яе адыходзяць на другі плян. На першы плян замест гэтага нібы выходзяць цывілізацыйная, транснацыянальная, карпарытыўная ды іншыя прыналежнасьці або памкненьні. У будучыні ж нацыі, маўляў, зьнікнуць наагул як суб'екты гісторыі. Гэты тэзіс амаль дакладна паўтарае адзін з галоўных пастулятаў камуністычнай ідэалёгіі аб стварэньні новай гістарычнай супольнасьці людзей.

Неймаверным чынам гэтая абстракцыя атрымала новае ўвасабленьне ў дачыненьні да сучаснай Эўропы. У эўрапейскай Канстытуцыі, забракаванай на рэфэрэндумах у Францыі ды Нідэрляндах, няма згадак пра новую гістарычную супольнасьць, як няма й азначэньня эўрапейскасьці. Але ж спробы ўвесьці ў прэамбулу Канстытуцыі згадку аб хрысьціянскай культуры былі і напэўна яшчэ будуць. Галоўнае ж заключаецца ў спробе стварыць наднацыянальныя органы кіраваньня, здольныя нібыта ўлічыць і праводзіць інтарэсы ўсіх краін — сяброў Эўразьвязу. Такім чынам, гаворка вялася пра стварэньне міжнароднага (у гэтым выпадку пакуль што эўрапейскага) ураду. Наколькі такая схема выглядае сёньня ўтапічнай, пераканаліся, здаецца, самыя ўпартыя прыхільнікі эўрапейскай інтэграцыі. У першую чаргу — у той самай Францыі, якая яшчэ нядаўна была наперадзе Эўропы ў прасоўваньні агульнаэўрапейскай Канстытуцыі, а сёньня прыпыніла дзеяньне Шэнгенскага пагадненьня, аднавіўшы пашпартны кантроль на мяжы з суседнімі краінамі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Так званая «Беларуская народна-вызвольная армія» ў пятніцу распаўсюдзіла паведамленьне аб замініраваньні выканкамаў Маскоўскага, Фрунзэнскага, Ленінскага і Партызанскага раёнаў Менску, філіялу 0101 «Прыёрбанку» на вуліцы Ціміразева і некаторых участкаў чыгуначных шляхоў. Выбуховых прыстасаваньняў міліцыя ня выявіла. Заведзена крымінальная справа. Між тым, знайсьці кампутар, зь якога быў адпраўлены ліст, можна праз IP-адрас, які мае кожная машына.**

## Усе на барацьбу з тэрарызмам!

Але пры гэтым інтэграцыйныя памкненьні зусім не спыніліся. Толькі ў якасьці галоўнай падставы міжнароднай інтэграцыі называецца цяпер ужо барацьба з тэрарызмам. Актывізацыі яе паслужылі нядаўнія тэракты ў Лёндане.

Некалі ў Савецкім Саюзе ў ролі такога ворага, які дапамагаў ідэйна згуртаваць грамадзтва, выступалі амэрыканскі імпэрыялізм і міжнародны сіянізм. У сучаснай Эўропе роля такога ворага адводзіцца ісламу (з агаворкай — экстрэмісцкаму). І вось ужо міністар унутраных спраў Вялікабрытаніі гаворыць пра неабходнасьць збалянсаваньня правоў асобы (на якіх грунтуецца цяпер сыстэма правоў у ЭЗ) і правоў грамадзтва. На практыцы гэта азначае больш жорсткія абмежаваньні на ўезд замежнікаў (перш за ўсё, з краін Усходу), іх магчымасьць уладкавацца на вучобу, больш строгі памежны кантроль, пашырэньне паўнамоцтваў і колькаснага складу адпаведных кантралюючых службаў, абмежаваньне пэўных грамадзянскіх правоў — адным словам, выкарыстаньне досьведу ЗША пасьля тэрактаў 11 верасьня 2001 г.

Між тым у Расеі апошнія антытэрарыстычныя захады ў Лёндане былі ўспрыняты як вельмі зручная падстава зноў патрабаваць выдачы ёй Ахмэда Закаева — дзеяча чачэнскага вызваленчага руху. Наагул вайна з тэрарызмам, абвешчаная Захадам, у Расеі ўспрымаецца як… права на вайну з чачэнскім народам, права здушэньня вызваленчага руху любога народу любымі мэтадамі.



У час глябалізацыі нацыянальная адметнасьць — самы дарагі тавар.

У якасьці апраўданьня выстаўляецца трагедыя ў Бэслане. Як быццам Бэслан папярэднічаў чачэнскай вайне, а не наадварот! Працэс над Кулаевым — адным з удзельнікаў захопу школы ў Бэслане — мог ператварыцца ў фарс, але ператварыўся насамрэч у выкрыцьцё палітыкі фэдэральных уладаў, карумпаванага й некампэтэнтнага начальства ўсіх узроўняў, бяздарнага й злачыннага кіраўніцтва спэцслужбаў, дзеяньні якіх прывялі да жудаснай колькасьці ахвяр. Аднак гэта тэма для асобнага артыкулу…

## Самаізаляцыя як выбар?

Калі ж вярнуцца да галоўнай тэмы — нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў або саматоеснасьці беларускай нацыі, відавочна, што гэтыя працэс, такі пакручасты цягам апошніх ста зь лішкам гадоў, на пачатку новага стагодзьдзя выглядае яшчэ больш ускладненым выклікамі новага часу. Тут і глябалізацыя, і рэакцыя на яе ў выглядзе міжнароднага тэрарызму (а не антыглябалізму, як прынята думаць), і СНІД, і пераразьмеркаваньне ў сфэры міжнароднага падзелу працы, і прывід сусьветнага энэргетычнага крызісу… Сьпіс можна доўжыць. Але што можа проціпаставіць Беларусь гэтым сучасным выклікам? Самаізаляцыю? Спробу законсэрваваць існуючы рэжым на некалькі дзесяцігодзьдзяў? Нават калі ня браць пад увагу магчымыя вынікі такога шляху, беспэрспэктыўнасьць «выбару» відавочная. Уся гісторыя апошніх стагодзьдзяў, як і цяперашняя паводзіны Расеі, падказвае, што Беларусь і надалей будзе адчуваць наймацнейшы ціск зь яе боку, спробы ўцягнуць сябе ў арбіту расейскіх інтарэсаў, калі казаць мякка.

Сёньня крамлёўскае кіраўніцтва, Пуцін з усіх сіл імкнуцца выставіць сябе саюзьнікамі Захаду ў барацьбе з тэрарызмам (хаця ў самой Расеі вагабізм даўно пашырыўся з Каўказу на Паволжа — у Татарстан і Башкартастан). У цяперашнім стане Расеі проста ня вытрымаць новай канфрантацыі з Захадам. Але ж і Захад не зацікаўлены сёньня ў новым крыжовым паходзе на Ўсход. Канфрантаваць з Расеяй у справе Беларусі ўсур'ёз ніводная заходняя краіна не зьбіраецца. Выняткам — хіба ЗША і Польшча, што абумоўлена іх геапалітычным становішчам. Але зноў жа, абедзьве краіны вымушаны лічыцца са сваімі партнэрамі ў NATO, з дэмакратычнымі прынцыпамі ў міжнароднай палітыцы — датуль, пакуль гэта будзе магчыма ў дачыненьні да цяперашняга беларускага рэжыму.

## Не сядзець ды на мора глядзець

У гэтай сытуацыі застацца ў становішчы назіральніка, адседзецца, так бы мовіць, ля мора на неба гледзячы. Беларусь не Швайцарыя. Разьвітая цяжкая індустрыя (флягманы якой патрабуюць мадэрнізацыі) і высокакваліфікаваная рабочая сіла (якая становіцца з кожным годам усё менш кваліфікаванай) — ня тыя козыры, зь якімі можна разьлічваць на нешта ў міжнародным падзеле працы. Адзінае, што можа прад'явіць Беларусь сьвету, на што можа разьлічваць, у чым можа знайсьці паратунак ад зьнікненьня й забыцьця, — гэта яе нацыянальная адметнасьць: у час глябалізацыі адметнасьць — самы дарагі тавар. Мікрасхемы, выробленыя ў Малайзіі ці Індыі, нічым не адрозьніваюцца паміж сабой — таксама як і смак «Кока-колы» ці гумкі «Ўінтэрфрэш». Аднак выраб тавараў для міжнародных карпарацый або выкарыстаньне іх тавараў ня ставяць пад сумнеў будучыню гэтых нацый. Яны выкарыстоўваюць сучасныя тэхналёгіі, дабрoты заходняй цывілізацыі, застаючыся самімі сабой, ня трацячы сваёй культурнай саматоеснасьці. І таму да іх захоўваецца цікавасьць. І ня толькі дзеля экзотыкі, у іх едуць турысты з усяго сьвету. Добрыя пляжы й мора ёсьць і ў Эўропе.

Але аб якой будучыні нацыі, аб якой цікавасьці да яе можна гаварыць, калі сама нацыя атаясамлівае сябе ў найлепшым выпадку з назвай дзяржавы ці яе кіраўніком? Усеагульная расейскамоўнасьць замінае нацыі ня толькі ў маральным пляне, але найперш — у эканамічным. Як адрозьніць, напрыклад, беларускі тавар ад расейскага на ўнутраным рынку, калі абодва рэкламуюцца на расейскай мове? Карэйскія вытворцы, дарэчы, раней за беларускіх зразумелі важнасьць нацыянальнага складніку, пачаўшы разьмяшчаць рэкляму сваіх тавараў, у тым ліку ў Інтэрнэце, па-беларуску.

Размаўляючы на мове іншага народу, некрытычна засвойваючы яго культурныя ды палітычныя каштоўнасьці або штампы, рана ці позна пачнеш блытаць або нават атаясамліваць інтарэсы свайго народу з іншаземнымі. Палітыкі, зразумела, таму і зьяўляюцца палітыкамі, што яны здольны адчуваць настрой большасьці і шукаць кампрамісаў. Але калі ўвесь час ісьці ўсьлед за натоўпам, можна ўрэшце разам з ім апынуцца ў бездані. Альбо яго ўзначаляць зусім іншыя палітыкі.

# «Беларуская стае мовай багатых»

Старшыня ТБМ **Алег Трусаў** абураны намерам «Нямецкай хвалі» распачаць расейскамоўнае вяшчаньне на Беларусь, але ўпэўнены, што перамога будзе за беларушчынай. І канстатуе, што трасянка — гэта ад прыроды.

### На «Дойчэ вэле» акапаліся белагвардзейцы

**«НН»: Якая думка прыйшла вам у галаву, калі Вы пачулі пра пляны «Нямецкай хвалі» стварыць расейскамоўную перадачу для Беларусі?**

**Алег Трусаў:** Я пачуў пра гэта па беларускай «Свабодзе» і вельмі зьдзівіўся, што радыё не зрабіла ніякага камэнтару. Мы накіравалі лісты паслу Нямеччыны, кіраўніку расейскай праграмы «Нямецкай хвалі», пад патранажам якой ствараецца беларуская перадача, а таксама кіраўніку самой радыёстанцыі. Гэта сьмешны аргумэнт: «Калі беларусы ведаюць расейскую мову, дык будзем рабіць па-расейску». Але ж у Нямеччыне шмат хто ведае ангельскую мову — дык давайце «Нямецкую хвалю» на ангельскую перавядзём. Але ёсьць радыё «Швэцыя» па-беларуску, і «Паленія», і перадачы ў Літве ды Латвіі, Радыё Ватыкана, тая ж «Свабода». Цяпер мы вядзём перамовы, каб стварыць на ВВС беларускамоўную службу ці хаця б маленькую перадачу. Калі адказ ад немцаў будзе адмоўны ці яго ня будзе ўвогуле, мы пачнём зьбіраць подпісы грамадзян і дасылаць іх у пасольства Нямеччыны. Мы ведаем, як дасягнуць посьпеху.

**«НН»: Але чаму немцы вырашылі парушыць традыцыю вяшчаньня на Беларусь з-за мяжы пабеларуску?**

**АТ:** Гэта ініцыятыва расейскай рэдакцыі станцыі. Відаць, там акапаліся «былыя белагвардзейцы» з сваёй ідэяй «адзінай і непадзельнай». Калі яны вяшчаюць на Расею па-расейску, дык няхай і вяшчаюць. Але вяшчаць адмыслова на Беларусь па-расейску — такога ня трэба. Лепш няхай яны ніякай перадачы ня робяць, чым будуць рабіць па-расейску.

### Моўнае пытаньне вечнае. Гэта палітыкі зацерліся

**«НН»: Ці не здаецца Вам, што моўнае пытаньне адышло на другі плян, зацерлася нават у самой Беларусі?**

**АТ:** Моўнае пытаньне вечнае. Гэта палітыкі зацерліся. Многім ужо даўно пара на пэнсію, пісаць мэмуары, гадаваць унукаў і не дурыць людзям галавы.

**«НН»: Сярод апазыцыйных палітыкаў ёсьць тыя, хто практыкуе дзьвюхмоўе. Ці апраўданы «тактычны» адыход ад беларускай мовы падчас палітычнай кампаніі з намерам пасьля перамогі вярнуцца да яе?**

**АТ:** Людзі, якія гэта абяцаюць, ніколі так ня зробяць. Калі такі чалавек прыйдзе да ўлады, расейшчына папрэ яшчэ больш. Таму яны да ўлады і не прыходзяць. Такі ўжо наш народ. І тое, што Лукашэнка размаўляў на трасянцы, дало яму шмат балаў, бо наш народ увесь размаўляе на трасянцы.

**«НН»: Дык, можа, насьпела патрэба ў кандыдаце, які прафэсійна валодае трасянкай?**

**АТ:** Штучна такога чалавека ня зробіш: трасянка — гэта ад прыроды.

**«НН»: Ці маюць рацыю тыя, хто лічыць, што палітык, які карыстаецца беларускай мовай, траціць у папулярнасьці?**

**АТ:** Наадварот, гэта заўжды вядзе да павышэньня папулярнасьці. Магу давесьці на ўласным прыкладзе. Яшчэ ў савецкія часы, у 1990-м годзе, я перамог на выбарах у парлямэнт, пры гэтым я сам і ўся мая каманда размаўлялі па-беларуску. Каб размаўляў па-расейску, то прайграў бы. Цяпер рэйтынг беларускай мовы вырас значна. Колас на мінулых парлямэнцкіх выбарах вёў кампанію па-беларуску і па выніках экзыт-полу набраў больш за 60% галасоў.

**«НН»: Існуе думка, што кожны беларус разумее родную мову, нават калі і не прызвычаіўся на ёй размаўляць.**

**АТ:** Я скажу шырэй: кожны чалавек, які доўга жыве ў Беларусі — гадоў дваццаць, — можа быць ці татарынам, ці азэрбайджанцам, а беларускую мову разумее.

**«НН»: Нават у нашых неспрыяльных для мовы ўмовах?**

**АТ:** А нашы ўмовы такія, што ён расейскай мовы нармальнай ня чуе нідзе. І, дарэчы, дзякуючы Лукашэнку. Выступае міністар адукацыі Радзькоў па-расейску і кажа, што школьнікі павінны дапамагаць бацькам зьбіраць «бульбу». Людзі асымілююцца і пераходзяць на трасянку цягам 10—15 гадоў. Я ведаю адну кітаянку, якая на трасянцы размаўляе, на добрай мсьціслаўскай гаворцы. Выйшла замуж за беларуса. Літаратурнай расейскай мовы ў Беларусі ад 5 да 10%. Усё астатняе — беларускае.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Белмоўны брэнд — адразу прыбытак

**«НН»: На якіх франтах наступае беларуская мова?**

**АТ:** У рэкляме і ў гандлёвых марках. Мы кожнаму прадпрымальніку, які па-беларуску зрабіў хоць маленькую назву, пішам падзяку. Як мы падзяку напісалі хлебазаводу №2, дырэктар запрасіў нас у госьці, пачаставаў хлебам і цяпер выпусьціў гатунак «Радзівілаўскі». Цікава, што цяпер вытворцы робяць так: брэнд па-беларуску, вялікімі літарамі, а ўсё астатняе на этыкетцы — дробным шрыфтам па-расейску.

**«НН»: А адкуль гэтая тэндэнцыя зьявілася?**

**АТ:** Бізнэсоўцы зразумелі: як толькі беларускамоўны брэнд — адразу прыбытак. Таму што людзям у вочы кідаецца. Ідзе расейскамоўная балбатня па БТ. Паўза, і пачынаецца рэклама «Самсунгу», «Сьнежкі» ці «Рэно», на добрай беларускай мове, прыгожымі галасамі. Спажывец адразу прачынаецца, запамінае, ідзе і купляе.

> «Лепш няхай яны ніякай перадачы ня робяць, чым будуць рабіць па-расейску».

**«НН»: Які статус набыла цяпер беларуская мова?**

**АТ:** Калі раней яе лічылі «калгаснай», дык цяпер гэта мова эліты — пісьменьнікаў, інтэлігенцыі і багатых людзей.

**«НН»: А які будзе наступны этап разьвіцьця мовы?**

**АТ:** Як толькі зьменіцца ўлада, пачнецца бурны пераход ад трасянкі да літаратурнай беларускай мовы. Будучы прэзыдэнт ужо будзе размаўляць на літаратурнай мове, нават калі будзе зачытваць з паперкі.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

### Таварыства беларускай мовы заклікае дасылаць лісты на «Deutsche Welle» з патрабаваньнем весьці новую праграму па-беларуску. Вось каардынаты тых, на чыё імя можна пісаць:

Frau Cornelia Rabitz, кіраўніца расейскай рэдакцыі аддзелу праграм Усходняй і Сярэдняй Эўропы, пры якой ствараецца «Беларуская хроніка».
Director General's Office Berlin
Evelyn Fischer
Тэлефон: 8-10-49-304-646-50-02
Факс: 8-10-49-304-646-50-50
E-mail: evelyn.fischer@dw-world.de

Head of PR and Communications
Dr. Johannes Hoffmann
Тэлефон: 8-10-49-228-429-20-41
Факс: 8-10-49-228-429-20-47
E-mail:
johannes.hoffmann@dw-world.de

DW-WORLD russian
Deutsche Welle
Kurt-Schumacher-Str. 3
D-53110 Bonn
Germany
Электронны адрас:
feedback.russian@dw-world.de

**Вось прыкладны тэкст па-ангельску.**

Dear Sir (Madam) …
I was delighted to learn that Deutsche Welle will be covering Belarusian topics in broadcasts directed to Belarus. The citizens of Belarus are bombarded daily with official propaganda and are in desperate need of objective and current information.
It is highly disappointing, however, that these programs will be done in Russian language. Saddled with a near-dictator who hates the Belarusian language and is anxious to surrender the country's sovereignty, most Belarusians appreciate their native tongue and associate it with democracy. At the same time, it is a known fact that many decades of russification have done their damage, and as a result many Belarusians in their daily life speak Russian. It does not, however, prevent them from understanding spoken Belarusian perfectly well.
According to the latest official survey more than 70% of the population consider Belarusian their mother tongue, and 37% use it daily. Even greater percentage than 70% has no difficulty understanding spoken Belarusian. The small minority that does not understand it, or perhaps refuses to understand it, is not the audience that Deutsche Welle or any Western broadcaster should be addressing.
Sincerely,
(імя)

## ГАСПАДАРКА

### «L&M» і «West» забаронены

З 1 ліпеня фармальна забаронены ўвоз у краіну цыгарэт «L&M» і «West». Падчас разьмеркаваньня дадатковых квот на імпарт цыгарэт у памеры 500 млн адзінак гэтыя маркі былі выключаныя зь пераліку. Аднак імпарт «L&M» і «West» будзе працягвацца, пакуль ня будзе выбрана першапачатковая квота ў 1,5 млрд адзінак.

### Цэнтралізацыя мэталюргіі

Ва ўрадзе разглядаюць магчымасьць стварэньня Беларускага мэталюргічнага аб'яднаньня. Яго цэнтрам зробіцца Беларускі мэталюргічны завод у Жлобіне, які аб'яднае вакол сябе Гомельскі ліцейны завод «Цэнтраліт», Рэчыцкі завод мэталічных вырабаў, Магілёўскі мэталюргічны завод, Менскі і Гомельскі падшыпнікавыя заводы, а таксама Аршанскі завод швейных машын.

### Квота на макарону

З мэтай абароны айчынных вырабнікоў урад увёў квоты на імпарт макароны. У нас штогод вырабляюць 11 тыс. т прадукту, а завозяць з-за мяжы 100 тыс., у асноўным з Расеі.

### Сырнае аб'яднаньне

ААТ «Буда-кашалёўскія сыры» далучаць да Рагачоўскага малочна-кансэрвавага камбінату, каб выправіць яго фінансавае становішча. Гэта спрабавалі зрабіць двойчы, але акцыянэры — прадпрыемства «Эгал-інвэст» (7% акцыяў) і індывідуальны прадпрымальнік Карнееў (12%) — блякавалі рашэньне. Урэшце на «Буда-Кашалёўскіх сырах» увялі «залатую акцыю» тэрмінам на тры месяцы, што дазволіла прыняць рашэньне пра аб'яднаньне.

### Імпэрыя Раманава

Літоўскі бізнэсовец Уладзімер Раманаў, што валодае футбольным холдынгам, куды ўваходзяць менскі МТЗ-РІПА, «Каўнас» і шатляндзкі «Хартс», гатовы пабудаваць у Заводзкім раёне сталіцы, у ваколіцах стадыёну «Трактар», спарткомплекс з крытым футбольным стадыёнам. Пытаньне абмяркоўвалася на нарадзе ў прэзыдэнта Беларусі.

**АК, АФН**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 21 ліпеня:**

1 амэрыканскі даляр — 2 150 рублёў
1 эўра — 2 596,02
1 латвійскі лат — 3 730,37
1 літоўскі літ — 751,88
1 польскі злоты — 627,57
1 расейскі рубель — 74,98
1 украінская грыўна — 428,88

**Паводле Нацбанку**

# Нармальныя рэчы, важныя штукі

Сход дэмакратычных актывістаў Фрунзэнскага раёну прайшоў у Менску 14 ліпеня, у дзень узяцьця Бастыліі. Нягледзячы на знакавую дату, «Марсэльезы» пад вокнамі Акадэміі міліцыі не сьпявалі. Затое рэвалюцыя ўжо адбылася ў некаторых партыйных галовах. Цікуе **Вольф Рубінчык**.

Фрунзэнскі раён — найбуйнейшы ў Менску: насельнікаў тут, як у абласным цэнтры. Гэта адзіны раён, дзе ў 2001 г. Ганчарык нават паводле афіцыйных зьвестак не прайграў Лукашэнку ў першым туры. Таму, зважаючы на гэта, я чакаў шырэйшага сходу. У фае галоўнага офісу БНФ зарэгістравалася каля васьмі дзясяткаў чалавек.

Галоўнай мэтай актывістаў было вылучэньне двух сваіх калегаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Выбіралі збольшага наўгад — трохххвілінныя прамовы і сьціслыя адказы на пытаньні прысутных («Што такое нацыяналізм?», «Што такое беларускі народ?») не стваралі цэльнага ўяўленьня аб магчымых дэлегатах.

Большасьць прагаласавала за двух Алесяў — Шпакоўскага і Станішэўскага. Шпакоўскаму 21 год, ён вучыцца на пэдагога і лічыць сябе прыхільнікам кансэрватызму, ачольваючы культурную камісію незарэгістраванага «Правага альянсу». Станішэўскі — спартовы трэнэр з зычным голасам, адзін з кіраўнікоў Кальварыйскай рады, г.зн. суполкі БНФ у Фрунзэнскім раёне. Іншыя два прэтэндэнты (ад АГП і ПКБ) выступалі менш імпэтна, чым правыя, і ў выніку тайнага галасаваньня «праляцелі».

Як для карэспандэнта «НН», цікавейшай за «праймэрыз» раённага маштабу была самапрэзэнтацыя вядомых палітыкаў, запрошаных на сход. З прэтэндэнтаў на ролю «адзінага» прыйшлі Сяргей Калякін, Анатоль Лябедзька, Аляксандар Мілінкевіч. Усе трое агітавалі так, нібы выбары мусілі адбыцца заўтра.

С.Калякін расказваў пра сваю рашучасьць, падкрэсьліўшы, што камуністы заўжды хіліліся да свабоды і справядлівасьці. «І ў хрысьціянстве ёсьць нармальныя рэчы», — дадаў ён. А.Лябедзька зрабіў камплімэнт прысутным: «У залі сядзяць аптымісты. Мы ратуем гонар краіны». А.Мілінкевіч настойваў на значнасьці структур для пасьпяховай палітычнай кампаніі ды мякка ўшчуваў «выдатных асоб», якія не далучыліся да кааліцыі, утворанай на падмурку «Пяцёркі+».

«Ня мы павінны хадзіць да іх, а яны да нас, — заявіў палітык. — Масква — важная штука, але не яна будзе вырашаць лёс Беларусі». Лябедзька і Мілінкевіч выступалі па-беларуску, скончыўшы прамовы воклічам «Жыве Беларусь!». Абодва разьбіралі свае памылкі: Лябедзька прыгадаў сваю працу на Лукашэнку ў 1994 г., Мілінкевіч — завышаныя чаканьні ў час апошняй прэзыдэнцкай кампаніі: «Мы меркавалі, што раз Домаш — намэнклятурнік, намэнклатура пяройдзе на наш бок. Але яна, як і Масква, паважае моцных, а моцы якраз і не хапіла».

Мантра «не дапусьціць паўтарэньня 2001 году» сталася ляйтматывам усіх выступаў. Не пазьней як на восеньскім Кангрэсе высьветліцца, ці здольныя майстры агітацыі вучыцца на сваіх памылках і падпарадкоўваць амбіцыі супольнай справе. Настрой удзельнікаў сходу сьведчыў, хутчэй, пра тое, што нават ня ўсе партыйцы гатовыя браць Бастылію ці, як гэта называецца, «бараніць перамогу».

## СЬЦІСЛА

### Да Марыніча не пусьцілі адваката

13, 14 і 15 чэрвеня адміністрацыя калёніі №1 не пусьціла адваката **Валянціну Шыханцову** да Міхаіла Марыніча, спаслаўшыся на тое, што няма адпаведнай заявы. Адвакат сьцьвярджае, што ўсе патрэбныя паперы яна падала.

### У Горталі, Івацэвіччына

Адміністрацыйная камісія Івацэвіцкага райвыканкаму пакарала мясцовага жыхара **Станіслава Халадовіча** штрафам на восем базавых велічынь (204 тыс. руб.) за незаконны распаўсюд друкаваных выданьняў. Падставай для пакараньня стала тое, што Халадовіч распаўсюджваў у вёсцы Гортль Івацэвіцкага раёну расейскую «Новую газету», брашуру В.Лявонава «Бяз права на памылку» ды інфармацыйныя матэрыялы пра дзейнасьць кааліцыі «Пяцёрка-плюс».

### Малея не забываюць

Дэпутат Маларыцкага райсавету **Ўладзімер Малей** атрымаў чарговае паведамленьне аддзелу дазнаньня УУС Берасьцейскага аблвыканкаму, у якім лейтэнант міліцыі В.Гарбатоўская інфармуе, што тэрмін сьледзтва па крымінальнай справе, распачатай 2 лютага ў дачыненьні да дэпутата паводле арт.188 ч.2 КК, падоўжаны да 2 верасьня. Гаворка ідзе пра распаўсюджваньне Малеем інфармацыйнага бюлетэню «Наша слова» №13, у якім дэпутат нібы падаў «ілжывыя зьвесткі» пра дзеяньні старшыні Маларыцкага райвыканкаму Лапіча.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Пастар Беларускай эвангельскай царквы Эрнст Сабіла на ганку суду.**

### Правакацыя з Кішкурнам

13 ліпеня сыну кіраўніка Менскай гарадзкой рады Партыі БНФ Уладзімера Кішкурны **Антону** прад'яўлена афіцыйнае абвінавачаньне. Сьледчыя Цэнтральнага раёну Менску абвінавачваюць яго ў распаўсюдзе наркотыкаў і захаваньні боепрыпасаў. Па гэтых артыкулах сыну палітыка пагражае да васьмі гадоў пазбаўленьня волі.

### Польскія справы

Польскі камітэт «Салідарныя зь Беларусьсю» прафінансаваў выданьне сапраўднага №19 газэты **«Głos znad Niemna»**. Польскія журналісты дапамаглі й аштрафаваным за несанкцыянаваны пікет журналістам газэты выплаціць штрафы на суму амаль у 5,5 тыс. даляраў. Грошы для гэтага сабралі жыхары Лодзі.

### Адлічэньні «зуброўцаў»

14 ліпеня актывіст незарэгістраванага руху «Зубр» **Павал Маджара** выключаны з 3-га курсу факультэту беларускай філялёгіі Гомельскага ўнівэрсытэту за «акадэмічную непасьпяховасьць».

З 3-га курсу Беларуска-расейскага ўнівэрсытэту ў Магілёве адлічаны актывіст «Зубра» **Андрэй Разумкоў**. Хлопца неаднаразова затрымлівалі на несанкцыянаваных акцыях.

### Прафсаюз дапамог

11 ліпеня Прафсаюз работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП) дапамог свайму чальцу **Тацяне Гардзяйчук** адстаяць правы. Адказчык — АДА «Ліга» — да пачатку судовага разьбіральніцтва задаволіў патрабаваньні былой супрацоўніцы і выплаціў кампэнсацыю 500 тыс. руб. (раней было выплачана 156 тыс.), а таксама дапамог у працаўладкаваньні.

### Затрыманьні на «Базары»

Перад адкрыцьцём «Славянскага базару» 15 ліпеня ў Віцебску затрымалі распаўсюднікаў недзяржаўнай прэсы (часопіс «Arche», камэрцыйная газэта «Витебский проспект», а таксама незарэгістраванае выданьне «Выбар») **Барыса Хамайду** і **Алеся Мудрычэнку**. Патруль затрымаў таксама **Сяргея Міркушова**, які выйшаў з плякатам «Няўжо нам толькі трэба відовішчаў ды хлеба?» — яму абвясьцілі судовае пярэджаньне. Хамайду й Мудрычэнку прапаноўвалі быць сьведкамі на судзе, але яны адмовіліся.

### Гомельская актывістка хоча на працу

У Цэнтральным судзе Гомелю 15 ліпеня пачаўся разгляд пазову актывісткі грамадзкага руху «Разам» **Марыі Багдановіч** да дырэкцыі абласнога краязнаўчага музэю. Яе, малодшага навуковага супрацоўніка, звольнілі ў чэрвені пасьля трэцяй вымовы. Багдановіч патрабуе аднаўленьня на працы, лічачы прычыны звальненьня палітычнымі.

### Выгналі амэрыканца

Зь Беларусі 19 ліпеня выслалі прафэсара з ЗША **Тэры Бэша**, які выкладаў у БДУ міжнароднае права. На зборы амэрыканцу і ягонай сям'і, якія пражылі ў Менску два гады, далі дзьве гадзіны.

### Баранавіцкі сход

16 ліпеня міліцыя спрабавала сарваць сход па вылучэньні дэлегатаў на Кангрэс дэмсілаў, што прайшоў у офісе ПКБ. Падчас сходу затрыманы **Анатоль Лябедзька**, **Сяргей Калякін** і старшыня менскай гарадзкой арганізацыі АГП **Ігар Шынкарык**, у якога канфіскавалі 40 партыйных бюлетэняў. На Лябедзьку й Калякіна спрабавалі скласьці пратаколы за арганізацыю несанкцыянаванага сходу, але яны адмовіліся даваць паказаньні.

### Шанц для Эвангельскай царквы

Менскі гарадзкі суд 18 ліпеня прыпыніў на два месяцы рашэньне пра ліквідацыю **Беларускай эвангельскай царквы**: за гэты час суполка павінна зьвярнуцца ў дзяржструктуры, каб яны знайшлі для яе юрадрас.

### Штрафы за раённыя сходы

Актывістаў АГП **Аркадзя Корхава** й **Васіля Чытаева** 18 ліпеня асудзілі на 510 тыс. руб. штрафу кожнага: іх абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага сходу ў прыватным доме. На гэтым сходзе выбіраліся дэлегаты на Ўсебеларускі кангрэс дэмакратычных сілаў.

Штрафы ў памеры пяць базавых велічынь (127 500 руб.) за незаконнае знаходжаньне ў памежнай зоне атрымалі 18 ліпеня актывіст ПБНФ **Юрась Губарэвіч** і **Зьміцер Трацяк** зь Белаазерску. 9 ліпеня ў мястэчку Дамачава каля польскай мяжы яны ўдзельнічалі ў сходзе па выбраньні дэлегатаў на Кангрэс ад Берасьцейскага раёну.

### Міравая з наймальнікам

Міравой скончыўся пазоў сябра прафсаюзу РЭП(АМ) **Генадзя Пачкова** да адміністрацыі прадпрыемства ААТ УСР «Будкомплекс»: яго звольнілі з парушэньнем заканадаўства, ня даўшы ў дзень звальненьня поўнага разьліку, кампэнсацыі за нявыкарыстаны адпачынак, працу ў шкодных умовах. Па атрыманьні пазову наймальнік пагадзіўся выплаціць суму ў 153 тыс.руб., што з улікам тэрміну затрымкі ў 94 дні вырасла да 1 млн 210 тыс.

### Кіраўскі сэмінар — пад судом

Кіраўскі райсуд (Магілёўшчына) аштрафаваў арганізатарку сэмінару па вывучэньні працоўнага заканадаўства **Ганну Гатавец** на 50 б.в. (1 млн 275 тыс. руб.) Мерапрыемства было арганізавана ГА «Беларускі рэспубліканскі клюб выбаршчыкаў» у адмыслова арандаванай кавярні.

**СБ, АШ**

# Пагоня на Грунвальд



**Камень-помнік Давыду Гарадзенскаму.**

У Горадні за мурам, які атачае Каложу, укапаны ў зямлю камень. На ім — мэталічная дошка з гербам ВКЛ ды надпісам «Пагоня на Грунвальд. 1410». Дзесяць гадоў таму з грунвальдзкага помніка скралі бронзавую шыльду. Сёньня яна са звычайнага мэталу, серабрыста-шэрая. Піша **Сяргей Максімовіч**.

Увечары 15 ліпеня горад брыняў прадчуваньнямі сьвяткаваньня іншай перамогі, якую ўлада любіць да замілаваньня — дзень гораду. За грунвальдзкія ўгодкі пілі па кілішку толькі нешматлікія жыхары каменнага гораду — улады сьвяткаваньня не дазволілі.

Ля кавярні, што лічыцца месцам збору аматараў рыцара на кані, швэндаліся розныя падазроныя, занятыя змаганьнем з прыхільнікамі ўсяго рыцарскага і грунвальдзкага. Віжуны запаміналі, пра што гаворыцца за сталамі, выстаўленымі на брук, і дбайна занатоўвалі тосты.

Наступнай раніцай да Каложы пачалі сыходзіцца тыя, хто праз афіцыйныя літаўры не забыўся на войска Вітаўта. У царкве за палеглых вояроў паставілі запаленыя сьвечкі.

Камень з крыжам на цьвінтары паказваў на легендарную магілу князя Давыда Гарадзенскага. Археолягі, праўда, магілы не знайшлі, аднак камень паставілі. Да «Пагоні на Грунвальд» сёлета паклалі кветкі. Упершыню не стаялі хеўрай навокал міліцыянты, ня лезьлі нахабна ў твары сваёй відэакамэрай. Успомнілі і пра кніжку Кастуся Тарасава «Пагоня на Грунвальд», якая зрабіла некалі вялізнае ўражаньне на тых, хто пасьля палюбіў грунвальдзкую гісторыю назаўжды. І ў гэтую суботнюю раніцу на нёманскім пагорку ўсе слухалі пераказ таго месца з кнігі, дзе пад гэтым пагоркам празь нёманскі брод на заходні бераг перапраўлялася войска Вітаўтава, і як апошняй была татарская коньніца, і ад татарскіх халатаў засерабрылася вада...

Пастаялі і ля магілы Давыда Гарадзенскага, якога некалі так любіў чалавек, што раскопваў падмуркі нашай гісторыі і адкрываў нам вочы на нашую мінуўшчыну, седзячы ў архівах, а потым ствараючы свае кніжкі — Міхась Ткачоў.

У больш спрыяльныя часы на гэтым месцы нават рыцары біліся ў дзень угодкаў Аршанскай бітвы. І ў гэты дзень аднойчы ля «Пагоні на Грунвальд» прымалі беларускую прысягу людзі ў цывільным, калі кавалак былой савецкай арміі не жадаў прысягаць беларускаму народу, а парлямэнт склаў тэкст прысягі толькі для салдатаў, каб не абражаць годнасьці савецкага афіцэра.

У дзень, калі ў Каложы паставілі сьвечкі за вояроў Грунвальду, у горадзе стралялі залпамі, крочылі памежнікі зь ленінскімі сьцягамі, гралі бравурныя аркестры. Улады раптам абвесьцілі ўгодкі выгнаньня вэрмахту сьвятам гораду! Забыўшыся, што гэтым днём заўжды быў дзень Сьвятога Губэрта, алень якога аздабляе гарадзкі герб.

Увечары я выхіліўся з акна, каб паглядзець на публіку, на пырскі салюту. Парахавыя хмары плылі ў бок царквы. Уздоўж старажытнай вуліцы прыпаркаваныя аўтамабілі спуджава рэагавалі ня толькі сыгналізацыяй на выбухі ў небе, але й трывожным мігценьнем чырвоных сыгнальных агнёў. Фаервэрк — увасабленьне радасьці, падумалася мне. У гэтай краіне існуе строгі падзел — на перамогі, афіцыйна дазволеныя, разьдзьмутыя, і перамогі гістарычныя, якія немагчыма перакрэсьліць, запэцкаць, закапаць дзяржаўным далакопам.

ТЭНДЭНЦЫІ

# Магілёўскія дзівосы

Сярэдняя тэмпэратура тыдня — 30 градусаў. Плавяцца мазгі. Юпітэр зайшоў за Вэнэру, а Леў апынуўся ў доме Блізьнятаў. У Магілёве — каскад няшчасных выпадкаў і злачынстваў. Піша **Аляксей Бацюкоў**.

Раніцай у панядзелак сонца ўзыходзіла ў крывавыя цяжкія хмары і неба чарнела. Немагчыма нармальна растлумачыць, што адбылося з Магілёвам на мінулым тыдні. Год таму знаёмая ўсім у горадзе клікуша праклінала абласны цэнтар за распусту.

Вяртаюся ў родны горад менскай шашой, на ўезьдзе на цэнтральны праспэкт пасярэдзіне асфальту плямiны пяску. Так засыпаюць плямы крыві пасьля аварыі. Двое пацярпелых. Думаю, заўтра пра гэта раскажуць усе газэты. Я яшчэ ня ведаў, дзе апынуўся.

Абласная тэлевізія назвала гэта каскадам няшчасных выпадкаў і злачынстваў. Тры рабочыя гарбарні чысьцілі каналізацыю і задыхнуліся парамі серавадароду. Той, што стаяў на паверхні, перш чым страціць прытомнасьць пасьпеў паклікаць на дапамогу. Двух іншых, якія чысьцілі саму трубу, ня выратавалі. З даху дзевяціпавярховікі зваліўся рабочы-рамонтнік. А вось паўтарагадовай Вікторыі з вуліцы Дабралюбава нехта няйначай чароўную пярыну падклаў. Калі маці выносіла ванначку пасьля купаньня, дзяўчо вывалілася з акна сёмага паверху. Выратавала клюмба. Ад падзеньня адны сінякі і драпіна на лбе. На наступны дзень маці Вікторыі пабегла ставіць сьвечку ў царкве — напэўна, за здароўе дырэктара ЖРЭУ, што добраўпарадкаваў двор.

Бог дапамагае дзецям, дурным і п’яным. У апошнім пераканаліся два юнакі, што скочылі з мосту цераз Дняпро і засталіся жывыя. Глыбіня пад мостам месцамі мэтар-паўтара. Вылавілі іх адразу, аднаго накіравалі ў выцьвярэзьнік, другога ў бальніцу — стукнуў грудзі.

У той жа дзень — 13 ліпеня — пад чыгуначным мостам правяралі на трываласьць аўтамабіль «нісан». Спачатку рэйсавы «Ікарус» прыцёр яго да сьцяны, бо занадта вузкім аказаўся праезд пад мостам. Абедзьве машыны сталі збоч дарогі, і праз хвіліну пад мост заехала «шкода». Заглядзеўшыся на пабіты «нісан», яе кіроўца з усяго маху ўехаў у «Ікарус» і зачапіў «нісан». Апошні рамонту цяпер не падлягае, затое аўтобус амаль не пацярпеў. Пацярпела пасажырка «шкоды» — паламала нагу.

Чатыры кулі ў грудзі закончылі жыцьцё цыгана-мафіёзі. Падчас агляду міліцыянтамі цела з-пад рукі трупа выкацілася граната Ф-1… Выбуху не адбылося.

Весткі з рэгіёнаў — як дадатак да навін з абласнога цэнтру. У Горках патануў нігерыец, пад Бялынічамі сьцяна абвалілася на двух студэнтаў з будатраду. Перачытваю прозьвішчы. Мае студэнты, зь мінулай сэсіі. Цяпер абодва ў рэанімацыі. Пра апошні выпадак «НН» паведамляла ў мінулым нумары. Дадаць можна крыху — з пасады быў зьняты дырэктар калгасу «Наша Перамога», хоць якое дачыненьне ён мае да выкананьня тэхнікі бясьпекі на месцах, няясна.

Каля вёскі Дударава на Шклоўшчыне, у нядзелю невядомы аўтааматар пераехаў п’яненькага дзядзьку, які валяўся на шашы. Калі верыць Гогалю, у Запарожжы п’яных казакаў на дарозе паважліва аб’яжджалі. Але што тут скажаш, казакі ж.

Ужо некалькі дзён у Магілёве — зацішша.

СЬЦІСЛА

### Шлюб у кляштары

Аддзел ЗАГС Аршанскага гарвыканкаму справіў улазіны ў рэканструяваным будынку былога трынітарскага кляштару — помніку архітэктуры першай паловы XVIII ст. Адну палову будынку ўжо заняў занальны архіў. Першая маладая сям’я Аўласенкаў была створаная ў новым ЗАГСе пры ўдзеле ўсяго гарадзкога начальства. Наагул жа ў гэты дзень тут зарэгістравалі шлюб 15 параў. Дарэчы, заля ўрачыстасьцяў абсталявана якраз у тым пакоі, дзе летась былі выяўлены на столі й сьценах фрэскі. Праўда, цяпер яны закансэрваваныя, і сьцены ўпрыгожаныя каляжамі з выявамі старадаўняй і сучаснай Воршы.

### Пасябравалі з палякамі

Падпісаны дагавор аб сяброўстве й супрацоўніцтве паміж Воршай і польскім Мінскам-Мазавецкім. Сувязі паміж гарадамі пачалі ўсталёўвацца ў 2002 г. Абодва гарады разьмешчаны на перакрыжаваньні шляхоў, таму іх гістарычныя лёсы шмат у чым падобныя, нават гербы амаль аднолькавыя. І хоць у польскага пабраціма Воршы насельніцтва ў 4 разы меншае, трэба меркаваць, плён ад супрацоўніцтва будзе — мо і не цяпер, калі ў краіне разгортваецца антыпольская кампанія, а ў будучыні.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Капаюць пляц Волі

У цэнтры Полацку, на пляцы Волі, пачаліся археалягічныя раскопкі. Выконваюць іх студэнты ПДУ пад кіраўніцтвам выкладчыкаў унівэрсытэту Дзяніса Дука і Вольгі Емяльянчык. Пасьля раскопаў на гэтым месцы пабудуюць офіс «Беларусбанку». У 1987—1988 г. на пляцы Волі раскопкі ладзіў Сяргей Тарасаў. Падчас іх археоляг знайшоў рэшткі вялікай сядзібы полацкага ювэліра XII ст. Ён вылучыў гіпотэзу, што тая сядзіба магла належаць Лазару Богшу, аўтару славутага крыжа Эўфрасіньні Полацкай.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Ужо барсукі шалеюць

Пад вёскай Іжа (Вялейшчына) днямі адбыўся незвычайны выпадак. На сям’ю адпачывальнікаў зь Вялейкі напаў шалёны барсук. Ён прагрыз тканіну намёту, але пакусаць людзей не пасьпеў. Абараняючыся, адпачывальнікі забілі няшчасную жывёлінку. Экспэртыза паказала, што барсук быў шалёны.

На Вялейшчыне за лета гэта ўжо другі выпадак шаленства ў жывёл. На пачатку ліпеня ў вёску Трыгузі прыйшла ліса і укусіла за руку гаспадара, што адганяў яе ад курэй.

**Паводле «Рэгіянальнай газэты»**




## Падпіска на «ARCHE»

**Працягваецца падпіска на штодвухмесячнік «ARCHE». Падпісны індэкс 00345.**

# Як азяркоўцы сьвятыню ад папа баранілі

Пра падзеі ў Азярку (Аршаншчына), пайшлі чуткі па ўсёй Воршы і дакаціліся нават да Менску. Чуткі абрастаюць паданьнямі. Нехта ўжо пасьпеў дадаць да гісторыі пабітага сьвятара ды спалены трактар. Нехта апавядае, як нейкія крымінальнікі хацелі спаліць вёску. Перадусім захапляе самаарганізацыя і сьвядомасьць азеркаўскіх сялянаў. Піша **Ігар Казьмерчак** з Воршы

## Частка першая. Гістарычная

Каменны крыж увышкі — каля 1,5 мэтра. Але мясцовыя жыхары расказваюць, што колісь ён быў нашмат вышэйшы — нават воз зь сенам мог праехаць пад ім. Краязнавец Кірыла Анікевіч у кнізе «Сеньненскі павет Магілёўскай губэрні» (1907) першы падрабязна апісаў помнік. Ён зьвязаў зьяўленьне крыжа з Паўночнай вайной: паставілі яго на магіле забітага тут генэрала. Так і стаяў крыж, пакуль у 1970-х нейкаму чыноўніку не прыгразілі выключэньнем з партыі, калі ня зьнішчыць сьвятыню. Крыж ён скінуў у раку, мала хто там з начальства яго мог убачыць. А ў 1988-м мясцовае насельніцтва сваімі сіламі выцягнула помнік на бераг, усталявала ля крыніцы ды зрабіла там вельмі ўтульную зону адпачынку — з альтанкай, калодзежам, мосьцікам цераз раку Адроў, штучным парогам на той самай рацэ. Да крыжа вадзілі экскурсіі з найбліжэйшых школ, у альтанку нават прыяжджалі з гораду адпачыць ды сфатаграфавацца зь незвычайным помнікам. Крыж стаў гонарам мясцовых сялян.

## Частка другая. Батальная

Невядома навошта, але праваслаўны сьвятар Аляксандар зь вёскі Межава вырашыў перавезьці каменны крыж да сябе. Адвячоркам 1 ліпеня людзі, што капаліся ў гародзе ля дарогі, убачылі крыж на прычэпе трактара, які выяжджаў зь вёскі. Сям'я — муж, жонка ды дачка — кінулі справы й выбеглі на дарогу. Трактар на іхнія крыкі не спыніўся. Гаспадар сям'і, ня доўга думаючы, сабою перагарадзіў яму дарогу. Зь легкавіка, што ехаў за трактарам, выйшаў сьвятар у спартовым касьцюме ды кепцы. Пачаліся спрэчкі. Малая дзяўчынка пабегла ў вёску зьбіраць людзей. Мужык з-пад колаў не сыходзіў, і айцец Аляксандар проста загадаў трактарысту душыць яго. Можа, і задушыў бы, але зь вёскі ўжо беглі людзі. Крыж вярнулі на месца.

Сяляне паставілі ўмовы: пакуль ня ўбачым дакумэнтаў на яго вываз — крыж будзе стаяць тут. Але ж у тым і справа, што дакумэнтаў аніхто, нават сельсаветаўскае начальства, ня бачыў, хаця на словах сьвятар даказвае, што яны ёсьць. Так скончылася першая «бітва за крыж».

Ноч прайшла спакойна, хоць сёй-той выходзіў уначы з хаты паглядзець, ці стаіць прычэп з каменем. Днём інфармацыя пра Азяркоўскую сьвятыню дайшла да райвыканкаму. Пачаліся размовы-перамовы. Аказалася, што помнік не стаіць на ўліку ні ў Аршанскім, ні ў Сеньненскім раёне. Бо месьціўся якраз на мяжы. Адны думалі, што гэта іхняе, другія — наадварот. У выніку статусу «ахоўваецца дзяржавай» не было.

Надышла другая ноч супрацьстаяньня паміж межаўскім сьвятаром ды азяркоўскімі людзьмі. Гэтым разам, каб прадухіліць вываз крыжа ноччу, мужыкі паставілі ахову. Зь сякерамі ды віламі па чарзе яны правялі ля помніка ўсю ноч. Ні ноччу, ні днём сьвятар не зьяўляўся, але людзі працягвалі стаяць каля крыжа. Толькі на трэцюю ноч іх зьмянілі міліцыянты. Раніцай усе даведаліся, што ў дачыненьні да сьвятара заводзяць крымінальную справу за спробу скрасьці гісторыка-культурную каштоўнасьць. Людзі вырашылі, што гэта перамога, і на тым вярнуліся да сваіх звычайных спраў.

**Вёска Азярок** месьціцца у паўночна-заходняй частцы Аршанскага раёну. Мае 49 гаспадарак ды 84 чалавекі насельніцтва (па стане на 1 студзеня 2005 году). Уваходзіць у склад Межаўскага сельсавету. Найбліжэйшая чыгуначная станцыя — Смаляны (напрамак Ворша—Лепель).




**Крыж цяпер стаіць каля старога панскага маёнтку ў вёсцы Межава.**

## Частка трэцяя. Амаль крымінальная

Ды рана радаваліся. 9 ліпеня раніцай у вёску зноў заявіўся сьвятар, а зь ім цэлая хеўра «ахоўнікаў». Адзін — межаўскі ўчастковы, а астатнія — нalыса голеныя з татуіроўкамі на руках ды нагах здаравякі. Супраць такіх сілаю не папрэш. Людзі абкружылі сваю сьвятыню. Участковы пагражаў усіх паперасаджаць, а «ахова» проста пагразіла, што спаліць вёску. Участковы — не страшна. Але гэтыя — хто іх ведае, адкуль яны, можа, крымінальнікі якія. Так, пагражаючы, амбалы на трактары пачалі прасоўвацца да выезду зь вёскі. Там ужо была падрыхтавана перашкода. Дарогу перагарадзілі легкавіком. У людзей адвісьлі сківіцы, калі яны ўбачылі, як «ахова» айца Аляксандра падняла легкавік на рукі ды перанесла з дарогі. Зьяжджаючы, «барацьбіты за веру праваслаўную» не забыліся яшчэ раз нагадаць, што спаляць вёску.

## Частка чацьвертая. Без кропкі

Не зважаючы на ўсе пагрозы і паразу, азяркоўцы надзеі ня трацяць. Зьвяртаюцца да раённага начальства, шукаюць дакумэнты, якія б дазволілі менавіта ім валодаць сьвятыняй, ды кажуць: няхай толькі аддадуць, а мы ўжо самі прывязём яго на месца.

Старшыня Межаўскага сельсавету Васіль Шакуноў просіць не зьнеслаўляць Межава ў газэтах: маўляў, мы і так вінаватыя, што не дагледзелі ды дапусьцілі скандал. Але абяцае, што, як толькі разьбяруцца ў сытуацыі, прымусяць сьвятара вярнуць камень.

Вось такія баталіі адбываюцца ў маленькай вёсцы Азярок. Раённае начальства разьбіраецца ў сытуацыі, сьвятар у царкве не зьяўляецца ды й міліцыя яго знайсьці ня можа. А сяляне вераць, што вернуць сьвятыню, якая была ў іх чатыры стагодзьдзі і безь якой нeяк няўтульна на сваёй жа зямлі стала.

Калі размаўляеш зь імі, адчуваеш, што не здаліся. І ўжо цяпер абмяркоўваюць яны, а дзе ж гэта машыну браць, каб перавезьці крыж на месца, а хто ж паедзе яго забіраць. Здаецца, якраз у Азярку жывуць нашчадкі тых самых рыцараў-ліцьвінаў, што могуць пастаяць за сьвяты крыж.




На Турскай пераправе, на Дняпры — гэта на Гомельшчыне ля мястэчка Турск — мінулымі выходнымі ладзіліся агульнабеларускія спаборніцтвы па рыбнай лоўлі на паплаўковую вуду. 35 рыбакоў — каманды па 5 чалавек ад кожнай вобласьці і госьці з Польшчы — два дні вудзілі рыбу. Спаборніцтвы складаліся зь дзьвюх частак — вячэрняй і ранішняй рыбалкі: дзьве гадзіны на падрыхтоўку і тры на рыбалку. Пасьля — абмеркаваньне вынікаў і, канечне, юшка — сапраўдная, згатаваная на вогнішчы майстрамі. Перамагла каманда Меншчыны. Але найбольш налавілі рыбы госьці з Польшчы.

# «Concerto grosso» ў трох частках

Вяршыня гармоніі, а разам з тым і дэструкцыі — у новай выставе Арлена Кашкурэвіча. Піша **Сяргей Харэўскі.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Людміла і Арлен Кашкурэвічы (справа) на адкрыцьці выставы.**

14 ліпеня ў Нацыянальным мастацкім музэі ў Менску адкрылася пэрсанальная выстава народнага мастака Беларусі, ляўрэата Дзяржаўнай прэміі прафэсара Арлена Кашкурэвіча. Вэрнісаж прыцягнуў увагу ня толькі калегаў, сваякоў і адмыслоўцаў, было тут і чынавенства зь міністэрстваў культуры й інфармацыі. Было багата кветак і музыкі. Летась Арлену Кашкурэвічу споўнілася 75 гадоў, да юбілею і была прытарнаваная экспазыцыя твораў. Былі выстаўленыя тры новыя графічныя нізкі, створаныя за мінулы год, а таксама раньнія работы — агулам больш за 60 станкавых аркушаў. Ілюстрацыі да кніг Купалы й Коласа, Гусоўскага й Караткевіча, Гётэ й Айтматава вядомыя ці ня кожнаму беларусу, а вось станкавыя творы Кашкурэвіча знаюць менш.

Адна з трох найноўшых графічных станкавых нізак, што дала назву ўсёй выставе, завецца «Concerto grosso» («Вялікі канцэрт»). У аснове сюжэтаў — вобраз музыкі-віялянчэліста. Гэта бесьсюжэтныя кампазыцыі, у якіх прысутнічае чалавечая постаць з музычным інструмэнтам, якія ўваходзяць у стасункі міжсобку. Вяршыня гармоніі, а разам з тым і дэструкцыі. Спробы аб'яднацца так і застаюцца безвыніковымі. Але музы́ка й ягоны чароўны інструмэнт усё ж застануцца зьнітаванымі навечна. Як і Ікар са сваімі крыламі.

Наступная нізка — «Чалавек у сучасным горадзе», або «Гэтае мілае гарадзкое жыцьцё», дзе пачуцьцё адзіноты даведзена да паталягічнага, крайне балючага адчуваньня. Адчужанасьць пэрсанажа ад гораду, ад людзэй, ад самога сябе заводзіць нас у тупікі лябірынту. Чалавек, праз уласную нялюбасьць да вонкавага сьвету й боязь болю, пачуваецца ў сучасным горадзе самотней, чым у ледзяным аксаміце міжзоркавай прасторы. А сьвет і не прапаноўвае яму нічога іншага. Выйсьця тут няма. Тут мінорнае Кашкурэвічава сьветаўспрыманьне вельмі блізка сыходзіцца з творчасьцю Васіля Быкава.

Трэцяя частка выставы — гэта сэрыя аркушаў «Гульцы», або «Більярд». Гэта алюзія на Г.Бёля — «Більярд а палове на дзявятую». Гулецкі стол, што яднае дваіх людзей. У азартнай гульні разьвіваюцца адносіны паміж імі, адлюстроўваючы ў іх гаму ўсіх людзкіх пачуцьцяў. Дынамізм більярду дазваляе мастаку выбіраць разнастайныя ракурсы, ствараць бясконцы калейдаскоп кампазыцыяў.

Для падтрыманьня гэтых асноўных частак кампазыцыі прадстаўлены й іншыя творы розных гадоў. Лірычныя й трагічныя, ілюстрацыйныя й бесьсюжэтныя, яны злучаны той адметнай Кашкурэвічавай экспрэсіяй, якую немагчыма зблытаць зь іншымі.

Выснова, што міжволі напрошваецца па праглядзе выставы, палягае ў тым, што клясыка можа ствараецца й на нашых вачах. Мастак, нястомна думаючы й працуючы, дакладна ведае, што хоча паказаць сучасьнікам. З вышыні сваіх гадоў і дзякуючы свайму таленту. Хоць тое, што паказвае нам А.Кашкурэвіч, не забаўляе нас, не суцяшае, не дае канчатковых адказаў. Майстар змушае нас думаць. І шукаць сваіх адказаў на тыя выклікі, што само жыцьцё несупынна закідае нам. Як і было спрадвеку.

Стоячы ў сьцішанай прахалодзе музэйнае калянады, сярод вобразаў, створаных Кашкурэвічам, міжволі забываесься пра хуткаплыннасьць лета й думаеш пра тое, што пройдзе і яно, і безьліч іншых летаў, пакінуўшы нам усё тыя ж невырашальныя на зямлі таямніцы — сутнасьці жыцьця й прагі творчасьці.

# Не дажджом, дык тратылам

У Воршы марнеюць шматлікія архітэктурныя помнікі. Нават перадача Праваслаўнай царкве не ратуе. Піша **Аркадзь Шанскі.**

Праваслаўная царква мусіць атрымаць помнік другой паловы XVIII ст. — жылы корпус базыльянскага кляштару (Музэйны завулак, 12). Юрыдычнай падставай для перадачы вуніяцкага кляштару праваслаўным стала тое, што пасьля скасаваньня Вуніі ў XIX ст. базыльянскі кляштар быў перададзены праваслаўным, і тут разьмяшчаўся Пакроўскі манастыр.

Айцец Мікалай (Вабішчэвіч), аршанскі благачынны, зазначае, што праваслаўная царква гатова ўзяцца за будынак, як толькі гарадзкія ўлады падрыхтуюць адпаведныя дакумэнты. У колішнім базыльянскім кляштары, на думку а.Мікалая, змогуць разьмясьціцца філія Віцебскай духоўнай вучэльні і сацыяльны цэнтар для дапамогі нямоглым. Але будынак вымагае рэстаўрацыі. Дарэчы, праваслаўную царкву ў цэнтры Воршы дзевяць гадоў таму пачалі ставіць на месцы зьнесенай у 1960-я гады Сьвята-Мікольскай царквы. Дагэтуль будынак новага храму не даведзены нават да купалоў. Таму праваслаўная царква не асабліва імкнулася ўзяць пад сябе базыльянскі кляштар.

Да пачатку 1990-х у будынку месьціліся мастакоўскія майстэрні, частка памяшканьняў была жылая. Пры канцы 1980-х быў распрацаваны праект, паводле якога меркавалася перадаць «базылянаў» пад мастацкі музэй. Не пасьпелі: пачаліся рэформы, грошай забракла, будынак проста законсэрвавалі.

Фатальным для помніка стала сьнежная зіма 2003—2004 г. Укрыты шыфэрам дах прасеў. Уласьнік помніка, КУП «Воршакамгас», год таму зьняў шыфэр і бэлькі. Пакінуты на волю дажджоў і вятроў будынак стаў імклівa разбурацца.

Аршанскі краязнавец Юрка Копцік месяц таму зьвярнуўся з заявай на імя аршанскага пракурора Сяргея Хмарука: «Кіраўніцтва КУП «Воршакамгас» на працягу году нічога ня робіць для захаваньня будынку, што зьяўляецца найгрубейшым парушэньнем прынятых на сябе ахоўных абавязацельстваў». Аднак пакуль Ю.Копцік не атрымаў адказу з пракуратуры.

У размове з карэспандэнтам «НН» Копцік нарakaў на тое, што грамадзкае абяднаньне «Фонд аховы помнікаў гораду Воршы» ўзначальвае гарадзкі чыноўнік — галоўны архітэктар гораду Аляксандар Латковіч. За час сваёй дзейнасьці аб'яднаньне абараняла ад зносу толькі помнік Леніну ў 1994 г., які й так ніхто не зьбіраўся чапаць. Другая справа, зробленая фондам, — падрыхтаваны да ўнясеньня ў пералік гісторыка-культурных каштоўнасьцяў сьпіс з 11 архітэктурных помнікаў. Што праўда, кіраўніцтва гарвыканкаму, прагледзеўшы сьпіс, пакінула толькі дзьве пазыцыі — касьцёл Сьвятога Язэпа XVIII—XIX ст., якім цяпер валодаюць каталікі, ды стары будынак чыгуначнага вакзалу. «У абласным Віцебску ідзе ўзнаўленьне архітэктурных помнікаў, нават калі яны цалкам зьнесены, а ў Воршы яны толькі марнуюцца», — абураецца Ю.Копцік.

Супрацоўнік аднаго з шматлікіх аршанскіх музэяў расказаў мне пра сваю гутарку з настаяцелем аршанскага Куцеінскага манастыра, збудаванага ў XVII ст. Бацюшку «навязалі» да царквы яшчэ й жылыя будынкі. Дык ён заявіў: «Мне гэтая старызна ня трэба. Я падкладу пад яе тратылу і разьнясу». Музэйнікі пераканалі бацюшку не ісьці на канфлікт з законам, хаця й задумаліся: адкуль у сьвятара тратыл? Потым прыгадалі, што ў сьвецкім жыцьці бацюшка быў палкоўнікам…

**16 ліпеня** аршанская арганізацыя Партыі БНФ і Каардынацыйная Рада моладзевых арганізацый Аршаншчыны правялі акцыю па ачыстцы ад сьмецьця былога кляштару базылянаў. 15 актывістаў прыбралі тэрыторыю вакол паўднёвага фасаду кляштара, высеклі хмызы. Прынятае рашэньне зьбірацца штосуботу на ўборку гэтага помніка да таго часу, пакуль на праблему не адрэагуюць улады.

**Алесь Шутаў, Ворша**

# Несьмяротны альбом «Partyzone»

Ляўрэат «Басовішча–2002» гурт «Partyzone» зьмяніў імідж, музыку і склад. З клону «Рамштайну» яны ператварыліся ў інтэлігентную гард–рок–каманду. «Сьмерці няма» — назва новага дыску. Піша **Сяргей Будкін**.

### Аўтамабіль за дыск

«Partyzone» быў створаны ў 1994 г., але сур’ёзную заяўку музыканты зрабілі толькі гадоў пяць таму, калі выпусьцілі першы альбом «Трэба рабіць». Іх прад’юсэр прадаў аўтамабіль, каб выдаць альбом. На канцэртнай прэзэнтацыі бізнэсовец Зьміцер Дайнэка пад уражаньнем ад музыкі выкупіў некалькі дзясяткаў касэтаў і падараваў усім прысутным. Потым «Partyzone» атрымаў галоўны прыз «Басовішча» — і зьнік.

Праз тры гады адрадзіўся з новым іміджам. Песьні сталі больш складанымі. «Час мяняецца, і мы мяняемся разам зь ім, — кажа аўтар тэкстаў і заснавальнік групы Яўген Цылікаў. — Альбом «Трэба рабіць» імкнуўся павесяліць слухачоў. У гэтай жа праграме мы прапануем паразважаць».

Назву выбралі адпаведную — «Сьмерці няма». Яўген кажа, што гэта, хутчэй, тэарэма: «Нічога сыцьвярджаць мы ня можам. Кожны па-свойму асэнсоўвае такія пытаньні. Мы ня вынятак».

«Partyzone» з тых музыкаў, якія надаюць вялікую ўвагу тэкстам.

### Музычны чорнарабочы

Рэдкі выпадак — амаль усе ўдзельнікі гурту маюць музычную адукацыю. Але працуюць хто дзе — займаюцца пажарнымі сыгналізацыямі, вытворчасьцю лекаў, кампутарамі, адзін нават паталягаанатам.

Толькі Цылікаў зарабляе на жыцьцё музыкай — калісь меў музычную студыю, цяпер працуе выкладчыкам па клясе гітары ў школе. Ён лічыць, што, калі займаесься нейкай справай, трэба выкладацца напоўніцу — іншым заняткам няма месца ў жыцьці. Ён як чорнарабочы, што робіць незаўважную, але патрэбную працу. Яўген мае надзею, што беларуская музыка ня пойдзе па расейскім шляху: «У нас няма безгустоўнасьці, бо тут заможны бацька не прасуне сваю дачку бяз голасу. Узяць талентам больш шанцаў». Музыку мусяць ствараць прафэсіяналы, якія ня толькі добра валодаюць сваім інструмэнтам, але і маюць выхаваны густ. Цылікаў зьвяртае на гэты момант асаблівую ўвагу: «У нас дзеці першае, што падбіраюць, каб сыграць на якім-небудзь інструмэнце, — гэта «Чорны бумэр».

### Беларускі «Рэйнбоў»

Цылікаў да простых песень, што адразу кладуцца на слых, ставіцца непрыязна, хоць у рэпэртуары групы зьявіўся такі яркі гіт — «Маё сэрца»; у дуэце з вакалістам групы Дзянісам Вячэрскім яго прасьпявала вакалістка «Індыга» Руся. Адзін з удзельнікаў групы завёз дыск групы на малую радзіму, цяпер уся яго вёска вывучыла і сьпявае «Маё сэрца».

Раней «Partyzone» параўноўвалі з «Рамштайнам». Выдаўцы альбому «Трэба рабіць» вынесьлі на вокладку словы журналіста зь Беластоку Міколы Ваўранюка: «У Беларусі гэты гурт называюць «Рамштайн» з усьмешкай у душы. Я б сказаў болей — гэта часам лепш за «Рамштайн».

Цяпер са зьменай іміджу, музыкі, складу іх пачалі параўноўваць з «Рэйнбоў». Яўген ставіцца да гэтага стрымана: «Ня варта рабіць з музыкі спорт і параўноўваць розных музыкаў. Кожны творчы парыў варты існаваньня. Калі твор нарадзіўся, значыць, ён камусьці патрэбны».




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Моладзь танчыць пад «Partyzone» у клюбе «Рэактар».**




**Сьмерці няма**

Partyzone,
БМА–груп,
2005

Гэты альбом можа заняць месца на палічцы між ZETаўскім «З Новым годам!» і ULISаўскім «Люстэркам». Самі выканаўцы ўпэўнены, што музыка мусіць быць прыгожай, але агрэсіўнай. «Partyzone» далёкі ад простага бруталу. Па–першае, у кожнай песьні ёсьць свая запамінальная мэлядычная лінія — тут асабліва вылучаюцца «Смутак», «Сьмерці няма». Музыкі любяць паіграць на кантрастах, ад якіх слухач можа пачуваць сябе, як на Якуцкіх горах («Адшукай», «Цемра»). Агульны настрой альбому адлюстраваны ў творы «Парай дарогу»: герой песьні, абцяжараны сваімі праблемамі, разважае, у які бок пайсьці. Разынкі альбому — песьня «Маё сэрца», сьпетая вакалістам Дзянісам Вячэрскім у дуэце з Русяй, і «Сьмерці няма» — экзыстэнцыйная рок–баляда.

# Увесь Туронак



У Менску рыхтуецца да друку зборнік гістарычных працаў Юр’я Туронка.

Паводле словаў ініцыятара выданьня Валера Булгакава, кніга прыблізным аб’ёмам 1300—1400 старонак мае зьявіцца ў жніўні 2006 г. У яе ўвойдуць усе працы Туронка, прысьвечаныя беларускай гісторыі — ад артыкулаў 1970-х гадоў, калі ён пісаў пра школьніцтва на Беласточчыне, да такіх манаграфічных дасьледаваньняў, як «Вацлаў Іваноўскі і беларускае Адраджэньне», ды артыкулаў апошніх гадоў, зьмешчаных, напрыклад, у «Беларускім Гістарычным Агглядзе».

Большую частку кнігі (каля 800 старонак) складуць перакладзеныя з польскай працы. Укладальнікам выданьня будзе сам аўтар. Пытаньне з навуковым рэдактарам пакуль застаецца адкрытым. Зацікаўленыя асобы могуць зьвяртацца да В.Булгакава (analityka@yahoo.com).

**Адам Воршыч**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Успаміны пра Міколу Ганька

**15 ліпеня ў менскім Доме літаратара адбылася прэзэнтацыя кніжкі «Каб сьведчылі пра Беларусь» — успамінаў Марыі Ганько пра мужа, лідэра беларускай эміграцыі ў Канадзе Міколу Ганька. На фота: пісьменьніца Вольга Іпатава, сяброўка сям’і Ганькоў, дэманструе іх шлюбныя здымкі.**

### УДАКЛАДНЕНЬНЕ

З тэхнічных прычынаў у артыкуле Ю.Дракахруста «Каб любіць Беларусь нашу мілую…» у №26 выпалі два радкі. Зрэзаны кавалак мусіць гучаць гэтак:

«І па пытаньнях, датычных стаўленьня да Лукашэнкі, групы ягоных праціўнікаў знаходзяцца калі і ў меншасьці, то ў вельмі ўнушальнай, каб гаварыць пра іх **адхіленьне ад пануючых уяўленьняў.**

**Тут таксама трэба адзначыць, што**, хаця пытаньне пра нацыянальны гонар часта выкарыстоўваецца ў апытаньнях, якія праводзяцца ў розных краінах, як індыкатар патрыятызму, у нашай культурнай традыцыі гэта не зусім аднолькавыя паняткі».

Перапрашаем.

# Я не баюся

Выбухі ў Лёндане выклікалі хвалю кібэрсалідарнасьці.

«Я баюся вады, цемры і Робі Ўільямза, але я не баюся тэрарыстаў», — напісана на здымку, зробленым 14-гадовым Мэцью. Гэта адно з больш чым тысячы фота, разьмешчаных на сайце www.werenotafraid.com, — так цывілізаваны сьвет адказвае на напад тэрарыстаў на Лёндан.

7 ліпеня, праз гадзіну пасьля таго, як увесь сьвет здрыгануўся ад зьвестак пра лёнданскія выбухі, 29-гадовы кампутаршчык Альфі Дэнэн зрабіў сайт у Інтэрнэце, на якім разьмясьціў сваё фота. У руках Альфі трымаў самаробную шыльду са словамі «Я не баюся». Ён заклікаў іншых інтэрнэт-карыстальнікаў дасылаць яму такія самыя здымкі. «Пакажыце сьвету, што мы не баімся таго, што здарылася ў Лёндане, і што сьвет будзе лепшым месцам, калі ў ім ня будзе страху». Цяпер колькасьць фатаздымкаў пераваліла за тысячу і імкліва расьце, а праз наплыў наведвальнікаў сайт нярэдка немагчыма адкрыць. З дня стварэньня гэтую старонку прагледзела ўжо больш за чатыры мільёны чалавек.

Фота прыходзяць ня толькі з Брытаніі, але і з-за мяжы, найчасьцей з заходнеэўрапейскіх краін ды з Амэрыкі. Ёсьць здымкі нават з Блізкага Ўсходу. Калі праглядаеш галерэю дасланых фота, перад вачыма складваецца пярэстая мазаіка. Сярод фатаздымкаў няшмат шэдэўраў, але ўсе яны — шчырыя. Жанчына зь нямецкага гораду Брэмэргафэн даслала здымак сябе разам са сваёй коткай: «Я не баюся, і мая котка таксама». Многія дасылаюць фота сябе з празьнымі білетамі на лёнданскую падзямку ў руках. Іншыя падыходзяць творча — напрыклад, нехта аздобіў здымак Ёды з «Зоркавых войнаў» словамі «Не баюся я».




Дэнэн гаворыць, што ад самога чацьвярга амаль ня сьпіць, бо не хапае часу на тое, каб выкладаць фатаздымкі на сэрвэр. «Я і ня думаў пра тое, які неймаверны розгалас выкліча мая ідэя», — кажа ён. Папулярнасьць сайту пакрысе пачынае прыносіць матэрыяльны плён — праз яго ўжо прадаюць сумкі ды футболкі з надпісам «Мы не баімся». Асноўная частка грошай ідзе ў фонд Чырвонага крыжу для дапамогі пацярпелым, а рэшта — на тэхнічную падтрымку сайту (абслугоўваньне такой колькасьці наведнікаў каштуе нятанна). Сабе аўтары не бяруць нічога. «Мы не зьбіраемся разжывацца на няшчасьці іншых», — піша Дэнэн і яго каманда.

Рэзкае зьніжэньне злачыннасьці ў Нью-Ёрку ў першыя дні пасьля атакі на Амэрыку, мільённы марш у Мадрыдзе пасьля выбухаў у цягніках, брытанскі інтэрнэт-сайт — усё гэта сьведчыць пра здольнасьць здаровага грамадзтва згуртавацца і самаарганізавацца перад тварам небясьпекі. Нават ім, жыхарам дэмакратый зь векавой традыцыяй, часам трэба нагадаць сабе: «Мы разам, і нас багата».

**Алесь Кудрыцкі**

# «Пара» стварае новую сыстэму ўлады

«Бацькі спачатку нас асуджалі, потым не разумелі, але ўрэшце выйшлі разам з намі». Рух моладзі «Пара» адыграў асаблівую ролю ў Аранжавай рэвалюцыі ва Ўкраіне, а цяпер абвесьціў пра свой намер ісьці на парлямэнцкія выбары асобным сьпісам. Зь львоўскай актывісткай «Пары» **Вольгай Сало** гутарыць карэспандэнт «НН».

**— Рэвалюцыя перамагла. Тыя, за каго вы змагаліся, атрымалі ўладу. Ці ёсьць патрэба ў існаваньні грамадзкага аб'яднаньня?**

— Ёсьць, бо «Пара» ўзьнікла задоўга да выбараў прэзыдэнта. У 2003 г. Расея абазначыла свае прэтэнзіі да Тузлы, і моладзь стала на абарону тэрытарыяльнай цэласнасьці Ўкраіны. Мы пісалі лісты да сваіх дэпутатаў, ладзілі акцыі пратэсту. Калі мы вырашылі падтрымаць кандыдата Юшчанку, мы падтрымлівалі не яго асабіста, а зьмены, што ён увасабляе.

**— Што гэта была за падтрымка?**

— Народ, які жадае зьмяніць уладу, галасуе супраць яе. Адзінае, што магла ўлада, — сфальсыфікаваць вынікі, і нам заставалася толькі арганізаваць абарону выбару народу.

**— Якія задачы «Пара» ставіць перад сабой цяпер?**

— Цяпер асноўная праблема і задача — зьмена сыстэмы, каб мэтады кантролю ўлады народам больш цывілізаваліся. На пасадах засталіся людзі, для якіх быць пры ўладзе — азначае займаць высокую пасаду з прывілеямі і распараджацца рэсурсамі. Сыстэма ўлады павінна быць такой, калі чыноўнік, які пайшоў на незаконныя дзеяньні, аўтаматычна аказваецца па-за межамі гэтай сыстэмы бяз вулічных акцый пратэсту. Ён мусіць несьці адказнасьць за сваю бездаказнасьць. Трэба, каб чыноўніку было лягчэй працаваць і складана парушаць законы. Бо цяпер людзі расчароўваюцца: рэвалюцыя адбылася, а зьмен няма…



Адыграў ролю эканамічны рост. Людзі перасталі думаць толькі пра хлеб, яны задумаліся крытычна пра ўладу.

**— Чым цяпер займаецца арганізацыя?**

— Юрысты з «Пары» распрацоўваюць канцэпцыю судовай рэформы, займаліся стварэньнем грамадзкіх рад. Мы выступаем пасрэднікам паміж народам, які хоча кантраляваць уладу, але ня ведае як, і самой уладай. Але асноўны напрамак дзейнасьці — дапамога людзям арганізавацца для вырашэньня агульных мясцовых праблемаў.

**— Украінцы ўжо маюць досьвед перамогі. Што трэба рабіць, каб атрымаць яго беларусам?**

— Галоўнае — мэта. Чым больш было рэпрэсій, тым больш народ абураўся. Бацькі спачатку нас асуджалі, потым не разумелі: «Вы нічога не дасягнеце» — але ўрэшце яны выйшлі разам з намі! Адыграў ролю і эканамічны рост. Людзі перасталі думаць толькі пра хлеб, яны задумаліся крытычна пра ўладу. Дыктатар не зацікаўлены ў тым, каб ягоны народ жыў добра, бо людзі абавязкова задумаюцца: а навошта мне дыктатар? Таксама вялікую ролю ў нашым ядналі адыграў нацыяналізм. Беспардонна ўмяшаньне Расеі ў выбары, такім чынам, зрабіла свой унёсак у перамогу рэвалюцыі.

Негвалтоўны супраціў і шчырасьць — асноўныя прынцыпы пасьяхвай дзейнасьці арганізацыі. Агрэсія выклікае агрэсію. Гвалт улады супраць мірных актывістаў выклікае агрэсію народу супраць улады.

**Гутарыў Арцём Лява**

# Магнітнае ашуканства



Польскія базары, барахолкі ды інтэрнэт-аўкцыёны займелі ў асартымэнце новую модную «фішку» — нэадымавыя магніты. Лічыльнік вады ці электрычнасьці прыпыняецца, калі прымацаваць да яго такую штуку. І хоць гэта, калі казаць без хітрыкаў, крадзеж, людзі адрываюць такія магніты з рукамі.

Нэадымавы магніт — гэта кружок дыямэтрам 12 см — як кампактдыск. Такія ўжываюцца ў аўтамабільных стартэрах, бытавых вадзяных і газавых фільтрах, а таксама ў воданагравальніках. Магнітнае поле ў іх такое моцнае, што ў стане перашкодзіць працы вымяральных прыстасаваньняў — гадзіньнікаў, лічыльнікаў, вадамераў. І дзякуючы гэтаму нэадымавыя магніты робяць цяпер у Польшчы фурор. Іх цана — 14 злотых (4 даляры) оптам. Або 30 злотых у пана Тадэвуша на варшаўскім Стадыёне дзесяцігодзьдзя. «Я ніколі не гандляваў такім добрым таварам, — гаворыць ён. — За дзень удаецца прадаць больш за сто штук».

## Магніт як вада

Побач на століку стаіць таблічка з чырвоным надпісам: «Увага! Забараняецца карыстацца нэадымавымі магнітамі паблізу лічыльнікаў: гэта можа перашкодзіць іх працы». «Дзякуючы гэтаму ніхто ня можа мяне абвінаваціць у тым, што я раблю нешта незаконнае», — тлумачыць пан Тадэвуш.

Інфармацыю пра магніты адшукаў у Інтэрнэце Славэк, студэнт політэхнічнага інстытуту, пляменьнік пана Тадэвуша. Угаварыў дзядзьку пачаць імі гандляваць. Сам ён прадае магніты, ходзячы па дамах. «Гэта залаты бізнэс і легальны, бо гандляваць магнітамі можна, — пераконвае ён. — Ёсьць яшчэ такія магніты, што спыняюць газавыя і электрычныя лічыльнікі, але цяпер я іх не прадаю. Няхай людзі пераканаюцца ў эфэктыўнасьці гэтых, на ваду».

## Магніт як золата

Мы едзем у Насельск — раён прыватнай забудовы ў Варшаве. Каля аднаго з дамкоў Славэк зьвяртаецца да жанчыны, якая палівае кветкі на ўчастку: «Мабыць, дорага каштуе такі догляд кветак?..» «А як жа, дорага…» «А паглядзіце, што ў мяне ёсьць, — і Славэк паказвае магніт. — Цяпер падыдзіце да дому, прыкладзіце гэта да лічыльніка і адкрыйце ваду».

Праз некалькі хвілін жанчына вяртаецца ў захапленьні. Плаціць 50 злотых. «А мяне не пакараюць?» — пытаецца яна. «Вы не хвалюйцеся. Прыкладзіце магніт на тыдзень, а потым здыміце — і ўжо заплаціце за ваду на чвэрць менш».

У шматпавярховых дамах магніт купляюць у кожнай трэцяй кватэры. «Гэта добрая рэч. Мой сябар зрабіў у лічыльніку дзірку і засоўвае ў яе іголку, якая блякуе мэханізм, але я не хацеў так рабіць. Такую дзірку лёгка выявіць. Цяпер жа ніхто нічога не дакажа», — радуецца мужчына, шыльдачка на дзьвярах якога паведамляе, што тут жыве магістар.

## Магніт як злодзей

Прэс-сакратар Варшаўскага прадпрыемства водаправодаў і каналізацыі кажа: «Працяглы час да нас даходзяць зьвесткі пра нэадымавыя магніты, але гэтая праблема нас практычна не датычыць. Мы падпісваем дагаворы на пастаўку вады з жыльлёвымі таварыствамі і ажыцьцяўляем разьлікі зь імі».

Прадстаўнік праўленьня жыльлёвага таварыства «Эпоха»: «Мы бясьсільныя. Каб выкрыць тых, хто займаецца ашуканствамі пры дапамозе магніту, спатрэбілася б праводзіць дарагія экспэртызы па выяўленьні ступені намагнічанасьці вадамера».

Жыльлёвыя таварыствы спраўляюцца з праблемай так: розьніцу паміж цэнтральным лічыльнікам і індывідуальнымі дзеляць на ўсіх жыльцоў. Пані Тэрэза, пэнсіянэрка, у апошні час вымушана была даплачваць за ваду да 25 злотых: «Я мыюся ў балеі, посуд за ўвесь дзень мыю ўвечары. Сачу за лічыльнікам, каб толькі не накруціў звыш меры, а ўсё роўна даводзіцца даплачваць».

Пётар Стончак, юрыст: «Асоба, якая выкарыстоўвае магніт, каб фальсыфікаваць паказаньні лічыльніка, зьдзяйсьняе злачынства — гэта крадзеж, які караецца пазбаўленьнем волі на тэрмін ад трох месяцаў да пяці год».

Гарадзкая ўправа паліцыі: «Пакуль ніхто не зьвярнуўся з заявай пра крадзеж вады пры дапамозе нэадымавых магнітаў. Калі няма заявы, мы ня можам дзейнічаць».

**Паводле gazeta.pl**

# У начоўках плешчацца мора




**Рыгор Барадулін цалуе руку Валянціне Аксак. Побач — Іна Снарская, уладальніца прыватнай беларускай бібліятэкі ў Палтаве, і Ўладзімер Арлоў.**

Працяг са старонкі 1.

Баяліся, што паводле «старой» беларускай традыцыі, удзельнікам маглі перад самым пачаткам адмовіць у памяшканьні. Аднак кіраўніцтва Менскага міжнароднага адукацынага цэнтру заключаны дагавор датрымала.

Дадавала неспакою і акцыя праваказыйнай «Беларускай народна-вызвольнай арміі», якая заявіла пра замініраваньне будынкаў раённых адміністрацый сталіцы і асноўных чыгуначных ветак.

Хоць мін і не знайшлі, але гарантыі, што гэтыя невядомыя не «замінуюць» на наступны дзень будынку ІВВ-цэнтру, не было.

Дарэчы, арганізатары мерапрыемства забясьпечылі такую ахову, што нават мыш бы не праскочыла.

### Такія беларусы ім ня трэба

Умяшалася ў працу зьезду толькі невыносная гарачыня. Тым больш што памяшканьне не было разьлічанае на такую колькасьць дэлегатаў і гасьцей. Не ратавалі нават кандыцыянэры. Ранейшыя зьезды праводзіліся ў больш прасторных памяшканьнях. Гэтым разам улады адмовілі ў памяшканьні ў цэнтры гораду.

Праігнаравалі працу зьезду афіцыйныя СМІ. Ні БТ, ні АНТ ні слоўцам не сказалі пра Зьезд беларусаў сьвету.

У працы зьезду браў удзел толькі прадстаўнік Камітэту па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў пры Саўміне ды супрацоўнік Мін'юсту. Але дэлегаты ня надта перайамаліся з гэтай прычыны. Ня хочаце як хочаце. На зьезд прыехалі прадстаўнікі пераважна так званай незалежніцкай плыні беларускай дыяспары. Таму гарачых спрэчак — ці падтрымліваць сёньняшні рэжым і ці ўхваляць палітыку Лукашэнкі, якія мелі месца на мінулым форуме, — не было. Можна было сканцэнтравацца на галоўных праблемах.

### Амэрыка вінна Беларусі

Хоць рэгістрацыя пачыналася а 9-й, ужо ў 8.30 пад сьценамі ІВВ-цэнтру было людна. Удзельнікі, журналісты, кніга- і дысканошы. Сям-там між апошнімі даходзіла да лёгкіх боек за зручнейшае гандлёвае месца. Потым запанавала суцэльная ідылія ды ўзаемавыручка.

За паўгадзіны да афіцыйнага пачатку прыйшоў заўсёднік беларускіх сходаў амэрыканскі пасол Джордж Крол і, не афішуючы сваёй прысутнасьці, узяўся старанна вывучаць кніжныя навінкі. Ужо праз некалькі хвілін ён пахваліўся мне вялікім стосам набытых кніг.

Зьявіўся ў чорных акулярах Мікола Статкевіч, але хутка сышоў. Прыйшоў і ягоны палітычны праціўнік па лягеры сацыял-дэмакратаў — Аляксандар Казулін. Аднак неякаднаасобна сеў з краю і стаў задуменна пазіраць у акно.

У працы зьезду бралі ўдзел 253 дэлегаты (усяго было вылучана 340), зь іх 114 прадстаўлялі замежжа — Расею, Украіну, Польшчу, Вялікабрытанію, ЗША, Канаду, Аўстрыю, Нямеччыну, Чэхію, Кыргызстан. Былі нават дэлегаты такіх экзатычных для беларускага вуха краін, як Швайцарыя, Ватыкан і Коста-Рыка. Кворум сабраўся, хоць беларускія пасольствы, паводле чутак, рэкамэндавалі ня ехаць у Менск.

Зьезд пачаўся сьпевам сурмы Ўладзімера Пузыні. Пасьля быў выкананы гімн ЗБС «Бацькаўшчына», узяты з «Полацкага сшытку». Яшчэ раз зладіў сябе на думцы, што гэтая музыка магла б стаць гімнам Беларусі, прымірыўшы прыхільнікаў мілітарнага «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» і рэлігійнага «Магутны Божа». Усе выслухалі гімн стоячы. Сядзеў чамусьці толькі Алесь Пушкін: відаць, не зразумеў, што гэта гімн.

З прывітальным словам на добрай беларускай мове выступіў сп.Крол, які ня раз (як заўжды) сарваў авацыю слухачоў. Амэрыканскі амбасадар працытаваў словы Купалы, што Беларусь абавязкова зойме свой пачэсны пасад між народамі ў вольнай эўрапейскай сям'і. Ды падкрэсьліў, што Амэрыка можа вучыцца ў Беларусі на прыкладах мужнасьці беларускага народу і ганарыцца ўнёскам беларускіх сыноў і дачок — Касьцюшкі, Барыса Кіта, Зоры Кіпель — у сваю гісторыю: «Амэрыка вінна Беларусі».

### Эканоміка ў галовах

Зьезд праходзіў у канструктыўным ключы. Даклады адпавядалі заяўленым тэмам і самой тэме зьезду — «Беларусь для дыяспары. Дыяспара для Беларусі». Увага факусавалася на надзённых праблемах. З трывогай зазначалася, што старое пакаленьне эміграцыі (хваля 1940-х), якое заснавала цэлы беларускі сьвет на Захадзе, цяпер адыходзіць. Колькасьць беларусаў у сьвеце скарацілася да 2,1—2,4 млн чалавек. Але ў беларускім жыцьці, суполках бярэ ўдзел толькі нязначны працэнт зь іх — і гэтыя праблемы тычацца як далёкага, так і блізкага замежжа. Так, у Малдове жыве каля 20 тыс. беларусаў, тады як сямю нацыянальнымі суполкамі ахоплена 2300 чалавек. І гэта ня самы кепскі вынік.

На жаль, маладых эмігрантаў больш цікавяць эканамічныя пытаньні, чым праблемы захаваньня беларускай прысутнасьці ў сьвеце. І на пленарным пасяджэньні, і ў выступах дэлегатаў, і падчас працы сэкцый гэтыя думкі гучалі неаднаразова.

### Краўчанка пра нацыянальную ідэю

Кантраставалі з дакладамі выступы палітыкаў. Тон задаў Пятро Краўчанка: «Вораг захапіў наш дом і зьдзекуецца з нас. Нацыя стаіць перад выбарам: жыць ці памерці. Адзіным выйсьцем зьяўляецца рэалізацыя нацыянальнай ідэі».

А.Казулін, В.Вячорка, Ю.Хадыка, Ю.Беленькі, А.Лябедзька расказвалі аб бягучых палітычных праблемах, закалотах сярод кандыдатаў, тлумачылі сэнс сваіх палітычных плятформаў — «Волі народу», «5+», КХП-БНФ.

Але яны, відаць, перабіралі з агітацыяй. Дэлегаты і так выдатна ведаюць, што такое нацыянальная ідэя і як захаваць беларускасьць. Дый палова зь іх галасаваць на выбарах-2006 ня будзе — яны грамадзяне іншых краін. Кіраўніца «Беларускай хаткі» ў Гданьску Алена Глагоўская неўразумела пыталася ў мяне: «Ну навошта гэтае палітычнае шоў? Мы ж прыехалі сюды абмяркоўваць праблемы беларусаў сьвету». Потым яна ў сваім выступе зазначыла, што яе страшэнна злуюць электронныя лісты ад беларускіх палітыкаў, якія просяць грошай на выданьне кніг: «У мяне ў самой ляжаць чатыры кнігі ў кампутары. Ня мы, а мэтраполія мусіць дапамагаць нам».

### Казулін і два пачаткі

На наступны дзень пастар Эрнст Сабіла трапна ахарактарызаваў сёньняшнюю сытуацыю ў краіне: мора ў нас плешчацца ў начоўках, а вонкі пра гэта не чуваць.

Аляксандар Казулін выступаў хоць з паперкі, але па-беларуску. Казаў, што ў беларускай гісторыі XX стагодзьдзя трэба злучыць два пачаткі — бээнэраўскі і бээсэсэраўскі, не адмаўляючы ніводнага зь іх.

У нядзелю прайшлі выбары новага кіраўніцтва ЗБС «Бацькаўшчына». Былы кіраўнік арганізацыі гісторык Анатоль Грыцкевіч з увагі на стан здароўя і стомленасьць папрасіў адстаўкі, назваўшы свайго наступніка — мастака Алеся Марачкіна.

### Тандэм Макоўскай і Марачкіна

Старшынёй Рады ЗБС «Бацькаўшчына» перавыбралі Алену Макоўскую. За гады працы на гэтай пасадзе яна змагла стварыць жыцьцяздольную, дзейную арганізацыю з апорай на маладыя сілы.

Была таксама выбрана новая Вялікая Рада ЗБС «Бацькаўшчына», куды першапачаткова ўвайшлі 100 чалавек, але потым, па просьбах грамадзян, увайшлі яшчэ чатыры дастойныя чалавекі.

Алена Макоўская дала сваю ацэнку вынікам зьезду: «Зьезд працаваў канструктыўна, і тое, што былі спрэчкі, што рашэньні прымаліся не аднагалосна, гаворыць пра тое, што людзі маюць жывы інтарэс да арганізацыі».

«Мая ацэнка зьезду вельмі пазытыўная: дзейная група, дынамічная, нягледзячы на ўсе перашкоды, людзі працуюць — і беларускасьць мацнее», — падвёў рысу пад працай зьезду дырэктар Беларускага інстытуту навукі й мастацтва ў Нью-Ёрку Вітаўт Кіпель. Зь ім згодзен і ягоны сябар Янка Запруднік: «Такія сустрэчы зь людзьмі даюць магутны ўнутраны імпульс, які вельмі патрэбны».

Наступны зьезд — праз чатыры гады. Менавіта за гэты час мусіць адбыцца абнаўленьне беларускай дыяспары, калі маладая хваля здолее пераняць традыцыі старой эміграцыі, распрацаваўшы новыя эфэктыўныя мэтады дзейнасьці.

# Езыды

Езыды жывуць у Армэніі. Гэты народ займаецца высакагорнай жывёлагадоўляй. Рэпартаж **Андрэя Лянкевіча**.









Ёсьць два супрацьлеглыя погляды на іх паходжаньне: першы сьцьвярджае, што курды зьўляюцца продкамі езыдаў, другая тэорыя кажа абсалютна адваротнае — курды пайшлі ад езыдаў. Адзіная праўда ва ўсім гэтым тое, што галоўнае адрозьненьне адных ад другіх — гэта сынкрэтычная рэлігія езыдаў, якую яны захоўваюць цягам трох тысячагодзьдзяў.

Першыя згадкі аб храме езыдаў адносяцца да часоў Бабілёну, а на цяперашні момант адзіны храм езыдаў знаходзіцца ў ірацкім Масуле. Езыды — паганцы, яны пакланяюцца Сонцу, але адзіны бог, творца сусьвету, стварыў яго, глядзячы на паўліна. Паўлін зьяўляецца сьвятарнай птушкай езыдаў.

Езыды ня маюць сваёй Сьвятой кнігі, і ўсе рэлігійныя веды перадаюцца ў вуснай форме ў межах касты сьвятароў ад бацькі да сына. У іх тры асноўныя касты: шэйхі, піры — дзьве вышэйшыя касты, мрыды — ніжэйшая каста. Шлюбы дазваляюцца ў межах адной касты, і часам нявеста нават ня ведае, як выглядае яе будучы муж. Грамадзтва жорстка рэглямэнтавана правіламі табу, якія перадаюцца ад пакаленьня да пакаленьня. Напрыклад, нявеста ня можа размаўляць з старэйшым мужчынам зь сям'і жаніха альбо есьці пры ім, пакуль ён гэтага не дазволіць.

На вясельлі жаніх кідае яблык у галаву нявесьце. Чым на большую колькасьць кавалкаў разьляціцца яблык, тым лепей. Сьвяткаваньне Новага году ўключае ў сябе адведкі памерлых на могілках, дзе сталы стаяць побач з магіламі, прычым сталы жорстка падзелены: адны для мужчын, другія для жанчын і дзяцей. Падчас ахвярапрынашэньня пір (сьвятар) перад забіцьцём жывёліны засыпае ёй у нос соль, а потым чалавек з касты шэйхаў адразае галаву — іначай гэта будзе забойствам.

Самы драматычны момант у цыклі міграцыі езыдаў пачынаецца ў той месяц, калі яны з жывёлай пачынаюць падымацца на гару Ара, дзе напярэдадні ставяцца намёты, у якіх пастухі і іх сем'і пражывуць 5—6 месяцаў.



**Рытм жыцьця езыдаў жорстка зьвязаны з рытмам сэзонаў прыроды. Яны заўсёды гатовы да руху, у іх дамах толькі самыя неабходныя рэчы — стол, крэсла, печ. Усё ў іх жыцьці зьвязана з жывёлай. Мяса, воўна, сыр на продаж, блёкі з навозу служаць палівам. Яны жывуць у ваенных намётах часоў Савецкага Саюзу, якія атачаюць загон з баранамі дзеля абароны ад ваўкоў.**



# У цэнтры ўвагі беларускіх паслоў

**Працяг са старонкі 1.**

Будучы эўрапейскай краінай, Беларусь са сваім кіраўніцтвам працягвае паглыбляцца ў замежнапалітычную ізаляцыю ў Эўропе.

Апошнім часам назіраецца ўскладненьне двухбаковых дачыненьняў з суседкамі — Польшчай і Украінай, і пра гэта адкрыта гаворыцца на самым высокім узроўні. Уяўляецца спрэчным меркаваньне, што можна разьвіваць гандлёва-эканамічныя дачыненьні без палітычных. Што гэта далёка ня так, сьведчыць нядаўняе рашэньне Эўракамісіі пачаць маніторынг сытуацыі ў Беларусі, вынікам якога можа быць пазбаўленьне прэфэрэнцый на эўрапейскім рынку беларускай прадукцыі. У Менску прызнаюць, што гэта стане адчувальнай стратай для беларускай эканомікі. І што б ні казалі на тэму «палітыка асобна, эканоміка асобна» ў Варшаве і Вільні, павелічэньне жорсткасьці палітыкі Брусэлю ў дачыненьні да Менску павінна ўплываць і на ўсебаковую палітыку астатніх членаў ЭС. А прагназаванае ўзмацненьне трансатлянтычнай салідарнасьці ЭЗ і ЗША яшчэ больш надае ўпэўненасьці такім пэрспэктывам адносна цяперашняга беларускага рэжыму.

Уяўляецца імаверным, што менавіта такога роду развагі маглі быць у цэнтры ўвагі беларускіх паслоў, што сабраліся на вучобу ў Менску. Асабліва калі ім давозілася кантактаваць з калегам Уладзімерам Сяньком, што прыехаў з Брусэлю. Пра якія посьпехі міралюбнай замежнай палітыкі Беларусі мог бы ён расказаць, аказаўшыся «зажыва пахаваным на многія гады ўдалечыні ад радзімы? Мала хто ўжо помніць, што Уладзімер Сянько быў першым міністрам замежных спраў у Лукашэнкі. Менавіта з прафэсіяналізмам Сянька некалі зьвязваліся замежнапалітычныя надзеі сувэрэннай Беларусі. Сёньня беларускія паслы ня толькі ў Брусэлі, але і ў Парыжы, Лёндане, не гаворачы ўжо пра Вашынгтон, больш выступаюць у ролі нямых статыстаў, чым дзеючых дыпляматаў. Як уяўляецца, пасьля восеньскіх выбараў у Нямеччыне і Польшчы кагорта такіх статыстаў папоўніцца.

Дарэчы, у кулюарах удзельнікаў менскага сэмінару для паслоў цыркулявала і тэма пра кар'еру пасла ў Варшаве. Кажуць, Павал Латушка фігуруе сярод кандыдатаў на пасаду першага намесьніка міністра замежных спраў. А цяперашняга першага намесьніка Васіля Пугачова зьбіраюцца адправіць пасолм у Будапэшт. Некалі, паводле задумкі афіцыйнага Менску, менавіта з Будапэшту павінна была ажыцьцяўляцца агрэсіўная замежнаэканамічная дзейнасьць Беларусі ў балканскім рэгіёне. Цяпер, здаецца, яе неяк спрабуе ажыцьцяўляць пасол у Бялградзе Уладзімер Мацкевіч. Ён нават вывучыў сэрбскую мову.

> Нават беларускія паслы ў Брусэлі й Вашынгтоне выступаюць у ролі нямых статыстаў, а ня дзеючых дыпляматаў.

**Сяргея Мартынава** на пасадзе міністра можа зьмяніць цяперашні міністар інфармацыі **Уладзімер Русакевіч**.

**Павал Латушка** фігуруе сярод кандыдатаў на пасаду першага намесьніка міністра замежных спраў.

Цяперашняга першага намесьніка **Васіля Пугачова** зьбіраюцца адправіць паслом у Будапэшт.

Новым кіраўніком прадстаўніцтва Беларусі пры ААН у Жэнэве можа стаць галоўны прэзыдэнцкі памочнік **Уладзімер Макей**.

Паслом у Расею можа паехаць нехта з ураду, напрыклад, віцэ-прэм'ер **Андрэй Кабякоў**.

Прыметнай падзеяй у МЗС можа стаць і плянаваная замена ў прадстаўніцтве ААН у Жэнэве. Новым кіраўніком гэтага прадстаўніцтва павінен стаць цяпер галоўны прэзыдэнцкі памочнік, кадравы дыплямат Уладзімер Макей. І ў Маскве ўжо пакуе валізкі пасол-доўгажыхар Уладзімер Грыгор'еў. Толькі вось не зусім зразумела, ці зьбіраецца ён вярнуцца дамоў, ці, па прыкладзе свайго папярэдніка ў абжытой Маскве, застацца. А на месцы Грыгор'ева, лічаць некаторыя дыпляматы, паслом у Расеі можа аказацца нехта з членаў беларускага ўраду, здольны гаварыць на зразумелай мове з крамлёўскімі лібэрал-эканамістамі. Сярод такіх постацяў называюць віцэ-прэм'ера Андрэя Кабякова.

Але ў цэнтры ўвагі беларускіх паслоў, дый ня толькі іх, працягвае канфідэнцыйна абмяркоўвацца тэма будучыні новага кіраўніка замежнапалітычнага ведамства Беларусі. Цалкам магчыма, што Сяргея Мартынава можа зьмяніць ня кадравы дыплямат. Напрыклад, цяперашні міністар інфармацыі Уладзімер Русакевіч. Праўда, вопыт дыпляматычнай работы ён усё ж мае. Быў паслом Беларусі ў Кітаі. І апаратныя справы МЗС для яго не чужыя. Варта прыгадаць, што, будучы першым намесьнікам кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі, Уладзімер Русакевіч узначальваў камісію па праверцы работы МЗС. Вынікам яе дзейнасьці стала звальненьне міністра Івана Антановіча. І «маўр», зрабіўшы сваю справу, відаць, у падзяку, быў адпраўлены ў далёкі Пэкін. Так што, мабыць, новаму кіраўніку МЗС беларусі цалкам можа спатрэбіцца кітайскі вопыт працы… А што да цяперашняга міністра Мартынава, дык яго працяглы вопыт работы ў ЗША і непрацяглы — паслом у Брусэлі можа быць запатрабаваны шляхам вяртаньня ў Брусэль. У беларускай практыцы кіраваньня кадрамі магчыма ня толькі вяртаньне ў міністэрскае, але і пасольскае крэсла. Зрэшты, усіх гэтых «разборак» чакаюць не цяпер, а наступнай восеньню, напярэдадні важных палітычных падзей. У 2006 годзе ў Беларусі павінны адбыцца Усебеларускі народны сход і прэзыдэнцкія выбары. І амаль немагчыма нават уявіць сабе, што нейкая група беларускіх дыпляматаў, кіраўнікоў замежных устаноў можа публічна выступіць на баку не таго кандыдата ў прэзыдэнты. Як гэта мінулай восеньню адбылося ва Украіне.

Але, як запэўніваюць некаторыя сцэнарысты, Беларусь чакае ўласны цікавы сюжэт на зададзеную тэму. Адны гавораць, што ў ім будзе дамінаваць «вуліца». Другія — што нейкія апаратныя камбінацыі.

# Ад Res Privata да Рэспублікі

*Ліпень — месяц своеасаблівых сьвятаў, якія выконваюць «нацыязлучальную» функцыю, «гатуюць» народ, фармуюць і трансфармуюць. Піша* Пётра Рудкоўскі.

Перш-наперш — «Дзень Незалежнасьці», або «Дзень Рэспублікі», або «Дзень вызваленьня ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» — 3 ліпеня. Ажно тры настолькі ж амбіцыёзныя, наколькі сумнеўныя назвы. *Незалежнасьць, свабода і рэспубліканскі (дэмакратычны) лад* — гэта верх мараў і амбіцый беларускага народу (прынамсі, элітарнае яго часткі). Адначасова ж паўстае шэраг слушных сумневаў: 3 ліпеня прынесла нам Незалежнасьць? Рэспубліканскі лад? Свабоду?..

3 ліпеня — гэта сьвята вызваленьня-зьняволеньня, сьвята дэфармаванага пачуцьця незалежнасьці, сьвята культу Сілы. Гэта сьвята вайны. Мілітарная эстэтыка, поруч з п'яным балем, — галоўны складнік сьвяточных трэцяліпеньскіх мерапрыемстваў. «Res Publica Belarus» — гэта звычайны сьвяточны жарт. Насмрэч Беларусь — гэта «Res Privata», прыватная рэч прыватнага чалавека. Такая была задума «вызваленьня» 3 ліпеня 1944 году.

А можа, «прыватызацыя» Беларусі савецкім тыранам была больш карыснаю для нацыі, чымся прыватызацыя нямецкім тыранам? Можа, і так, але на самай справе вельмі цяжка даказаць, што *залежнасьць* ад бальшавіцка-расейскіх захопнікаў лепшая, чым *залежнасьць* ад нямецка-фашысцкіх. Бо чым жа Сталін лепшы ад Гітлера? Лепшы, мабыць, толькі тым, што Гітлер пераўтварыў у рабоў *чужыя* народы, а Сталін — *свой*, «савецкі» народ. Значная частка разбуральных плянаў Гітлера засталася, на шчасьце, толькі на паперы, а вось антычалавечыя пляны Сталіна былі, бадай, напоўніцу рэалізаваныя. Сталін аказаўся больш прыбытачным, больш удалым, больш пасьпяховым тыранам. Няважна, якія «каштоўнасьці» ён прэзэнтаваў, важна тое, што ён перамог, і таму «Сталіну, Европа, поклонись».



**Пётра Рудкоўскі ОП** — тэоляг, філёзаф.

Тое, што распаўсюднікі дэструкцыйнага для чалавецтва культу пачуваюцца ў Беларусі цалкам камфортна, мала каго бянтэжыць. Але няўжо гэты споены шматсоттысячны натоўп, які запоўніў сёлета цэнтар сталіцы ў дзень сьвяткаваньня «Дня Незалежнасьці», здольны да якога-кольвечы маральнага пратэсту? Сталіну, Гітлеру ці чорту самому — якая розьніца, каму пакланіцца, абы толькі былі жаданыя «відовішчы і хлеб»… дакладней, «відовішчы і гарэлка».

Ёсьць, аднак, немалая частка насельніцтва Беларусі, для якой усё ж *ёсьць* розьніца, *каму* кланяцца. 2 ліпеня — дзень Маці Божай Будслаўскай, першая субота ліпеня — Маці Божай Тракельскай, а 9 ліпеня — Полацкіх пакутнікаў. Гэтыя тры сьвяты маюць непалітычны характар, аднак яе ўтвараюць рэальную процівагу той (без)духоўнасьці, якая выявілася падчас палітычных сьвяткаваньняў «Дня Незалежнасьці». Гэтыя сьвяты больш сьціплыя ў сваіх праявах і менш масавыя, аднак жа іх духоўны патэнцыял намнога пераўзыходзіць афіцыйнае трэцяліпеньскае сьвята.

Тое, што «Дзень Рэспублікі» так старанна «атачаны» рэлігійнымі сьвятамі, зусім не выпадкова. Нябёсы даюць недвухсэнсоўны намёк: «Дзе ўзмоцніўся грэх, там яшчэ шырэй разьлілася Ласка».

Яшчэ адно сьвята — гэта Купальле (6—7 ліпеня). Вонкава яно непалітычнае і нерэлігійнае, а месцамі нават некультурнае. У сваіх праявах яно, на жаль, часта набліжаецца да характару сьвяткаваньня «Дня Незалежнасьці» — п'янства, бойкі, засьмечваньне паркаў і азёр. Аднак жа ў сваёй першапачатковай сутнасьці Купальле — гэта культурна-рэлігійнае сьвята, асновай якога ёсьць культ Прыроды, Жыцьця і Каханьня. Купальле — гэта сьвята, на якім *павінны* спаткацца Ян Купала і Ян Хрысьціцель, Старая Вера і Новая Вера, Натура і Культура, Дыяніс і Апалён. Папараць-кветка — гэта ці не найвыдатнейшы сымбаль Дзевы-Маці, Багародзіцы.

Задача беларусаў — *разьвіваць* будслаўскія, тракельскія і полацкія сьвяты, *пераасэнсаваць* «Дзень Незалежнасьці» і *адкрыць* Купальле.

1. Будслаў, Полацак і Тракелі — гэта «аддольны», спантанны і моцны народны рух (дарэчы, «рух» у літаральным сэнсе, бо гэтыя сьвяты папярэджаны масавымі пілігрымкамі да сьвятых месцаў), натхнёны Ласкаю. Аўтаномія і незалежнасьць народу тут эмпірычна адчуваецца. Сымптаматычна, што на гэтых сьвятах можна — нягледзячы на выразную забарону царкоўнымі ўладамі — часьцяком спаткаць бел-чырвона-белыя колеры. Тым ня менш, надта ж адчуваецца дэфіцыт культурнае формы. У Будславе, напрыклад, трасянкамоўе ярахаў і арганізацыйны хаос амаль ні ў кога не выклікае зьдзіўленьня. Усе, здавалася б, прывыклі і зжыліся з моўным бескультур'ем беларускага духавенства. Тракелі ж — гэта па-свойму цікавы ў культурным пляне фэномэн. Там усе — хто ўмее і хто ня ўмее — мусяць гаварыць і слухаць па-польску. Рэлігія і культура на Беларусі аж дагэтуль не павіталіся і робяць выгляд, што ня ведаюць адна адной.

2. Пераасэнсаваць «Дзень Незалежнасьці» — гэта, задаецца, больш цяжкая задача і патрабуе больш працяглага часу. Разьвітацца з культам Сілы, ваенным сэнтымэнталізмам і з духоўнасьцю «відовішчаў і хлеба» вельмі цяжка. Хто ведае, будзе гэтае разьвітаньне доўжыцца чатыры гады, сорак ці чатырыста год. Але пераасэнсоўваць трэба.

3. Адкрыць Купальле — значыць знайсьці тую нітку, якая сшые розныя гісторыі, розныя эпохі беларускага народу — дахрысьціянскую, хрысьціянскую і агнастычна-атэістычную. Купальле, калі знойдзе адпаведнае культурнае афармленьне, можа стацца аб'яднальнікам розных культур, якія, здавалася б, разлучаны бяз шанцаў на злучэньне.

У цень адышоў «стары» Дзень Незалежнасьці — 27 ліпеня. Але яго нястача быццам кампэнсуецца плеядай спантанных альтэрнатыўных сьвятаў, якія дзіўным трапам атачваюць, нібы хочучы яго паглынуць, 3 ліпеня.

…«Нацыязлучэньне», як бачым, можа адбывацца па-рознаму. Можна аб'ядноўваць народ мэтадам «відовішчаў і хлеба», а можна — праз пасрэдніцтва культурных і духоўна-рэлігійных каштоўнасьцяў. Вось жа выконваючы няўдзячную працу над культурна-духоўным адраджэньнем народу, варта памятаць пра згаданы «намёк нябёсаў».

# Высокія абцасы

**ЛЕРА СОМ**

Я зь дзяцінства марыла насіць туфлі на высокіх абцасах. Але мне іх ніколі не набывалі. «Паглядзі, ты й так вырасла на лес гледзячы, куды табе яшчэ абцасы»,— казалі мне ў чарговы раз, і чарговая пара абутку падымала мяне над зямлёй на якую пару сантымэтраў. Убітая ў галаву максыма пасьпяхова спрацоўвала і надалей цягам амаль пятнаццаці год, тым больш што спробы прыўзьняцца над паверхняй выбоістага полацкага асфальту трохі вышэй за згаданыя ўжо сантымэтры ня скончваліся нічым добрым. Абцасы, вырабленыя на найлепшых у сьвеце савецкіх абутковых фабрыках, пры перавышэньні гэтае сакрамэнтальнае вышыні праз пару дзён нашэньня пачыналі падгінацца назад ці наперад і ператваралі хаду на абцасах у хаду на дыбачках. Паколькі хадзіла я заўсёды многа і хутка, такі варыянт мяне ну ніяк ня мог задаволіць.

Адзіныя ў юнацтве абцасы аж на цэлых дзевяць сантымэтраў былі ў мяне ў так званых калодках — старэйшыя, прыгадайце моду першай паловы 80-х! Гэтыя самыя калодкі — нешта накшталт басаножак на вельмі тоўстай падэшве — набыла мне недзе з рук мама, нягледзячы на сваё асаблівае стаўленьне да ўсяго, што павялічвала мой завялікі, на яе думку, рост.

Гэтыя калодкі я стаптала ўшчэнт на дасюль нялюбых віцебскіх вуліцах (у мяне з кожным горадам свае дачыненьні, у якіх сам горад, збольшага, не вінаваты), бегаючы з інстытуту ў інтэрнат, з інтэрнату ў інстытут, у прамежках не забываючыся наведаць студэнцкі тэатар, турыстычную сэкцыю і дыскаклюб, пасьпяваючы папіць кіслага баўгарскага віна і жыгулёўскага піва на паддашках двух віцебскіх дванаццаціпавярховікаў. На адзін зь іх — той, што насупраць майго інстытуту, — мяне прывядзе ўлюбёная сяброўка-філфакаўка Ленка, што прычыніцца пазьней да маёй прыватнай беларусізацыі, на другі — той, што на пляцы трох штыхоў, — я ўпершыню патраплю ў кампаніі дыскаклюбных прыяцеляў і разбаўленага сьпірытусу ў бутэльцы з-пад ліманаду «Бураціна», які прыцягне мэдсястрычка Іна, прыгажуня зь мяккімі рукамі і заўсёды цьвярозай галавой.

Гэтыя калодкі папанасілі ўсе мае шматлікія на той момант знаёмкі, якім яны падыходзілі памерам, у тым ліку і тая, што лічылася сярод блізкіх сяброўак і якая праз колькі год будзе пэрыядычна запрашаць мяне прыехаць да яе ў Менск, «забыўшыся» на тую сустрэчу, якую наладзіла мне аднойчы ў тым самым горадзе на вуліцы рэвалюцыянэркі з маім найулюбёнейшым у чатыры гады імем Роза. На сустрэчы прысутнічалі чацьвёра яе старэйшых сяброў, і пасьля яе я пэўны час увогуле пазьбягала заходзіць да каго-небудзь у госьці, хоць ад поўных праяў гасьціннасьці мяне ўратавала ўменьне майго маладога арганізму спраўляцца зь вельмі вялікімі дозамі алькаголю ды — у нечым — вельмі ўстойлівыя і досыць вострыя абцасікі маіх калодак.

Мае калодкі чакалі мяне на пясочку тады, калі я другі раз у жыцьці пераплывала Дзьвіну (зазначу, што ў раёне Віцебску зрабіць гэта — не такі ўжо і подзьвіг).

Яны былі са мной усё маё першае сур'ёзнае каханьне — некалькі год штодзённых фантазій і лічаных сустрэч.

Паступова яны стапталіся. Разьвітаньне было горкім: раўназначнай замены быць проста не магло.

Першую ў жыцьці нармальную пару мадэльных імпартных туфель на тых самых мройных абцасах падарыла мне дзяўчынка Ніна, выпадковая знаёмая з аднаго са шматлікіх бардаўскіх збораў у Падмаскоўі. Ніна была сталай жыхаркай Масквы, і яе дом, што колькі разоў рабіўся маім прытулкам у маскоўскіх вандроўках, я і цяпер пры жаданьні знайду, што называецца, навобмацак, так і не даведаўшыся ні назвы раёну, ні назвы вуліцы, на якой ён стаяў.

Гэта быў вельмі дарагі падарунак — туфлі нават афіцыйна каштавалі больш за мой месячны заробак. Ніна, якая жыла без бацькоў і зазвычай сядзела бяз грошай, магла б зь лёгкасьцю іх прадаць, але чамусьці аддала мне — проста так, без чаканьня аддачы ці ўдзячнасьці. Такія падарункі лёгка дорацца і прымаюцца ў маладосьці, калі твая ўяўная безадказнасьць — на самай справе нічым не закаламучаная ўпэўненасьць у тым, што аднойчы да цябе ўсё прыйдзе і ты, зразумела, зь лёгкасьцю вернеш усе пазыкі — духоўныя і матэрыяльныя.

Мы лёгка разьвіталіся зь Нінай, а праз пару гадоў я сеё-тое пачула пра яе ад аднаго супольнага знаёмага. Дзяўчынка Ніна паехала ў водны паход на Каўказ (было лета 1990-га, і Саюз непарушны рэспублік свабодных яшчэ меў месца быць, а нашы раўналеткі гінулі не ў Чачэніі). Чаканы спуск з горных вяршыняў на вясёленькай зялёнай байдарцы чамусьці не адбыўся, Ніна неяк адстала ад групы — не хачу прыводзіць тут, як бы я назвала пры сустрэчы кіраўніка таго паходу, — выбірайце вашы ўлюбёныя ненарматыўныя выразы. Дзяўчынку Ніну падхапілі мясцовыя міліцыянты, замкнулі на дзень у нейкім пустым доме, а пасьля гвалцілі ўсю ноч. Распраналі Ніну пры дапамозе нажоў. Яна не супраціўлялася, і, магчыма, гэта ўратавала жыцьцё ёй і яе дзіцяці, якога яна ўжо мела пад сэрцам, калі выпраўлялася ў паход…

Пару Нініных туфель я насіла амаль сем гадоў. Хадзіць у іх, нягледзячы на высокія абцасы, было больш зручна, чым у савецкіх красоўках, а разьвіталася я зь імі пасьля таго, як занесла ў рамонт — памяняць набойкі. Ня ведаю, што рабілі з тымі туфлямі таварышы рамонтнікі, але пасьля рамонту насіць іх стала немагчыма: абцасы падгіналіся на ўсе бакі, мусіла выкінуць.

Трэцюю пару туфель на абцасах я набыла самастойна. І цяпер перад вачыма гэтыя прыгожыя туфлікі — ладна зьлепленыя, вытанчана фіялетавыя, на высокай трывалай шпільцы. Некалькі разоў на год я выцягвала іх з шафы, каб нагледзецца на ідэальныя абрысы. Я ніколі нікуды іх не абула: ад самага пачатку яны былі мне безнадзейна малыя.

Я разышлася зь імі аднойчы пад Новы год, зразумеўшы, што пачынаю адчуваць ціхую нянавісьць да ўсяго сьвету, які не дазваляе пабольшаць гэтым туфлям ці пакарацець маім нагам. Спадзяюся, яны прыйшліся даспадобы той бамжысе, якая знайшла пакунак у сьметніцы раніцай 1 студзеня 2001 году, — прыемны падарунак у гонар новага тысячагодзьдзя.

Я працягваю любіць высокія абцасы, хоць перажываньняў з нагоды далучанасьці ці недалучанасьці іх да ўласнае пяткі ўжо няма.

Я не перарасла жаданьня ўзьняцца вышэй, да неба, і гэта трохі заспакойвае ў тыя хвіліны, калі непамерна заядае будзённы клопат.

Жаночая ножка на немагчыма высокай шпільцы — гэта тое, што я і цяпер аўтаматычна вымалёўваю ў сшытку ў хвіліну суму ці засяроджанасьці, нават тады, калі маю на нагах нешта падобнае на мой недасягальны ідэальны вобраз.

Вось як цяпер, калі я сяджу на кухні, уначы, у сінім хатнім халаце ды запісваю гэтыя словы, набліжаючыся да апошняй кропкі.



**Лера Сом** — паэтка, бард, жыве ў Полацку.

**НАВУКА**

# Старыя зрабілі чалавека чалавекам

…У адной вёсцы, калі старыя людзі ўжо зусім нічога не маглі рабіць па гаспадарцы, сын садзіў таго старога на саначкі й завозіў у лес. Тамака доўбняй у лоб… Увязаўся аднойчы за дзедам і ўнук. Прывезьлі старога ў гушчар, зрабіў бацька патрэбную справу дый кінуў саначкі — на чорта яны больш? А малы, што соваўся побач, забраў саначкі з сабою, патлумачыўшы бацьку, што яны спатрэбяцца яму, калі татка пастарэе… Гэтае беларускае паданьне дужа-дужа даўняе. Гэтак, прынамсі, сьцьвярджаюць амэрыканскія навукоўцы.



Хутчэй за ўсё, нехта з нашых продкаў датумкаў, што малых можна пакідаць з бабуляй і дзядулем, пакуль маладыя мамка й татка ганяюць таманта сярод пушчы.

Адным з чыньнікаў таго, што чалавек зрабіўся чалавекам, паводле іх слоў, зьяўляецца тое, што Homo sapiens зьвярнуўся да сваіх бацькоў. Недзе 30 тысяч год таму людзі пачалі выраблянь розныя рэчы, назапашваць вопыт і майстэрства, сталі мудрэйшыя ад сваіх папярэднікаў. Людзі пачалі жыць даўжэй і прыстасоўвацца да розных нечаканых абставін.

Калі цыганы купляюць коней, дык найперш аглядаюць зубы. Тую самую мэтодыку выкарысталі й амэрыканскія навукоўцы. Пачалі здымаць з паліц сківіцы, якіх багата захоўваецца ў музэях ды інстытутах на цэлым сьвеце. Гэтак вучоныя дасьледавалі 768 акамянелых парэшткаў зубоў аўстралапітэкаў (жылі тры мільёны год таму), Homo erectus (каля мільёна год), нэандэртальцаў (35 тыс. год таму) і першых краманьёнцаў. Шукалі яны ў іх ня карыес — спрабавалі вызначыць узрост колішніх гаспадароў сківіц на падставе іх скарыстанасьці.

Навукоўцаў цікавіла прапарцыйнасьць маладых і старых. Маладым лічыўся пятнаццацігодак, здольны да размнажэньня, у якога ўжо прарэзаліся васьмёркі, але які ўжываў іх нядоўга. Старым лічыўся доўгажыхар, які мог на той час называцца «дзедам» ці «бабкай» і пражыў 30 год.

Як высьветлілася, падчас эвалюцыі першабытныя людзі мелі праблемы са старэньнем нацыі: узрастала колькасьць старых сярод усяго дарослага насельніцтва. Калі ў аўстралапітэкаў адзін «дзядок» прыпадаў на 8—9 маладзёнаў, дык ужо Homo erectus мелі аднаго старога на чатырох. А потым нашы прашчуры Homo sapiens сутыкнуліся, відаць, з пэнсійнымі праблемамі: колькасьць людзей «сталага» ўзросту павялічылася ў некалькі разоў. Жыцьцёвыя ўмовы паляпшаліся, і працяглась жыцьця падаўжалася. Два старыя прыпадалі на аднаго маладзёна!

У той жа час, каля 30 тысяч год таму, адбыліся вялікія зьмены ў людзкіх паводзінах. Зьявіўся наскальны жывапіс. Чалавек пачаў хаваць памерлых разам зь біжутэрыяй, пачаў упрыгожваць сваё цела. Усё гэта адбылося, паводле слоў навукоўцаў, з прычыны таго, што першабытныя людзі пачалі карыстацца інфармацыяй мінулых пакаленьняў. І ўсё праз тое, што старых людзей пачалі паважаць і берагчы.

Хутчэй за ўсё, нехта з нашых продкаў датумкаў, што малых можна пакідаць з бабуляй і дзядулем, пакуль маладыя мамка й татка ганяюць маманта сярод пушчы. Гэтак спатрэбіліся ў гаспадарцы нямоглыя, слабыя і часта хварэючыя члены сям'і.

Бабкі й дзедкі, седзячы каля вогнішча на скуры шаблязубага тыгра, апавядалі малым пра сваё жыцьцё, дзяліліся, так бы мовіць, сваім вопытам выжываньня. Да той старэчай балбатні прыслухваліся вечарамі й старэйшыя, якія стомлена пераважоўвалі мяса пасьля працоўнага дня, гледзячы на агонь. Падчас добрага надвор'я расьліну для ежы мог знайсьці любы. А калі пачыналася суша ці, наадварот, макрэча — тады, як высьветлілася, можна было скарыстаць вопыт старэйшых, якія такую непагадзь некалі перажылі. Таксама «пэнсіянэры» маглі распавесьці, якія расьліны й грыбы можна есьці, а якімі іх колішнія сучасьнікі атруціліся.

Вопыт тых, хто перажыў «крытычны ўзрост» і стаўся паважаным старцам, дазваляў павялічваць жыцьцё малодшаму пакаленьню. Таму жыць рабілася лепей. Выснова, якую робяць амэрыканскія навукоўцы, — старое пакаленьне зрабіла чалавека чалавекам.

Вазіць на саначках у пушчу сваіх нямоглых дзядоў нашы прашчуры кінулі больш як 30 тысяч год таму. З пакаленьня ў пакаленьне перадаючы, аднак, паданьне пра той жахлівы звычай.

**Руслан Равяка**

# Памяці Яніны Каха免оўскай

Пад Нью-Ёркам на 96-м годзе жыцьця памерла **Яніна Каханоўская**. Пра сваю бабцю Яніну ўспамінае дырэктар беларускай службы радыё «Свабода» **Багдан Андрусішын**, вядомы як сьпявак Данчык.

Як я ганарыўся ёю ў той восеньскі вечар амаль шэсьць гадоў таму, калі бачыў, як яна ўсьміхалася за сьвяточным сталом у элегантна скроенай ярка-чырвонай блюзцы, з акуратна зачасанымі валасамі і бездакорным макіяжам. За хвіліну перад тым яна, нічога не падазраваючы, увайшла ў прыцемненую залю гэтага рэстарану на Мангэтане і была агаломшаная, пабачыўшы, што каля сотні яе найбліжэйшых сяброў і родных патаемна згаварыліся сабрацца і дапамагчы ёй адзначыць круглую дату.

У той вечар Бабця трымалася цудоўна — з выпрастанай сьпінай, з высока ўзьнятай галавой, гордая і непарушна-спакойная нягледзячы на эмацыйны штуршок, які ёй давялося перажыць, калі рэстаран раптам засьвяціўся ўсімі агнямі і ўсе хорам засьпявалі: «Сто год!»

Зь яе твару ў той вечар не зьнікала ўсьмешка — і ня толькі з прычыны сьвяточных урачыстасьцяў.

### Жыцьцё з усьмешкай

Мая Бабця пражыла з усьмешкай усё сваё жыцьцё — з самай цёплай і самай шчырай усьмешкай, якую толькі можна сустрэць. Яе ўсьмешка была адбіткам самой яе душы — поўнай любові, шчодрасьці, прабачэньня, цярплівасьці, адкрытасьці — усьмешка была яе візытоўкай. Хвароба, рэвалюцыя, вайна, выгнаньне, голад і нястача, асабістыя болі і страты — ніводная з гэтых жыцьцёвых нягодаў не магла спабарнічаць зь яе непакорлівым духам. Яна проста адмаўлялася верыць, што жыцьцё можа быць ня толькі прыгожым, а людзі ня толькі цудоўнымі. «О, ён цудоўны!», «О, яна цудоўная!» — з захапленьнем казала яна пра любога, каго згадвалі ў размове (калі толькі гэта не былі камуністы — гэтых яна з жыцьцёвага досьведу з поўным правам, не хаваючыся, ненавідзела).

Я думаю, што якраз гэты непахісны аптымізм і шчодрая на любоў душа надавалі Бабці энэргіі, калі яна, усьміхаючыся, кружылася ў вальсе, стаўшы ў свае 90 гадоў зоркай сьвяточнага балю.

### Рамантычна незалежная

Да гэтага трэба дадаць яе незалежнасьць. Яна ганарылася тым, што доўга жыла сама ў сваёй кватэры, сама за ўсё плаціла, ніколі ня мела даўгоў, часта падарожнічала і наведвала мяне — спачатку ў Нямеччыне, а пасьля ў Чэхіі. Бабця пагарджала алькаголем і тытунём, бо лічыла, што яны пазбаўляюць чалавека свабоды.

Аднак разам з тым яна не была пурытанкай — я асабліва ганарыўся яе разнастайным рамантычным мінулым! Бабця ніколі не была схільная загадваць або павучаць, ніколі не казала нікому, што думаць або рабіць ці як сябе паводзіць. Яна паважала ўсіх і, здавалася, бачыла ўнутранае сьвятло нават у тых, каго я часам лічыў менш чым вартым яе прыязнасьці і бясконцай шчодрасьці. Калі я асьцярожна папярэджваў, што іншыя спрабуюць яе выкарыстоўваць, яна проста адказвала мне той самай цёплай усьмешкай: яна зусім не абавязкова мусіла мець рацыю або пераконваць мяне, што я памыляюся. І ўсё ж у такія моманты я звычайна зьдзіўляўся — як яна, пражыўшы так доўга і спазнаўшы і крыўду, і здраду ад іншых людзей, магла заставацца такой прастадушнай, адкрытай і даверлівай.



1943 год. Яніна (зьлева) з маці Эміліяй Шабуняй на менскай вуліцы Садовай, 2 (цяпер Купалаўскі сквэр).

### Нябога Луцкевічаў

Бабціна любоў да жыцьця мела і сваё смакавае выяўленьне. Яна вельмі любіла вострыя і салёныя стравы, асабліва селядца. Любіла яна і вэнджаныя кілбаскі, а часам нават магла паласавацца скрылёчкам сала! (Не была б яна беларускай...) Як сусьветна вядомая Джулія Чайлд, яна была вынаходлівым кухарам (я мог зьесьці за раз шмат порцыяў яе «чахахбілі») — і не прызнавала ніякіх тлушчазаменьнікаў і страваў «здаровага харчаваньня». Дарэчы, беларускае сала было адной зь нешматлікіх рэчаў, па якіх Бабця сумавала будучы далёка ад бацькаўшчыны. Хоць яна часта падарожнічала па Эўропе і мела шмат адпаведных нагодаў, яна так ніколі і не захацела наведаць Беларусь пасьля паваенных уцёкаў.

Мая бабуля, Яніна Каханоўская, у дзявоцтве Шабуня, нарадзілася ў 1909 годзе ў Менску ў заможнай сям'і шляхецкага паходжаньня. Яе мама Эмілія хадзіла ў тую самую школу, што і царскія дочкі — хоць яе дзядзькі, Іван і Антон Луцкевічы, пазьней, у 1918-м, адмовіліся ад клясавых прывілеяў і сталіся рэвалюцыянэрамі-архітэктарамі новай дэмакратычнай дзяржавы — недаўгавечнай Беларускай Народнай Рэспублікі.

Бабця часта распавядала мне, як яна любіла свой родны горад і як яна ніколі ня думала, што будзе жыць недзе яшчэ. Але «бальшавікі забілі ўва мне ўсю любоў і настальгію, якія я толькі мела — а галоўнае, што яны самі ўсё яшчэ там сядзяць!» — гэтак яна казала пра цяперашнія ўлады і так ніколі і не дала сябе пераканаць. Выхаваная да рэвалюцыі з дапамогай нянек, бабця часам расказвала, што калі яна сьціплым летам 1950-га прыехала ў Гарлем, яна ня мела з сабой ані лыжкі і, ня ведаючы ні слова па-ангельску, была вымушаная выконваць цяжкую фізычную працу. Аднак, паводле яе, тысячы кілямэтраў сушы і акіяну, якія цяпер аддзялялі яе ад сачэньня, арыштаў і рэпрэсіяў мінуўшчыны, былі больш чым дастатковай кампэнсацыяй... «Мне сьвеціць сонца, я дыхаю вольным паветрам — а бальшавікі далёка-далёка!», — з радасьцю казала яна ў тыя дні — прынамсі, так я пра гэта чуў.

Бабця вельмі тонка ўспрымала прыроду. У яе займала дух, калі яна разглядала ружовыя пялёсткі півоняў або ўслухоўвалася ў шапаценьне цвыркуноў надвячоркам. «Ча-ча-ча», — паўтарала яна за імі, калі суботнімі вечарамі мы выходзілі з машыны ў сад нашага лецішча на поўначы штату Нью-Ёрк.

### Шчырасьць пачуцьцяў

Бабця любіла жывёлаў і з усёй адданасьцю замяняла маці Чыце і Мімі — нашым даўно заснулым сіямскім коткам, самыя імёны якіх імгненна выклікалі шчырыя, буйныя, зусім не кракадзілавы сьлёзы.

Ага, сьмешна, што я згадаў пра кракадзілаў... Калі я быў маленькі, я быў зачараваны, калі глядзеў, як яна малое гэтых страшных рэптыліяў — з усьмешлівай, крыху разяўленай пашчай, у якой заўважаюцца клыкі, з шышкаватым хрыбтом, які заканчваецца пакручастым хвастом. «Ты ведаеш, што я — кракадзіл?» — казала яна поўнаму захапленьня ўнуку — чамусьці узяўшы сабе ў галаву, што ў яе ўсьмешцы ёсьць нешта ад кракадзіла. Дзіўна, што яна надавала такі нечаканы сэнс самай характэрнай і дабрадушнай рысе свайго твару...

Наагул Бабця рабіла вельмі добрыя малюнкі — яе нават запрасілі праілюстраваць некалькі беларускіх дзіцячых кніжак. Мне асабліва падабаліся яе спакусьлівыя вядзьмаркі на мятле ў чорных мантыях і вострых капелюшах; яны нагадвалі мне Эльфабу, страшную Злую Вядзьмарку з Заходу з кнігі «Чараўнік з Озу» — толькі Бабціны вядзьмаркі былі хоць і зламысныя, але значна больш прыгожыя і элегантныя.

### Трымаць сябе

Для жанчыны, якой ужо за 90, Бабця выглядала вельмі эфэктна. Пасьля шматлікіх выпадкаў, калі афіцыянты ў рэстаранах або прадаўцы ў крамах пыталіся: «Гэта ваша маці?», я пачаў сур'ёзна непакоіцца за сваю ўласны выгляд — ці не выглядаю я занадта старым? «Бабця, ты б, можа, перастала фарбаваць валасы — а то мне ўжо робіцца нясмешна!» — казаў я, удаючы абурэньне. Але ў душы я быў вельмі шчасьлівы, што яна выглядала дастаткова маладой, каб мець 40-гадовага сына.

Бабця не была занадта рэлігійнай, аднак яна захоўвала глыбокую духоўнасьць і паважліва ставілася да ўсіх рэлігіяў. А яшчэ яна была вельмі адважная: Маці аднойчы расказвала мне, што падчас нямецкай акупацыі Бабця часта рызыкавала быць арыштаванай, бо насіла ежу і адзеньне ў менскае гета. У яе кватэры можна было пабачыць розныя прадметы рэлігійнага характару. Я памятаю прыгожы абраз Чорнай Мадонны, які вісеў у яе над ложкам, але адным з маіх найбольш жаданых прадметаў ва ўтульнай зацішнай гавані, якою была яе кватэрка ў Іст-Вілідж, была блішчучая гіпсавая фігура Буды, якая доўгія гады ўпрыгожвала яе камін.

Бабця была эгіптолягам-аматарам, і ў 1960-я гады яна была маім пэрсанальным гідам у вялікай эгіпецкай калекцыі музэю Мэтраполітэн. Яна вучыла мяне як вымаўляць імёны накшталт Хатшэпсут, Эхнатон і Тутанхамон — яна асабліва любіла гэтага хлопчыка-цара і нават замовіла партрэт яго славутай пасьмяротнай маскі. Партрэт гэты вісеў на самым відным месцы ў яе гасьцёўні. Дзяцінства маё поўнае ўспамінаў пра нядзельныя экскурсіі з Бабцяй у заапарк у Цэнтральным Парку, у музэй сярэднявечнага мастацтва Клойстэрз, у мастацкі музэй Фрыка.

Хоць яна вельмі ганарылася маімі сьпявацкімі посьпехамі ў Беларусі, Бабця заўсёды хіхікала, калі падчас рэпэтыцыяў з гітарай у руках за сталом у яе на кухні ў мяне на высокіх зрываўся голас. «Ууу, зноў пусьціў пеўня!» — казала яна, зь цяжкасьцю стрымваючы сьмех.

### Смак да жыцьця

Бабця была прагным чытачом і вяла дзёньнікі, дзе перапісвала сваім прыгожым, дробным, амаль каліграфічным почыркам улюбёныя мясціны з твораў Буніна, Багдановіча, Ахматавай, Караткевіча, Цьвятаевай, Дастаеўскага... Праўда, пазьней Бабця пачала чытаць і менш сур'ёзныя кнігі і з захапленьнем пераказвала кніжкі накшталт «Коду Да Вінчы» або «Дзяўчат-самагубцаў». Калі я быў малы, мы мелі аднолькава вострыя адчуваньні ад страшных фільмаў і нецярпліва чакалі працягаў. Яе ўлюбёным фільмам апошнімі гадамі была «Зялёная міля» з Томам Гэнксам, ён падабаўся ёй за містыцызм і ідэю прабачэньня. Я купіў ёй гэты фільм на DVD, калі апошні раз быў у Нью-Ёрку два месяцы таму. Тады я яе бачыў апошні раз...

Лішне казаць, што я быў найбольшым прыхільнікам і абаронцам Бабці. І таму я быў вельмі ўражаны, калі ў мінулым месяцы наведаў у Менску Музэй Максіма Багдановіча. Там я пабачыў дзіцячую фатаграфію Бабці побач з фатаграфіяй яе маці, маёй прабабкі Бабы Мілы, якая жыла з намі і памерла, калі мне было 16. Жанчына-гід распавяла, што каля 1911 году Багдановіч, магчыма, заляцаўся да маладой тады бабы Мілы і вазіў на сабе як конік яе маленькую дачку Яніну. Як добра, думаў я, што гэтыя дзьве вялікія жанчыны майго жыцьця былі ўвекавечаныя ў музэі, нават калі вядомыя яны былі толькі праз знаёмства зь вялікім паэтам.

Найбольш відавочным для мяне, вядома ж, быў адзін просты факт: Мая Бабця проста бясконца мяне любіла. Хоць нас падзяляла пяцідзесяцігадовая розьніца ў веку, мы былі блізкімі душамі і найлепшымі сябрамі.

За тыдзень да сьмерці Бабця сур'ёзна захварэла і яе сьпешна завезьлі ў шпіталь. Была субота. За тысячы кілямэтраў адтуль я ўжо моцна спаў у сваёй праскай кватэры. І дакладна ў той самы пакутлівы момант у жыцьці маёй вялікай сяброўкі я раптоўна прачнуўся, пачуўшы, як яна ў роспачы кліча мяне, нібыта просячы аб ратунку.

...Каб жа я толькі мог яе ўратаваць, лепей яе абараніць, быць зь ёй у той момант! Але я ня мог, і здарылася тое, што мне цяжка было сабе ўявіць. Хай сабе гэта прагучыць эгаістычна, але мне было замала проста мець Бабцю побач амаль 50 гадоў, бо... вядома, я таксама бясконца яе любіў.

І таму што яна гэта ведала, мне прыемна думаць, што яна ўсьміхаецца і цяпер — і цяпер ужо сапраўды нябеснай усьмешкай.

**Паводле svaboda.org**

# Зразы



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Такія зразы гатуюць у рэстарацыі «Белая Русь», што ў гатэлі «Менск».**

Ці не сама каралева Бона завезла іх рэцэпт з Італіі. Даўні сармацкі далікатэс смакуе Алесю Беламу і Сяргею Харэўскаму.

Паходжаньне зразаў дакладна не акрэслена, але большасьць знаўцаў лічыць іх тыповай беларуска-літоўскай стравай. Польшча й Украіна, як спадкаемцы Рэчы Паспалітай, таксама заяўляюць свае прэтэнзіі на даўні сармацкі далікатэс. Бальшыня польскіх дасьледчыкаў кулінарыі аднадушна сьцьвярджаюць, што ў нашу старалітоўскую кухню зразы трапілі з польскай. Гэтая страва — прадмет асаблівага гонару палякаў (зразы па-варшаўску, па-кракаўску, па-гуральску), якія спасылаюцца на пісьмовыя згадкі пра яе ажно ад XIV ст.

Хоць і польскія калегі не спрачаюцца аб тым, што зразы да іх трапілі зь Нямеччыны. Украінцы, нарэшце, называюць іх завіванцамі або кручонікамі. Аналягічная страва здаўна вядома і традыцыйнай вясковай італьянскай кулінарыі, што наводзіць на думку: ці не каралева Бона завезла іх у нашы краіны? Сакрэт паходжаньня зразаў яшчэ чакае сваіх Капэрнікаў і Калюмбаў.

Упершыню рэцэпт зразаў пісьмова зафіксаваны ў славутай кнізе Вайцеха Вялёндкі «Кухар дасканалы» (1783). У літаратуры XIX ст. зразы — адзін з сымбаляў «страчанага раю», нясьпешнага старасьвецкага жыцьця, незалежнасьці і дабрабыту. Як у «Пане Тадэвушу»:

А для мужчын ляжала розная вяндліна:
Гусяціна, валовіна, язык, сьвініна
Найлепшага гатунку, спосабам мясцовым
Увэнджаная дбайна дымам ядлаўцовым.
А на астатак зразы чэлядзь падавала.
Дык вось як сьнедалі ў Судзьдзі ў той час,
бывала.

## Толькі зь ялавічыны

Сёньня зразы далёка перакрочылі межы колішняга сармацкага сьвету. Пашукаўшы, можна з пэўнасьцю сказаць: стравы, падобныя да нашых зразаў, ёсьць у кожнай народнай кухні Эўропы. Ад сівое даўніны іх папулярнасьць зусім ня зьменшылася. Наадварот, інгрэдыенты сталі значна больш даступнымі. Засталося толькі пару правілаў.

Добрыя зразы гатуюць з добрай ялавічнай выразкі. Хоць можна яе замяніць бараніной і цяляцінай. Аднак сапраўдныя зразы — толькі зь ялавічыны. Астатнія разнавіднасьці зразаў (з бульбы, фаршу ды бліноў) — вынаходка найноўшага часу, што толькі прыўносіць блытаніну ў спрадвечныя рэцэпты. Абавязковы гарнір да зразаў — рассыпістая грэцкая каша. У горшым выпадку — груца. Але нічога іншага — ні рыс, ні макарона, ні кукуруза!

У літоўцаў зразы завуцца «ristiniaj». Гэтак называюць зазвычай страву з адбіванае ці сечанае ялавічыны, начыненую яйкамі, цыбуляю, чорным хлебам, бульбаю, бручкаю, капустаю, салёнымі гуркамі ці грыбамі альбо спалучэньнем гэтых прадуктаў. Літоўцы гатуюць свае «рысьціняі» ў рондалі, а не на патэльні, і не абавязкова яны маюць форму катлет. Бадай, толькі ў гэтым і палягае розьніца паміж нашымі «зразнымі» традыцыямі. Тут бліжэйшая нам традыцыя сучаснага польскага кухарства.

## Кручонікі

Сёньня зразы — адна з пашыраных страў міжнароднай рэстараннай кухні, што мае безьліч варыянтаў, якія зводзяцца да двух асноўных — «завіваныя» і «сечаныя». Клясычныя зразы — менавіта «завіваныя», з цэльнага мяса (як правіла, ялавічыны) з начынкай з разнастайнай гародніны, грыбоў, яек, бульбы і інш. Клясычных фаршаў зафіксавана безьліч, але ніхто не забараняе кожнай гаспадыні паэкспэрымэнтаваць са сваім уласным, зьдзіўшы гасьцей адмысловым смакам традыцыйнай стравы. Зразы ядуць з соўсам, у якім яны тушыліся, — мясным, грыбным, цыбульным…

На «завіваныя» зразы вам спатрэбіцца найперш 500—700 г добрай мяккай ялавічыны. Вымытае і асушанае мяса крояць на тонкія пласты, зьлёгку адбіваюць, пасыпаюць сольлю і перцам, накладаюць фарш, згортваюць, абкручваюць баваўнянай ніткай, абсмажваюць на моцна разагрэтым тлушчы. Перакладаюць у рондаль, дадаюць цёртую на тарцы цыбулю, пакроены тонкімі скрылькамі сэльдэрэй, перац, ляўровы ліст, іншыя прысмакі й зеляніну, заліваюць гарачым булёнам, шчыльна накрываюць і тушаць на павольным агні 45—50 хвілін. Перад падачай ніткі асьцярожна вымаюць, соўс праціраюць праз сіта, часам загушчваюць сьмятанай, мукой і г.д. і яшчэ крыху гатуюць.

## Сечанцы

«Сечаныя» зразы зьявіліся значна пазьней, як імітацыя клясычнага ўзору і часткова з патрэбы неяк утылізаваць рэшткі мяса ды іншай сыравіны, якая заставалася на кухні ад іншых страў. Фарш лепш гатаваць мяшаным, зь ялавічыны і сьвініны, дамешваць у яго дробна пакроеную і абсмажаную цыбулю, варанае яйка ды амаль любую гародніну, кашу або іншы прадукт, якому гаспадыня ня можа прыдумаць ужытку. Зьлепленыя галкі паніруюцца, крыху абсмажваюцца, а далей тушацца ў соўсе, як і завіваныя зразы.

Слова «зразы» паступова пашырылася і на стравы, досыць далёкія ад пачатковага ўзору, дзе мяса — зусім не галоўны кампанэнт. І, вядома, у Беларусі не магло абысьціся бяз зразаў з бульбы!

Запіваць такія стравы найлепей халодным кіслым малаком ці кефірам, куды папярэдне варта накраіць маласольных гурочкаў і багата зялёнага кропу. Зрэшты, надаецца й халоднае піва. Смачна есьці!

## Зразы па-наску

600—700 г мяккае ялавічыны, алей, 100—150 г сычужнага сыру, 100 г вэнджанага тлустага кумпяка, 25—30 г пятрушкі, 15—20 г кропу, каліва ядлаўцовых ягад, грэчка.

Для поліўкі: прыкладна 300 г абсмажаных на алеі таматаў з дадаткам масла, 200 г сьвежых грыбоў, лыжку таматнае пасты, каліва ядлаўцовых ягад, кмен.

Мяса пакраіць танюткімі скрылёчкамі, зьлёгку абабіць й спрысьнуць лімонным сокам з халоднай вадою, дадаць меленага ядлоўцу, даць пастаяць.

Падрыхтаваць начынку: сыр нацерці на буйной тарцы, кумпяк пакраіць танютка саломкаю, зяленіва дробна пасекчы. Дадаць тоўчаны ядловец, духмяны перац і крыху перцу чылі. Усё перамяшаць, патаўчы.

На поліўку: згатаваць амаль да канца грыбы, танютка парэзаўшы, абсмажыць у алеі з маслам. Туды ўкінуць таматную масу, тоўчаны ядловец. Дадаючы грыбнога адвару, тушыць да ўтварэньня аднароднай масы.

Асобна згатаваць грэцкую кашу: 12—13 хвілін варыць, столькі ж трымаць у шчыльна закрытай пасудзіне.

На падрыхтаваныя папярэдне скрылёчкі мяса выкласьці начынку, згарнуць у выглядзе каўбасак, зьвязаць ніткамі. Каўбаскі крышку падсаліць, зважаючы на саланаватасьць іншых інгрэдыентаў, папярчыць і крышку абсмажыць на вялікім агні з абодвух бакоў. У гаршчочак ці чыгунок на дно пакласьці тонкія скрылёчкі кумпяка, на іх — падсмажаныя зразы (ужо бязь нітак), зьверху засыпаць грэцкай кашаю. Усё заліць поліўкаю, засыпаць тоўчаным кменам, шчыльна накрыць накрыўкай і тушыць 30—35 хвілін.

## Зразы з бульбы

1 кг бульбы, 300 г ялавічыны, 120 г сала, 2 цыбуліны, соль, перац.

Палову бульбы абабраць, надраць на тарцы. Рэшту бульбы зварыць у лупінах, абабраць, прапусціць праз мясарубку, перамяшаць з сырой цёртай бульбай, пасаліць. Ялавічыну адварыць, прапусьціць праз мясарубку, зьмяшаць з падсмажанай цыбуляй, перцам і сольлю.

З бульбяной масы сфармаваць плоскія кружкі, пакласьці на сярэдзіну фарш, краі зашчыпаць, надаўшы зразам авальную форму. Абсмажыць з усіх бакоў на сале.

# Адмарожаны сьпёкай

## Ліпеньскія вершы з пленэру

**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ**

***

дзе выбухаюць новыя галерэі
дзе прарастаюць новыя альфавіты
дзе на квадратным мэтры па тры андрэі
і ты сярод іх ня самы юны й таленавіты

дзе з раніцы да заходу шыкоўным катамаранам
з усходу на захад па возеры дзень чарговы ідзе
ты сябе адчуваеш пакліканым і абраным
калі за катамаранам цягнесься па вадзе

калі купальскае сьвята пракатваецца бульдозэрам
па кожным радку і зьвіліне і толькі просіш: яшчэ б!
бо новая літаратура з усходу на захад возерам
плыве на катамаране а ты — маленькі прычэп

*Ліпень-2005, возера Дзевіна,*
*літаратурна-мастацкі пленэр*

***

цемра доўгачакана і неспадзеўна
будзе брысьці навобмацак і не памыліцца
падае
падае
падае сонца ў возера Дзевіна
падае стома з плеч і боль спаўзае з патыліцы

нехта б'е камароў а можа пляскае ў ладкі
цяжка думаць у цішы калі не гудзе кампутар
падае
падае
падае ноч на палаткі
падаюць
падаюць
падаюць людзі ўнутар

***

*«Дысцыпліну й расклад пільнаваў сталёвы працаголік*
*Андрэй Хадановіч, таму перакладчыцкая майстэрня*
*скончалася нават пры ліхтары».*
*«Наша Ніва», 15 ліпеня 2005*

таварыства ананімных працаголікаў якія сьпяць
дваццаць пяць гадзінаў за дзесяць содняў пленэру
таварыства жывых артыстаў у чыёй крыві семдзесят пяць
незабыўных працэнтаў беларускага блін этэру

таварыства што па-каралеўску працягвае шоў
і ўсе дзесяць содняў называе «соднямі» суткі
пад дыктоўку ветру аблокаў і мурашоў
вершаваныя бачыць сны
астатняе чуткі

таварыства дзеля якога месяц сярод начы
ў беларускім зорным этэры асьвечаны на тры чвэрці
таварыства якое ўсю ноч ня гасіць ліхтарыкаў каб змагчы



ІГАР МАРАЧКІН

асьвяціць і астатнюю чвэрць
астатнім чуткам ня верце

***

даўномінулыя рэчы прыходзяць у сны вар'яту
і згадкі грызуць сумленьне і памяць дзятлам дзяўбе
на гэтым сьвеце ўсё болей якаснага антыкварыяту
і меней і меней месца няякаснаму табе

ды ёсьць яшчэ сонца анфас і месяц зь цёмнага боку
а значыць будуць заплывы ў зьліві і будуць пленэры ў сьпёку
гадзіны прух і няпрух і вечны мастацкі рух
навобмацак да намётаў сябровак і проста падруг

і будуць новыя творцы ў вершах старанна якаць
палохаючы старанна зробленымі пачварынамі
а новы няякасны аўтар шукацьме такую якасьць
каб антыкварныя вершы зрабіліся ўрэшце кварнымі

***

веру ў прагнозы надвор'я і ўласнаму воку
ад смагі ня будзе адбою смазе ня скажаш адбой
нібы ў запой увaходжу ў дзесяцідзённую сьпёку
мінус надзея трапіць сюды з табой

зранку шаманю ганяю сухія хмары над галавою
часам закліньваю думку але заклінае рука
і хмары ідуць без канвою і вышываюць неба канвою
на ліпеньскіх краявідах знаёмага мастака

зь першага дня на галовы валіцца ліпень
саракаградусным сонцам але не здаюся бяз бою
веру што ў Вільні якраз пачынаецца лівень
і напаўзае на Трокі й спыняецца над табою

і я не магу заснуць адмарожаны сьпёкаю
гіпнатызуючы словы якіх табе не скажу
а ноч такая вялікая а ты такая далёкая
што падаесься літоўскаю кропляй дажджу

***

*Мне тут растлумачылі розьніцу*
*паміж словамі «званіць» і «тэлефанаваць».*
*Нельга патэлефанаваць у званы...*
*Дзяўчына Стася, валянтэр*

не патэлефануеш у звон казала знаёмая
у мабільнай сувязі зь небам усё па-старому
набіраеш нумар і слухаеш цішу (ё-маё)
безнадзейную нібы гета пасьля пагрому

у чыстым полі любая вестка будзе цікавай
і па зорах арыентуесься невідушчы
набіраеш нумар нібы гадаеш на кававай
гушчы

а сыгналы сплятаюцца звышгукавой ікебанай
і ня тоячы баязьлівасьці й недасьведчанасьці
балянсуеш на самай ускраіне самае занядбанай
тэрыторыі вечнасьці

і пакуль сарамлівы заход разгортваецца пунсова
ты разгойдваеш звон увушшу аглухлы дашчэнту
бы скідаючы паведамленьне на нумар часова
недаступнаму абанэнту

***

дзень ад сонца і траваў цяжкі й павохны
запамарока вось-вось расхістае зямную вось
зьлева і справа расчыненыя ўсе вокны
птушка магла б твой вагон праляцець наскрозь

церазь цябе хвіліны плывуць чаргою
паразуменьне са сьветам такое што проста жах
бо прыгажуня насупраць дрыгае доўгай нагою
у такт мэлёдыі што гучыць у цябе ў вушах

нават паверыў — жыцьцё нам яшчэ пасьпявае
дзён і начэй да халеры і шчасьце на нашым баку
ножка красуні за музыкай не пасьпявае
мажны бойфрэнд на калена паклаў руку

*10 ліпеня, электрычка Ворша—Менск,*
*вяртаньне з пленэру*

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Bobiatyński, Konrad. Od Smoleńska do Wilna. Wojna Rzeczypospolitej z Moskwą 1654—1655.** — Zabrze: Inforteditions, 2004.

**Kossarzecki, Krzysztof. Kampania roku 1660 na Litwie.** — Zabrze: Inforteditions, 2005. — 464 s.

[Бабятыньскі, Конрад. Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масквою ў 1654—1655 г.

Касажэцкі, Кшыштаф. Кампанія 1600 году ў Літве.]

Практычна адначасова ў Польшчы зьявіліся дзьве кнігі, прысьвечаныя адной тэме — вайне 1654—1667 гадоў на тэрыторыі ВКЛ. У беларускай гістарыяграфіі ўжо склаўся агульны вобраз той вайны — суцэльны разгром і татальная дэструкцыя. І сапраўды, ужо на другі год вайны расейскімі войскамі была занятая Вільня. Але калі на гэтым гісторыку спыніцца, то можна і надалей культываваць нацыянальную траўму. Бо быў яшчэ 1660 год, як піша Кшыштаф Касажэцкі, «…хіба што адзін з найшчасьлівейшых для Рэчы Паспалітай у цэлым такім бурлівым XVII ст.», хоць ніхто з сучасьнікаў гэтага не прадбачыў. Год 1660 пачынаўся для ВКЛ і ўсёй Рэчы Паспалітай як найгорш, а скончыўся тым, што ад сталіцы ды Берасьця вораг быў адкінуты да Дняпра і Дзьвіны.

**Кобец-Филимонова Е. Распятая Хатынь: Повесть-эссе.** — Мн.: Беллітфонд, 2005. — 236 с. 500 ас.

Пісьменьніца нібы вяртаецца ў маладосьць, калі яна, зладзіўшы ўласнае расьсьледаваньне падзей 1943 году, напісала пра Хатынь аповесьць для дзяцей. Шэраг дакумэнтаў публікуецца ўпершыню. Аўтарка даводзіць: частка віны за спаленьне вёскі ляжыць на партызанах. Яе кніга — эмацыйны, зьмястоўны аповед пра ахвяраў колішняга і сучаснага нацызму, пра фальсыфікатараў гісторыі. Адно што паленіка з догмамі, прынятымі ў БССР у 1970—1980-я гады, відавочна прыпазьнілася.

**Liedke, Marzena. Od prawosławia do katolicyzmu. Ruscy mażni i szlachta Wielkiego Księstwa Litewskiego wobec wyznań reformacyjnych.** — Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2004. — 313 s., mapa.

[Ледке, Мажэна. Ад праваслаўя да каталіцтва. Русіны-магнаты і шляхта Вялікага Княства Літоўскага ў дачыненьні да рэфармацыйных веравызнаньняў.]

Аўтарка прадставіла шырокую панараму ўдзелу князёў, магнатаў і шляхты ВКЛ праваслаўнага паходжаньня ў рэфармацыйным руху, выклаўшы прычыны іх пераходу ў XVI ст. да кальвінізму, сярод якіх выезд моладзі на вучобу ў замежныя ўнівэрсытэты, абмежаванае прававое становішча «грэцкай» Царквы ў ВКЛ, нежаданьне уніі з Польшчай. Да канца XVII ст. большасьць нашчадкаў тых «кальвінаў» парвала з Рэфармацыяй, але ў праваслаўе яны не вярнуліся, прыняўшы каталіцтва. Апроч таго, у адрозьненьне ад Заходняй Эўропы, дзе рэформа Царквы адбывалася пад лёзунгамі ўвядзеньня народнай мовы ў набажэнства, у ВКЛ у XVII ст. пратэстантызм спрычыніўся да пашырэньня пальшчызны. Увогуле, польскі гісторык зь нямецкім прозьвішчам даволі крытычна ацэньве вынікі Рэфармацыі — гэтага цікавага этыка-рэлігійнага і палітычнага фэномэну — у гісторыі Беларусі: «…праз пазбаўленьне русінскага этнасу палітычнай эліты Рэфармацыя, як адзін з чыньнікаў, мела моцны ўплыў на спазьненьне працэсу кшталтаваньня беларускай нацыянальнай сьвядомасьці Новага часу».

**Z dziejów kultury prawnej. Studia ofiarowane profesorowi Juliuszowi Bardachowi w 90-lecie urodzin.** — Warszawa: Liber, 2004. — 608 s.

[З гісторыі прававой культуры. Штудыі, прысьвечаныя прафэсару Юліюшу Бардаху з нагоды 90-годзьдзя нараджэньня.]

Кніга ўяўляе сабой зборнік артыкулаў, прысьвечаных розным аспэктам гісторыі юрыдычнай сыстэмы ВКЛ.

**Освобождённая Беларусь: документы и материалы.** В 2 кн. / Сост. В.И.Адамушко [и др.].

Кн. 1: Сентябрь 1943 — декабрь 1944. Мн., 2004. 398 с.

Кн. 2: Январь — декабрь 1945. Мн., 2005. 506 с.

**Urban, William. Krzyżacy: Historia działań militarnych** / Zangielskiego przełożył Eugeniusz Możejko. — Warszawa: Książka i Wiedza, 2005. — 376 s.

[Урбан, Уільям. Крыжакі: Ваенная гісторыя.]

Гэта пераклад працы амэрыканскага прафэсара, якая зьявілася ў 2003 годзе пад назваю «The Teutonic Knigts: A Military History». Апроч іншага, кніга сьведчыць, што сярод спэцыялістаў значна вырас уплыў літоўскай гістарыяграфіі, што адчуваецца нават у перадачы ўласных імёнаў. Так, беларуская Горадня, якая па-польску вядомая як Grodno, у дужачках пазначана паводле напісаньня арыгіналу — Gardinas (літоўская назва). Але з другога боку, беларускія прафэсійныя працы па названай тэме толькі ствараюцца.

**ADz, BP**

# Каханьне і сьмерць у мястэчку N.

**АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ**

Лічыцца, што мястэчка N. узьнікла вакол кірмашу. Але гэта ня так. Насамрэч каля кірмашу спачатку ўзьнік распусны дом, затым могілкі, і вось вакол іх ужо ўзьнікла мястэчка N.

Доктар Рамуальд Цывіс, аднак, настойвае ў сваіх газэтных нататках, што пасьля распуснага дому і перад могілкамі ўзьнік шпіталь, аднак гэта супярэчыць расказам старых людзей, што ў мястэчку N. хворых раней не лячылі, а адразу звозілі на могілкі і там душылі.

На велікодным тыдні пазалетась у мястэчку N. паказвалі аўтамабіль. Камэрсант Рыгор Тарасаў зь Вільні браў па чатыры капейкі за паказ і пускаў цікаўнага ў хляўчук, арандаваны ім у старасты Рамеснай вуліцы. У хлеўчуку было цёмна, таму наведнік мусіў стаяць, нічога ня бачачы, некалькі хвілін, покуль Рыгор апавядаў пра карысьць і цудадзействы аўтамабіля. Так, Рыгор называў аўтамабіль мэханічнай жывёлай з двума сэрцамі і папярэджваў, што праз аўтамабіль у душу чалавека можа пратачыцца д'ябал. Дзеля пераканаўчасьці, дарэчы, у хляўчук Рыгор загадзя запускаў чорнага пеўня. Потым камэрсант уключаў газьніцу і даваў памацаць мэталічны бок. Пасядзець у крэсьле побач з рулём каштавала дзесяць капеек, але на гэта згаджаліся ня ўсе. Дзяўчатам камэрсант задарма прапаноўваў прадэманстраваць, як працуе поршань. Пасьля таго як ён паказаў гэта дачцэ пана Самуйлёнка, а ўжо яна расказала маці, а тая пану Самуйлёнку, чацьвёра лёкаяў пана Самуйлёнка ў той жа дзень паказалі, як працуе поршань, самому камэрсанту Рыгору Тарасаву, пасьля чаго ён уцёк назад у Вільню. Аўтамабіль застаўся ў хлеўчуку старасты, паколькі ня мог езьдзіць, бо ня меў колаў і рухавіка.

У адрозьненьне ад астатніх кабет мястэчка, Марыля Крац апошнім часам навучылася адкладаць яйкі. У яе гэта атрымліваецца, кажуць некаторыя, пасьля таго, як яна ўцякла на тыдзень ад свайго Лаўрэна Краца з варшаўскім артыстам цырку.

Пра старызьніка Мікітку кажуць, што ён самы стары жыхар мястэчка N. і яшчэ засьпеў часы распуснага дому. Пра сваю маладосьць Мікітка памятае мала, кажа толькі, што пісаў лёзунгі для азадбаленьня вуліц. Яны былі кароткія.

«Маленькія кабеты заўсёды нарасхват!»

«Маленькія кабеты — самы зручны від кабет!»

Пані Альжбета, жонка пана Станіслава Д., пакахала доктара Рамуальда Цывіса, які звычайна ходзіць у зялёным пінжаку, і пэўны час не магла ў гэта паверыць сама. Доктар Цывіс ня ведаў пра гэтае каханьне, але зьмену ў паводзінах пані Альжбеты заўважыў і вырашыў, што пані Альжбета хоча, каб ён паглядзеў яе, як дактары ў вялікіх местах глядзяць пані. Застаўшыся дома адна, пані Альжбета запрасіла доктара Цывіса, выгнала з дому лёкаяў, наведала ванну, паліла сябе ружовай вадой і паставіла ў спачывальні вазоны з арабінай, бо падсьвядома адчувала, што доктара ўзбуджае чырвонае і круглае. Доктар прыйшоў у лёгкім хваляваньні і сказаў «Давайце адразу пяройдзем да справы, кладзіцеся». Пані Альжбета лягла, уся перапоўненая фантазіямі і лёгкай крыўдай за адсутнасьць пяшчотных і сарамлівых заляцаньняў, на якія яна магла б са спакойным сэрцам адмовіць. Доктар Цывіс упэўненым рухам задраў спадніцу пані Альжбеты і ледзь ня страціў прытомнасьць, бо пані Альжбета аказалася панам Станіславам і яго немагчыма было глядзець так, як дактары ў вялікіх местах глядзяць пані. Пан Станіслаў разьюшыўся і накінуўся на доктара Цывіса, каб яго пабіць. Справа ў тым, што ў пана Станіслава насамрэч не было жонкі, а значыць, і пані Альжбета не кахала доктара Цывіса, і тут была зусім памылка ва ўсім аповедзе.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Калядны сон панны Грузьнецкай Стэфаніі, дачкі пана Грузьнецкага Адама.

«Вялікае голае поле, на гэтым полі сяджу я на крэсьле, апусьціўшы вочы долу, і вышываю абрус, але зусім на яго не гляджу і торкаю іголкай, хутчэй, наўздагад, дзіва, што трапляю ў абрус, а ў гэты час побач стаіць Валянцін Фёдаравіч Смолькін, камэрсант зь Менску. Ён прапануе мне паглядзець недазволеныя фатаздымкі і чытае ўслых кніжку пра паноў і пані, якія зусім ня маюць сораму. Я адмаўляюся глядзець і слухаць. Настае вечар, па полі ляцяць сухія кляновыя лісты, трава гнецца, хмары спускаюцца ніжэй. Мне час ісьці ў спачывальню, таму я кажу Валянціну Фёдаравічу Смолькіну «да пабачэньня» і каб ён прыходзіў заўтра».

У ложку пані Далілы Старавойтавай, удавы егера Сьцяпана Старавойтава, толькі ў гэтым годзе памерлі трое мужчын. Кожны раз яны паміралі ў той самы момант, калі суцяшалі ўдаву па Сьцяпану Іванавічу Старавойтаву, які таямніча памёр у сваім шлюбным ложку васямнаццаць гадоў таму. Пані Даліла Старавойтава зусім не была патрабавальная да мужчын, таму нават для яе было загадкай, чаму ўсе яны паміраюць, калі маглі б яшчэ жыць. Першыя два разы ў гэтым годзе яна, каб не было залішніх размоваў, звозіла дохлых мужчын саматугам у ярочак за сваёй хатай і прыкідала вецьцем, а на трэці раз ня вытрымала і паклікала да сябе доктара Рамуальда Цывіса. У мінулым жа годзе ў яе ложку загінуў толькі Сава Маршалковіч, але тады пані Даліле ўдалося выдаць, нібы ён заглынуўся сьлінай на вуліцы перад хлебнай крамкай і ўжо напаўмёртвы падняўся да яе па дапамогу, аж нечакана памёр на

Маленькія кабеты заўсёды нарасхват.
Маленькія кабеты — самы зручны від кабет.

ложку. У якасьці доказу ў тым годзе пані Даліла прадстаўляла выпечку з сваёй крамкі на першым паверсе, што, у прынцыпе, прывяло да падвышэньня яе прыбытку ў наступныя два месяцы. Гэтым жа разам ёй прыйшлося апрануць апошняга мужчыну ў сурдут і выдаць за свайго жаніха, балазе яго ніхто ня ведаў у мястэчку. Доктар Цывіс узяўся ставіць дыягназ. Аднак пасьля апошняй няўдачы з пані Альжбетай ён разглядаў толькі няшчаснага мужчыну і зусім не разглядаў пані Далілу Старавойтаву, хоць і здагадваўся, што яна вельмі нездарма зьяўляецца гаспадыняй ложка, у якім гінуць мужчыны. Нарэшце невядомага жаніха ён афіцыйна засьведчыў, нібыта абсалютна дакладна можна меркаваць, што прычына сьмерці няшчаснага застаецца загадкай.

Пра старажытную каменную скульптуру на Гандлёвай вуліцы, каля кірмашу, старызьнік Мікітка расказвае, нібыта тут быў пакараны адсячэньнем мужчынскіх турбот сам Юда пасьля здрады. На гэтыя словы доктар Рамуальд Цывіс заўважае ў сваіх газэтных нататках, што Юда зусім не пазбываўся мужчынскіх турбот, а быў вісельнікам на таполі, і ёсьць вельмі яскравыя доказы, што менавіта тая самая таполя ніколі не памірае, а заўсёды жыве. Вось і цяпер яна расьце на паўднёвым ускрайку мястэчка зусім адна, і ніхто ня селіцца ні на ёй, ні пад ёй, ні замест яе. Наконт каменнай скульптуры на Гандлёвай вуліцы ў сваіх газэтных нататках доктар Цывіс не заўважае нічога, хоць у прыватных размовах і настойвае, што навукова слушнай назвай скульптуры будзе адно мала пашыранае ў мястэчку слова. Прызвычаіўшы гэтае слова да больш пашыраных, месьцічы не называлі далей скульптуру інакш, як Пень. Каля скульптуры аднойчы здарылася дзіва — адна салдатка пастаяла-пастаяла блізка і зацяжарала. Мужу ў войска былі адпраўлены афіцыйны ліст ад бацюшкі Анісіма прызнаць дзіця дзіўнанароджаным, прыняць у сям'ю, любіць і выхоўваць. Удзячная салдатка потым часта прыходзіла да бацюшкі Анісіма на малітвы, хоць іншыя кажуць — не часьцей, чым датуль.

**Таемна прагны да сьмерці, доктар Рамуальд Цывіс надоечы меркаваў наведаць Далілу Старавойтаву, удаву Сьцяпана Старавойтава, і ўжо быў дамовіўся зь ёю пра прыход уночы. Сьцярожка абмінаючы двары з асабліва чулымі сабакамі, ён наблізіўся да хаты пані Далілы, і прысеў каля ярочку за яе пло-**

**Працяг на старонцы 20.**



**Аляксей Бацюкоў** — выкладчык філязофіі, тэлежурналіст і празаік. Працуе ў Магілёве.

# Каханьне і сьмерць у мястэчку N

Працяг са старонкі 19.

там. Такое замілаваньне ахінула тут доктара Цывіса ад думкі, што нарэшце спазнае радасьць ад пані Далілы, што ён таропка расслабіўся пад плотам і нечакана захацеў жыць. Пані Даліла, аднак, зусім не пакрыўдзілася і прыняла яго назаўтра абедаць. Пасьля абеду яна чытала яму вершы, паказвала свае рукі і давала іх акуратна панюхаць. Вяртаючыся дамоў, доктар Цывіс пасьлізнуўся на прыступках і паламаў шыю, аднак памёр не адразу, а толькі пасьля таго, як старызьнік Мікітка адвёз яго на могілкі і там задушыў вяроўкай. Лаўрэн Крац, вось ужо трэці год як п'яніца, дапамагаў у гэтым Мікітку і назаўтра расказваў, што вельмі паважае старыя звычаі і любіць сваю родную зямельку, а на ёй лясы, азёры, палі, ураджай і людзей.

Цяжка хварэючы з інтымнае прычыны, бо ёй так больш і не прысьніўся калядны сон, панна Грузьнецкая Стэфанія, дачка пана Грузьнецкага Адама, днямі выдумала сабе, што зноўку бачыла жывога доктара Рамуальда Цывіса. Праз некалькі дзён месьцічы насамрэч заўважылі, што ў газэце усё яшчэ зьяўляюцца артыкулы пана Рамуальда пра паходжаньне назваў навакольных вёсак і пра сувязь паміж імем чалавека і яго характарам. Газэту, якую чыталі ў мястэчку N., выпісваў усяго адзін чалавек — аграном на пэнсіі Васіль Зубей, бо ў самой назьве газэты гаварылася пра ніву, а сельскай гаспадаркай ва ўсім мястэчку цікавіўся толькі ён.

Адразу за леташнімі Калядамі ў мястэчка N. прылятаў снарад і разрываўся ў гародах на паўночным ускрайку. Толькі пасьля гэтага месьцічы пачалі актыўна абмяркоўваць, што грукат за гарызонтам, які вось ужо амаль некалькі месяцаў быў добра чуваць, можа аказацца вайной. Раней на падобныя думкі прыгадвалі сур'ёзны аргумэнт — ніколі войскі з нашага боку не стаялі так доўга, а наадварот, заўсёды ўмелі дастаткова хутка і арганізавана адступаць. Пасьля выпадку са снарадам Васіль Зубей, як аграном на пэнсіі, пераканаў месьцічаў, што войска з нашага боку магло аказацца зарытым у акопы. На гэтыя словы старызьнік Мікітка пагадзіўся, маўляў, так, тут ужо якое адступленьне, тут ужо ляжы, дастань рукі ўгору і снарады лаві, а калі ня зловіш, то цябе — у акопчык бліжэйшы.

Апошняй зімой у мястэчку зьявіліся некалькі чалавек у ваенных шынялях без пагонаў. Зь імі быў кудлаты жыдок у скураной куртцы. Увесь дзень яны хадзілі па мястэчку, шукаючы то цэнтральную плошчу, то вазок, каб узьлезьці на яго і выступіць. Крыху пахадзіўшы па кірмашы, яны нарэшце ўбачылі зводдаль шынок Настасьсі Рык, дзе ўсе разам селі і выпілі на кіляграм карычневых маленькіх грошай. Назаўтра жыдка зь людзьмі ў шынялях у мястэчку ўжо не было. Затое муж шынкаркі Лявонці Рык, які выпіваў разам зь незнаёмымі людзьмі, назаўтра шмат лаяўся на пана Самуйлёнка, пана Грузьнецкага і яго сям'ю, на пана Станіслава Д. і на ўсіх іншых паноў і пані мястэчка, а пры канцы тыдня пафарбаваў старажытную скульптуру на Гандлёвай вуліцы ў чырвоны колер. Старызьнік Мікітка, убачыўшы скульптуру такой, прыгадаў, што за часамі распуснага дому яна таксама была пафарбаванаю, толькі тады чырвонай была адна макаўка. Лаўрэн Крац горача падтрымаў старызьніка Мікітку, хоць сам ён за часамі распуснага дому і ня жыў, але затое заўжды хадзіў разам зь Мікіткам.

У той самы год, увосень, жыдок у скураной куртцы і людзі ў шынялях былі ў мястэчку зноў. Яны адразу зайшлі ў шынок, дзе выклікалі Лявонція Рыка і правялі зь ім арганізацыйны сход. На ім яны станоўча ацанілі колер старажытнай каменнай скульптуры на Гандлёвай вуліцы і вынесьлі рашэньне да канца году расстраляць пана Самуйлёнка, пана Грузьнецкага і яго сям'ю, пана Станіслава Д. і іншых паноў і пані мястэчка. З гэтай нагоды Лявонцію Рыку быў уручаны рэвальвэр, а жыдок і незнаёмыя людзі ў шынялях назаўтра выпілі зноў і зьехалі. Лявонці, які на раніцу ўжо ня мог прыгадаць, нашто яму далі рэвальвэр, падарыў яго Даліле Старавойтавай, удаве Сьцяпана Старавойтава, — выключна дзеля таго, каб надалей было дакладна вядома, ад чаго паміраюць яе мужчыны.

Аднойчы Лявонці Рык ня вытрымаў і расказаў жонцы, што калі ў наступны раз прыедуць жыдок і незнаёмыя людзі ў шынялях, то ў мястэчку пабудуюць школу, разбураць царкву, а ў былым доміку доктара Рамуальда Цывіса зробяць лякарню, дзе людзям будуць вырываць зубы і адразаць рукі. Зразумеўшы, што яе Лявонці захварэў псыхічна, Настасься Рык паплакала праз адсутнасьць доктара Цывіса і пайшла да старызьніка Мікіткі.

Душачы Лявонція Рыка на могілках, старызьнік Мікітка вучыў Лаўрэна Краца, што ад чыстай вады, узятай напалам зь дзіцячай мачой і выпітай зранку, скура на целе мякчэе і лепей пахне, а за гэта вельмі паважаюць жанчыны.

Жыдок зь незнаёмымі людзьмі ў шынялях прыехаў даволі хутка, але зусім бяз школы і безь лякарні. Ён спытаў у шынку Лявонція Рыка, на што Настасься Рык, яго ўдава, заплакала і параіла ім пайсьці да Далілы Старавойтавай.

Уночы старызьнік Мікітка спаў трывожна: у доме Далілы Старавойтавай чуліся стрэлы, і ён разумеў, што прыйдзецца рана ўставаць назаўтра.

## АДАМ ГЛЁБУС



# Сучасьнікі

### 1993. Сыс і Бог

П'ю з паэтам Сысом. Напіваемся. «Каб зараз прыйшоў сам Бог, дык заўтра мы ня ўспомнім, што ён прыходзіў!» — кажа нехта з нас. «Успомнім, ён — запамінальны!» — нехта некаму пярэчыць. Праз некалькі дзён пытаюся ў Сыса: «Памятаеш, мы пілі, і нехта сказаў, што каб да нас завітаў Бог, дык мы б нараніцу пра яго і не згадалі б?..» «Памятаю…» — «Хто гэта сказаў?» — «Ня помню». — «І я ня памятаю…»

*1.07.2005, 12:03*

### 1978. Данцыг і скрыні

Мастак-урбаніст Май Данцыг запрасіў мяне дапамагчы зь пераездам у новую майстэрню. Студэнт выкладчыку не адмаўляе. Панасілі мы тады да пацягалі… Самае цяжкае было — завалачы на чацьвёрты паверх чыгунную печку-буржуйку. Затарабанілі. Рукі папабівалі, але рэвалюцыйная рэч заняла пачэснае месца ў прасторнай майстэрні. Акрамя буржуйкі мяне ўразіла Данцыгава схільнасьць набываць адразу шмат рэчаў. Фарбы ён купляў ня тубікамі, а каробкамі, кансэрвы — не бляшанкамі, а скрынямі, палатно — ня мэтрамі, а рулёнамі… Так, тубікі, бляшанкі і мэтры палатна абыходзіліся крышку таньней. Але ў мяне ўзьнікла пытаньне: нашто аднаму чалавеку столькі рэчаў? Склалася ўражаньне, што Данцыг зьбіраецца жыць за 10 чалавек. Працаваў Данцыг імпэтна, але ж не за 10 мастакоў і нават не за трох. Колькі я ні спрабаваў зразумець гэткае зьбіраньне і назапашваньне сродкаў для існаваньня, а так і не зразумеў. Вядома, разьлічыць патрэбы складана, але і лішак ня мусіць на парадак пераўзыходзіць разумную неабходнасьць. На мой розум, хай крыху ня хопіць нейкага прадукту, чым ён сапсуецца ў цябе нявыкарыстаным.

*19.06.2005, 13:59*

### 2004. Зьміцер і станаўленьне

Бацька да Зьмітра: «Дім, ты пасматры, все тваі аднакласьнікі сталі людзьмі. Вот Саша «МАЗамі» торгует, стал бізнэсмэнам, стал челавекам… Ты, Дім, кем стал? Ты, Дім, стал беларусам».

*10.06.2005, 15:40*

### 2005. сУчасьнік і сьвятло

Іду праз натоўп. Час пік. Ты крочыш мне насустрач. Я палю цыгарэту, іду з чырвоным агеньчыкам. Мы набліжаемся. Ты ня ведаеш пра наканаванасьць нашае сустрэчы, бо ня ўмееш зазіраць у будучыню. У цябе два вокі, але ты глядзіш і ня бачыш нікога акрамя сябе. Такім, як ты, трэба біць малатком па кадыку. Трэба размахвацца і лупіць па адамавым яблыку так, каб малаток увагнаў кадык да хрыбетніка, а пазванок выскачыў з-пад чэрапа. Толькі ў мяне няма з сабою малатка, таму я затушваю цыгарэту ў тваім воку. Табе, каб любавацца сабою, дастаткова і аднаго вока. Цяпер ты — аднавокі Люцыпар. Хай будзе сьвятло ў тваім непатушаным воку. Хай будзе сьвятло, у якім ты, нарэшце, убачыш уласную выродлівасьць і нікчэмнасьць.

*26.05.2005, 11:39*

# Знакі прыпынку



## УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ

* * *

Салжаніцын піша ў «Расеі ў абвале»:

«Расея зламаная ня толькі духоўна, яна падарваная і цялесна… Каб XXI стагодзьдзе ня стала апошнім для расейцаў — мы павінны знайсьці ў сабе сілы і ўменьне супрацьстаяць распаду ўжо цяпер…» І тут жа задаецца пытаньнем: «Але ці дазволіць нам гэта наш нацыянальны характар?..»

Далей выходзіць, што не дазволіць. Ранейшы (характар стараверау) дазволіў бы, а сёньняшні — не… Эвалюцыя нацыянальнага характару настолькі Салжаніцына страшыць, што ён пачынае сьцьвярджаць, быццам «расейскі характар» трох апошніх стагодзьдзяў, пачынаючы з часоў смуты і расколу, гэта зусім і не расейскі характар, а ягонае скажэньне — зноў жа праз смуту і раскол. Нібы смута і раскол неяк абабеглі нацыянальны характар па баках і аказаліся ў яго наперадзе.

* * *

Пачалася і скончылася вайна ў Іраку… Наладжаная амэрыканцамі як сусьветнае тэлешоў. Больш сучасна — як кампутарная гульня. Толькі з сапраўднымі танкамі, ракетамі, самалётамі — і з жывымі людзьмі. Сядзі ўтульненька і гуляй. Гэтага заб'ю, гэтага не…

Чалавецтва набывае іншую, новую якасьць… Якую пакуль не асэнсаваць.

Расчараваньне ад арабаў… Як у «Белым сонцы пустыні» чырвонаармеец Сухаў казаў: «Я на цябе разьлічваў, Саід».

А ў іх не адзін самалёт не ўзьляцеў. Нібы нафты — заліся, а газы няма…

А як жа «сьвяшчэнная вайна» зь няверными?.. Ці яна — толькі жанчын зь дзецьмі дзе заўгодна падрываць? А калі армія, дык сядзець і *траву* курыць?..

Нейкі студэнт з Аману, іракці, сказаў у інтэрвію амэрыканцам: «Як спалі, так няхай бы спалі — дарма вы іх пабудзілі».

Помнік Хусэйнаў скідалі, а ён зачапіўся — і вісіць… Галавой уніз ківаецца… Ня ўсё так проста.

Але цяпер усе за амэрыканцаў. Пераможцы. Як сказалі — так зрабілі. «Зьверглі тырана. Зьнішчылі рэжым. Свабода, дэмакратыя…» Якая на ўсходзе можа быць дэмакратыя? Дзе вы яе ў Аўганістане зладзілі?..

А ў газэце «Гардыян» за 27 сакавіка, мне Ева (дачка) паказала, яна яе глядзіць, на першай паласе ўнізе пад фатаздымкам, на якім іракцы прыкрываюць анучай зьнявечаны твар забітага амэрыканскай бомбай суайчыньніка, рэклямны дэвіз («слоган») аўстралійскай нейкай фірмы:

«Сьвет зьмяняецца — зьменімся зь ім».

## Уладзімер Арлоў. «Час чумы»




Кнігу склалі выбраныя гістарычныя творы, у ліку якіх аповесьці «Час чумы», «Сны імпэратара» і «Дзень, калі ўпала страла». У зборніку чытач сустрэне таксама скандальнае апавяданьне «Ордэн Белай Мышы», пасьля якога выдавецкі чыноўнік паабяцаў, што цяпер Арлова ў дзяржаўных выдавецтвах ня будуць друкаваць дзесяць гадоў. Цікава, адкуль ён ведае, што менавіта дзесяць?

**Даведкі пра набыцьцё праз тэлефон 463-57-33, e-mail: exlibris@tut.by.**

# Хутчэй ці трапней?



Вось дылема сучаснага баскетболу. Сёлетні тактычна дасканалы фінал НБА паміж «Сан-Антоніё Сьпёрз» і «Дэтройт Пістанз» (першая каманда выйграла 4:3) можа завяршыць чарговую эру ў гісторыі найлепшай баскетбольнай лігі сьвету. Піша «Газэта выборча».

Неардынарная канцоўка сэзону і першыя за адзінаццаць год усе сем матчаў фіналу абвастрылі апэтыты аматараў баскетболу. Ці ўтрымаюць пазыцыі «Сьпёрз» і «Пістанз»? Выглядае на тое, што дзьве безумоўна найлепшыя каманды НБА з п'едэсталу ня дзенуцца. Чэмпіёны з Сан-Антоніё маюць вельмі малады склад, у якім Робэрт Оры і Брус Боўэн, якія набліжаюцца да канца кар'еры (хоць, магчыма, затрымаюцца яшчэ, прынамсі, на год), адыгрываюць толькі ролі другога пляну. Тыму Данкану ўсяго 29 год, Ману Жынобілі на год менш, а Тоні Паркер — сапраўдны малакасос (23 гады). Такі склад можа прынесьці камандзе Сан-Антоніё яшчэ шмат добрых сэзонаў, бо галоўны архітэктар посьпеху «Сьпёрз», трэнэр Грэг Попавіч, таксама нікуды не зьбіраецца сыходзіць. Тое самае можна сказаць пра трэнэра Лары Браўна з «Дэтройт Пістанз», хоць яму ўжо 65 год і клянірован) Шакіл О'Ніл. Ці захоча 33-гадовы форвард надалей змагацца з уласным целам, каб падтрымаць непераўзыдзенага Дуайна Ўэйда? У сваю чаргу, у «Фінікс Санз» могуць паўтарыць памылку «Сакрамэнта Кінгс», зробленую некалькі год таму. Тады ў «Кінгс» мелі неардынарную каманду з уласным стылем, справы якой ішлі ўгару, а посьпехі грунтаваліся на майстэрскіх пасах Уладэ Дзіваца, Джэйсана Ўільямза, Крыса Вэбэра, абароне Дага Крысьці і кідках Прэдрага Стаякавіча. Каманда ішла да фіналу, але пачаліся замены «добрага на лепшае», і цяпер каманда ледзьве трапляе ў плэй-оф. У «Санз» сёлета дзякуючы прыходу Стыва Нэша і апантанай гульні Амары Стадмайера пад кошыкам, а таксама некалькіх гульцоў на флянгах, таксама быў свой стыль і выдатны вынік (62:20 у рэгулярным чэмпіянаце і выход у фінал Захаду). Але замест таго, каб узнікае са складу фіналу — па-ранейшаму трыюмфуе канцэпцыя камандаў, у якіх калі і ёсьць зоркі, то такія, якія ідуць строга ў нагу з тактыкай трэнэраў. Гульня абапіраецца на абарону, а калі мяч здабываецца, то далей дзеяньні зь ім вельмі спакойныя, павольныя, дакладныя і разважлівыя, заснаваныя на пошуку сваіх пераваг. Так гулялі «Сьпёрз», так гулялі «Пістанз». Аднак ці не прайграе школа трэнэраў Лары Браўна і Грэга Попавіча ў змаганьні з хуткасьцю і рызыкай у выкананьні «Санз»? Убачым.

Такіх Джорданаў ужо няма. Так ці інакш, асьляпляльнае фіяска церпіць канцэпцыя будаваньня складоў камандаў вакол «найлепшых Майклаў Джорданаў», якімі ў 1990-я гады стракацелі рады НБА. Амаль усе яны ў гэтым сэзоне апынуліся па-за плэй-оф, што толькі пацьвярджае, што Майкл Джордан быў адзіны і непаўторны (хоць і меў каля сябе Скоці Піпэна).

лывала на выніку «Мінэсоты» і каштавала пасады трэнэру Фліпу Сандэрсу. Цяпер у Мінэапалісе пакрысе пачынаюць усё спачатку, але з самым, бадай, усебаковым гульцом лігі (Гарнэтам) ім можа быць крыху лягчэй. Аднак ягоны лёс у параўнаньні з таксама дваццацідзевяцігадовым Тымам Данканам (тры чэмпіёнскія тытулы) дэманструе, як важна трапіць у патрэбны клюб, які здолее збудаваць каманду вакол зоркі. Кіраўнік «Сьпёрз» зьездзіў у Эўропу і абкружыў Данкана добрымі памочнікамі (Жынобілі, Паркер, Оры, Боўэн), а кіраўнік «Ваўкоў» здолеў даць у дапамогу Гарнэту толькі таленавітых буркуноў. Вынікі мелі значэньне для ўсёй лігі. Можа, дзякуючы посьпеху Жынобілі ў НБА нарэшце трапіць таксама трохразовы чэмпіён Эўралігі літовец Шарунас Ясікявічус, на якога цяпер усе глядзяць інакш і не сьмяюцца ўжо зь ягоных фінансавых апэтыпат пра здароўе прымушае задумацца аб пэнсіі. Два гады запар Дэтройт двойчы даходзіў да фіналу, і цяпер усіх цікавіць, ці застанецца ўсімі паважаны трэнэр на пасадзе. Гэта можа адыграць вызначальную ролю, бо іншага такога аўтарытэта (да таго ж ня зьвязанага зь іншым клюбам) у НБА яшчэ трэба пашукаць. Дый ці здолее нехта іншы ўтрымаць у руках Бэна і Рашыда Ўолесаў ці Чонсі Білапса, а таксама віртуозна выкарыстаць здольнасьці Рычарда Гамільтана і Тайшона Прынса? Усе яны, таксама як і члены «Сан-Антоніё Сьпёрз», яшчэ адносна маладыя (найстарэйшым сярод пералічаных Уолесам па 31 годзе) і некалькі гадоў могуць гуляць на найвышэйшым узроўні. Для Браўнавага наступніка ключавой можа стацца праца з маладымі талентамі, якія ў «Пістанз» ужо ёсьць. Высокі Дарка Мілічыч, аргентынец Карляс Дэльфіна і пуэртарыканец Карляс Ароё не атрымалі шанцаў ад Браўна, а зь імі пэрспэктывы «Пістанз» маглі б быць яшчэ лепшымі.

## Паскарэньне сонцаў

Затое ў паўфіналістаў (у эўрапейскім разуменьні, бо для амэрыканцаў гэта фіналісты канфэрэнцыі) будучыня цьмяная. У «Маямі Гіт» найбольш будзе залежаць ад формы (ці ад матывацыі да трэмацняць каманду, было вырашана замяніць Квэнтына Рычардсана на Курта Томаса. Такім чынам, замест унікальнай нізкай пяцёркі выйдзе клясычны склад з дзьвюма высокімі і... стыль «Санз» напэўна зьнікне. Ці будзе гэта найлепшая каманда? Менавіта стыль, узорам якога былі «Санз» і некалькі іншых камандаў, можа быць новым трэндам у НБА. Заўзятары хочуць назіраць за камандамі, якія дэманструюць модныя перадачы, цешаць вока хуткімі контратакамі, якія так цудоўна праводзіць Стыў Нэш, прызнаны найкаштоўнейшым гульцом сэзону. Да такіх камандаў належаць яшчэ «Сыэтл Супэрсонікс», у некаторым сэнсе «Нью-Джэрзі Нэтс». Калі нейкая з гэтых камандаў правевецца ў фінал, гэта можа азначаць пасьлядоўную тэндэнцыю. Як некалькі год таму ўсе хацелі паўтараць у гульні «трохвугольнік» трэнэра Філа Джэксана, так цяпер усе хочуць бегаць як «Санз». Што, зрэшты (і на што варта зьвярнуць увагу), мае няшмат агульнага з імправізацыяй і свабодай у дзеяньнях спартсмэнаў. Гульню на контратаках і трохэтапныя кідковыя манэўры таксама трэба адпрацаваць на трэніроўках, а таму тытул трэнэра году за такую канцэпцыю гульні справядліва атрымаў Майк Д'Энтані з «Санз». Сёньня, аднак, — што вывварта пералічыць прозьвішчы.

**Кобі Браянт** — без Шакіла О'Ніла пабач апынуўся па-за плэй-оф.

**Трэйсі Макгрэдзі** — увайшоў у плэй-оф з «Х'юстан Рокетс», але, нягледзячы на знакамітага Яо Міна ў напарніках, не прайшоў нават першага раўнду.

**Грант Гіл** — вярнуўся пасьля цяжкай траўмы, гуляў нядрэнна, але на Ўсходзе яго «Арланда Мэджык» (са Стывэнам Фрэнсісам) таксама былі за межамі плэй-оф.

**Вінз Картэр** — у «Таронта Рэптарз» (пачатак сэзону) была проста бяда, але і ў «Нью-Джэрзі Нэтс» разам з Джэйсанам Кідам ледзьве ўвайшлі ў плэй-оф і хутка адтуль выйшлі.

## Клопат «Ваўкоў»

Найбольш яскравым няўдачнікам сэзону сталася, аднак, каманда «Мінэсота Тымбэрвулвс» з MVP мінулага году Кевінам Гарнэтам на чале. «Ваўкі» ня трапілі нават у плэй-оф, а між тым годам раней былі блізкія да фіналу. Але аказалася, што баскетбалісты з «фатальнымі» характарамі — Лэтрэл Спруэл і Сэм Касэль — здольныя развaліць любую каманду зь сярэдзіны. Нягледзячы на праблемны ўзрост (адпаведна 34 і 36 год), абодва надалей лічацца незаменнымі, што паўптаў (сама меней 10 млн даляраў за тры гады кантракту). Кажуць, што вось-вось гульца з «Макабі» (Тэль-Авіў) пераманіць «Індыяна Пэйсэрз».

## Герой сэзону

Стаўся ім напэўна Робэрт Оры. Трыццаціпяцігадовы флянгавы «Сан-Антоніё Сьпёрз» некалі павінен быў стаць другім Скоці Піпэнам, але замест універсальнага чэмпіёна атак і контратак зь яго выйшаў выдатны чорнарабочы ў абароне і кіданьні найважнейшых троек. Так зноў было ў фінале, у ключавым пятым матчы, калі «Біг Шот Роб» здабыў 21 пункт у апошнія 15 хвілін матчу і овэртайме. Трэнэр Грэг Попавіч мог бы сабой ганарыцца: цэлы сэзон ён бярог Оры, ведаючы, што яго каштоўнасьць узрастае ў плэй-оф, а асабліва ў фінале. Так і сталася. Хоры здабыў такім спосабам свой шосты чэмпіёнскі тытул, здагнаўшы такіх зорак, як Майкл Джордан ці Карым Абдул-Джабар! Раней ён выйграваў у 1994 і 1995 гадах з «Х'юстан Рокетс», а таксама ў 2000—2002 гадах з «Лос-Анджэлес Лэйкерз». Больш чэмпіёнскіх тытулаў толькі ў баскетбалістаў «Бостан Сэлтыкс», якія ў 1950—1960 гадах заваявалі 11 чэмпіёнскіх тытулаў за 13 год.

# СПОРТ СЬЦІСЛА

### Першы гол Глеба

Паўабаронца зборнай Беларусі Аляксандар Глеб забіў першы гол за лёнданскі «Арсэнал». Адбылося гэта ў мінулыя выходныя ў кантрольным матчы з клюбам трэцяга дывізіёну «Барнэт». «Кананіры» выйгралі зь лікам 4:1. Глеб адкрыў лік у матчы. Вызначыліся ў пераможцаў таксама «дзяды» клюбу Т'еры Анры і Дэніс Бэргкамп.

7 жніўня ў Кардыфе (Уэльз) «Арсэнал» згуляе за супэркубак Англіі з «Чэлсі». Чэмпіянат ангельскай прэм'ерлігі стартуе 13 жніўня. У першым туры лёнданцы 14 жніўня дома на стадыёне «Гайбэры» згуляюць з «Ньюкаслам», а 20 жніўня на стадыёне «Стэмфард Брыдж» — зноў з «Чэлсі». Ня выключана, што ўсе паядынкі будуць трансьляваць у жывым этэры ў менскіх барах і клюбах.

### Палова чэмпіянату

У аўторак скончыўся першы круг футбольнага чэмпіянату Беларусі ў вышэйшай лізе. «Летнім» чэмпіёнам стаў салігорскі «Шахтар»: у гадаванцаў Юр'я Вяргейчыка 31 бал. Другое месца ў магілёўскага «Дняпра-Трансмашу» (24 балы). У запісных аўтсайдэрах ходзяць двухразовы чэмпіён Беларусі мазырская «Славія» (9 балаў) і менская «Зорка-ВА-БДУ» (2 балы). Другі круг стартуе 30 ліпеня і завершыць бег 5 лістапада.

### Ці паедзе Хацкевіч у Шкоцыю

Экс-паўабаронца зборнай Беларусі і кіеўскага «Дынама» Аляксандар Хацкевіч згуляў за шатляндзкі «Хартс» у кантрольным матчы і, магчыма, падпіша кантракт. Праўда, каб бесьперашкодна атрымаць працоўную візу на брытанскіх выспах, трэба мець 75 адсоткаў матчаў, праведзеных за нацыянальную зборную цягам апошніх двух гадоў. А тут у Хацкевіча праблемы. Таму пытаньне будзе разглядацца асобна.

Зь лютага Аляксандар выступаў за латвійскі «Вэнтсьпілз», але праз фінансавыя цяжкасьці пакінуў клюб. Нагадаем, што «Хартс» разам зь менскім МТЗ-РІПА і «Каўнасам» утвараюць холдынг літоўскага бізнэсоўца Ўладзімера Раманава.

### Беларусы — дзясятыя

Пасьля матчаў 1/4 фіналу тэніснага Кубку Дэвіса, што прайшлі ў мінулыя выходныя, выдрукаваны новы рэйтынг-ліст зборных. Беларусы, якія не праводзілі гульняў, пасунуліся з восьмага на дзясятае месца. Першае месца ў зборнай Гішпаніі.

23—25 верасьня зборная Беларусі згуляе са зборнай Канады матч плэй-оф за права выхаду ў Асноўную групу Кубку Дэвіса, так званую 1/8 фіналу. Матчы пройдуць у самым беларускім горадзе Краіны кляновага ліста — Таронта.

### Аляксандраў — пераможца

18 ліпеня ў Менску завершыўся міжнародны шахматны турнір «Інаўтамаркет-оўпэн» — Адкрыты чэмпіянат Менску. Пераможцам стаў беларускі гросмайстар Аляксей Аляксандраў, што набраў 7,5 бала ў дзевяці турах. Усяго ў турніры бралі ўдзел 156 шахматыстаў з васьмі краін.

**AP, belapan.com, football.by**

ІНФАРМАТАР

# Страхавыя кампаніі Менску



**«АльВэНа»**
вул.Маякоўскага, 14
221–44–21, 210–28–36

**«Багач»**
вул.М.Лынькова, 19/1
250–84–77 (–78)

**«Басо»**
вул.Піянэрская, 2а
250–39–82 (–84)

**Беларускі народны страхавы пэнсійны фонд**
Вайсковы зав., 12–406
283–19–08, 283–15–70

**Беларускае бюро па транспартным страхаваньні**
вул.Кальварыйская, 1–207
200–93–55, 229–50–48

**Беларускае страхавое прадпрыемства**
вул.К.Лібкнэхта, 70
259–10–21

**«БелБрыт»**
вул.А.Кашавога, 3
230–21–16

**«Белдзяржстрах»**
вул.Ракаўская, 16
200–06–56 (–04)

**«Белзьнешстрах»**
вул.Скрыганава, 6
209–25–46, 209–24–16

**«Беліндзяржстрах»**
вул.Мясьнікова, 40
223–58–78, 217–84–29, 217–84–19

**«Белкаапстрах»**
пр.Машэрава, 17–807, 809, 821
226–78–91

**«Белнафтастрах»**
пр.Машэрава, 23–1
203–24–55

**«Белстрахінвэст»**
вул.Сурганава, 27
231–25–00, 231–23–36

**«Бі энд Бі іншурэнз Ко»**
вул.Я.Коласа, 38
211–30–58

**«Бролі»**
вул.Ульянаўская, 31
222–48–80/47–48/47–46

**«Вэст»**
вул.Мяржынскага, 4
222–88–40

**«Кентаўр»**
пр.Ф.Скарыны, 172
285–92–62

**«Купала»**
1–шы Ізмайлаўскі зав., 51/ 3
237–16–39, ф. 237–11–59

**«ПромТрансІнвэст»**
вул.Варанянскага, 7а
222–77–31, 227–26–83

**«Расток»**
вул.Астрашыцкая, 12
286–62–49

**«Салямандра»**
вул.Валадарскага, 12
227–17–70

**«Слаўнафтагаз»**
(часова не працуе)
вул.Прытыцкага, 60/1–217
255–75–00

**«СлаўПоліс»**
вул.Сярова, 1–325
278–13–24/65–94/65–93

**«СтрахЭкспэрт Груп»**
вул.Сурганава, 27
202–00–87

**«Таск»**
пр.Ф.Скарыны, 58/9
225–11–24, 225–08–59

КАІСА

# І вечная вясна…

Турнір «Інаўтамаркет–оўпэн» — рэінкарнацыя колішняй «Менскай вясны» — стартаваў 9 ліпеня ў Цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі. Арганізацыйны сход выявіў паўтары сотні ўдзельнікаў — «гросаў», майстроў і проста аматараў «Каісы». Акрамя беларусаў, у змаганьне за прызавы фонд уключыліся ўкраінцы, расейцы, казахі, таджыцкі гросмайстар Фарух Аманатаў і дзяўчына–амэрыканка Ірына Зянюк. 18 ліпеня першым да фінішу прыйшоў беларус Аляксей Аляксандраў.

Імпрэзу ашчасьлівіў прысутнасьцю экс–чэмпіён сьвету Барыс Спаскі. 11 ліпеня ён таксама даў сэанс адначасовай гульні ў СДЮШАР–11. Рэдактар папулярнай маскоўскай газэты «Шахматная неделя» — постаць супярэчлівая, і напярэдадні сэансу шахматысты–габрэі з «Хэсэду» жадалі зладзіць яму абструкцыю за ліст, у якім Спаскі патрабаваў закрыцьця яўрэйскіх арганізацый у Расеі. Але ня зладзілі. Сэанс скончыўся перамогай Спаскага на 11 дошках з 16. Супраць Алега Мядзьведзева «кароль Барыс», зьбянтэжаны сілай хлапца, сеў гуляць сам–насам і давёў–такі яго да сьлёз.

У пачатку ліпеня ў сталіцы прайшоў і традыцыйны, чацьвёрты па ліку, мэмарыял Гаўрылы Верасава, упэўнена выйграны міжнародным майстрам Юр'ем Ціханавым (7,5 з 9). Другое месца — у Ігара Ратковіча, трэцяе — у чэмпіёна Магілёва 16–гадовага Алега Кіслова (па 7 балаў). Пераможцам дасталіся грашовыя прызы — сёлета істотна павялічаныя.

У чэрвені Магілёў прытуліў VI міжнародны турнір на прызы гросмайстра Фёдарава, дзе гулялі дзіцячыя каманды зь Беларусі, Расеі, Латвіі. Гэтым разам дняпроўскімі набярэжнымі любавалася як ніколі багата юных шахматыстаў. Другі год запар першымі выйшлі школьнікі з Калінкавіч. У гэтым палескім горадзе яшчэ з савецкіх часоў дзейнічае ўзорна–паказальны шахматны клюб, і вынікі здаюцца нам натуральнымі: дзе дбаюць, там і маюць.

### Шахматыст у Кангрэсе

44–гадовы Алесь Станішэўскі, шахматны трэнэр Фізкультурна–аздараўленчага цэнтру, што на вул. Бурдэйнага ў Менску, будзе прадстаўляць Фрунзэнскі раён на Кангрэсе дэмакратычных сілаў. Так вырашылі ўдзельнікі сходу 14 ліпеня.

Сп. Станішэўскі вядомы тым, што навучае дзяцей правілам шахмат па–беларуску.

Поглядам акінуўшы шлях, заўважым чэмпіянат Эўропы сярод шахматыстаў з абмежаванымі магчымасьцямі. Ён завяршыўся пару месяцаў таму ў польскай Вісьле, аднак ня быў агледжаны ў беларускіх друкаваных выданьнях. Андрэй Сьвятоха, інжынэр–праграміст з Горадні, якому 35 год, заваяваў бронзавы мэдаль, апярэдзіўшы мэтраў з вышэйшым рэйтынгам. Сп.Андрэй — неадназовы пераможца спаборніцтваў краіны сярод інвалідаў, дасьціпны суразмоўнік і камэнтатар сваіх партый. Ён пасьпяхова выступае і ў змаганьнях «здаровых» шахматыстаў. У наступнай партыі на 10–м ходзе беларускі гулец ужыў навінку — слон з f6 мeўся ціснуць на d4… І «каменная сьцяна» ўстаяла, нягледзячы на ўварваньне ў лягер чорных чужой туры.

**ВР**

Аборнеў (Расея) — Сьвятоха (Беларусь). Белавежа, 2003.

1. d4 e6 2. c4 f5 3. Kc3 Kf6 4. Kf3 d5 5. Cf4 c6 6. e3 Ce7 7. Cd3 0–0 8. 0–0 Ke4 9. Фc2 Kd7 10. h3 Cf6!? 11. Kd2 Фe7 12. f3 Kd2 13. Фd2 Kph8 (калі 13...e5 14. de Ce5 15. Ce5 Фe5 16. cd, то ў чорных кепскі слон і слабая пешка) 14. cd ed 15. Tae1 Kb6 16. g4!? g6 17. Фh2 Te8 18. Фc2 Kc4 19. b3 Kd6 20. Ka4 Tg8?! 21. Фc5 Kf7 22. Фe7 Ce7 23. e4 Cb4 24. ed! Ce1 25. Te1 cd 26. Te7 Kpg7 27. Ce5+ Kpf8 28. Cf6 g5 29. Tc7 Tg6 30. Ce7+ Kpg8 31. gf?! (пасьля 31. Kc3 Tc6 32. Kd5 fg 33. fg Tc7 34. Kc7 чорныя яшчэ павінны біцца за нічыю. Цяпер разьмены непазьбежныя) 31...Tc6 32. Tc6 bc 33. Kc5 Kh6 34. Ke6 Ce6 35. fe Te8 36. Cg5 Te6 37. Kpf2 Kf7 38. Cf4 Нічыя. (*Заўвагі кандыдата ў майстры А.Сьвятохі*).



**Як бы вы згулялі?**

У.Раманаў — Ю.Ціханаў. Менск, 2005. Белыя атакуюць. Працягніце атаку.

Адказ: 1. Kg5+! Kpg8 2. Kf6+ Cf6 3. Te8+ Kpg7 4. Cf8+, і віцэ–чэмпіён краіны паціснуў руку 15–гадоваму кандыдату ў майстры з Воршы (мат непазьбежны).

ВАРТА БАЧЫЦЬ

## Чацьвер, 21 ліпеня

**«Лад», 22.10**

«Палкоўнік Рэдль» — 1–ая сэрыя.

Вугоршчына—Францыя—Нямеччына, 1984, рэж. Іштван Саба.

Гістарычная драма, псыхалягічны дэтэктыў паводле п'есы Джона Осбарна.

Напярэдадні Першай сусьветнай вайны кіраўнік контраразьведкі Аўстра-Вугоршчыны палкоўнік Рэдль, які зь ніадкуль узьнёсься да вяршыняў імпэрыі, быў выкрыты як здраднік і зрабіў сабе сьмерць. Асоба Рэдля здаўна прыцягвала ўвагу — і рэжысэр Іштван Саба даў сваё тлумачэньне загонным учынкам.

Разам з карцінамі «Ханусэн» і «Мэфіста» «Палкоўнік Рэдль» складае трылёгію Саба пра чалавека і ўладу, канфармізм і бязвольнасьць. Трылёгія ўвайшла ў залатую скарбонку сусьветнага кіно.

У ролі палкоўніка Рэдля — Клаўс Марыя Брандаўэр. Фільм атрымаў прыз журы ў Канах, адмысловы прыз МКФ у Вальядалідзе, прыз Брытанскай акадэміі як найлепшая замежная карціна.

## Субота, 23 ліпеня

**СТВ, 14.40**

«Сабачае сэрца».

Расея, 1988, рэж. Уладзімер Бартко.

Фантастычная драма, прыпавесьць-сатыра паводле аднайменнага твору Міхаіла Булгакава.

Рэдкі прыклад у кіно, калі экранізацыя ні ў чым не саступае арыгіналу. Прафэсар Праабражэнскі ў Савецкай Расеіператварае сабаку ў чалавека, але ў былога Шарыка застаецца сабачае і пралетарскае сэрца.

Яўген Еўсьцігнееў абсалютна геніяльны ў ролі прафэсара, Барыс Плотнікаў («Узыходжаньне», «Дзікае паляваньне караля Стаха») выдатна грае доктара Бармэнталя, а выбар Уладзімера Талаконікава на ролю Шарыкава — абсалютна трапнае патрападаньне. Сярод эпізадычных пэрсанажаў вельмі пасуюць карціне такія, як Швондэр (Раман Карцаў).

Гран-пры кінафэстывалю ў Пэруджы.

**«Лад», 18.00**

«Чорны Арфэй».

Францыя—Бразілія—Італія, 1959, рэж. Марсэль Камю.

Міт-карнавал па п'есе Вінісіўса дэ Мараэша.

Гісторыя Арфэя перанесена ў карнавальны Рыё-дэ-Жанэйра. Сучасны Арфэй (Брэна Мэлу) — кандуктар трамвая і гітарыст. У яго ёсьць нявеста (Люрд да Алівэйру), якая кожны дзень жыве як на карнавале, — але герой захапляецца Эўрыдыкаю (Марпэса Доўн).

Фільм параўновалі з вытанчаным «Арфэем» Жана Както — але Марсэль Камю пераклаў грэцкі міт на мову бразыльскай жарсьці.

Карціна атрымала «Залатую пальму» ў Канах і прэмію «Оскар».

**СТВ, 23.40**

«Кругласутачныя тусоўшчыкі».

Вялікабрытанія—Францыя—Галяндыя, 2002, рэж. Майкл Уінтэрботам.

Драма.

Манчэстэр, 1976 год. Выпускнік Кембрыджу Тоні Ўілсан, натхнёны канцэртам «Sex Pistols», разам зь сябрамі засноўвае гуказапісвальную студыю…

Фільм Уінтэрботама («Чароўная краіна») — кактэйль музыкі, сэксу, наркотыкаў і сюрных казінавых сноў, зроблены на падставе рэальных падзей.

Намінацыя на «Залатую пальму» ў Канах, прыз Брытанскага незалежнага кіно.



## Нядзеля, 24 ліпеня

**БТ, 19.15**

«1001 рэцэпт закаханага кулінара».

Францыя—Грузія—Украіна—Бэльгія, 1997, рэж. Нана Джарджадзэ.

Трагікамэдыя.

Апэтытная, камічная й трагічная гісторыя кулінара-авантурыста Паскаля (П'ер Рышар), якога лёс закінуў у Грузію 1920-х гадоў — з рэвалюцыямі, закалотамі, пілігрымкамі й войнамі. Паскаль і ня думаў, што сустрэне сваё каханьне, а рукапіс пра ягоныя прыгоды захаваецца да нашых дзён.

Камэдыйная культура Францыі (у асобе П'ера Рышара) сустракаецца з грузінскай школай трагікамэдыі.

Карціну ні ў якім разе ня трэба прапускаць.

**БТ, 22.05**

«Леон».

Францыя—ЗША, 1994, рэж. Люк Бэсон.

Крымінальная драма.

Суворы кілер Леон (Жан Рэно) праяўляе клопат да сіраты (Наталі Портман), бацькоў якой забілі кепскія паліцыянты (Гэры Олдман). Сірата мае жаданьне навучыцца прафэсіі кілера.

Карціна Люка Бэсона пра душагуба з чалавечым сэрцам — годнае й прафэсійнае кіно.

**СТВ, 22.10**

«Вяртаньне».

Расея, 2003, рэж. Андрэй Зьвягінцаў.

Драма.

Да двух братоў нечакана вяртаецца бацька, знаёмы ім толькі па фатаграфіях. Бацька вязе дзяцей на закінутую выспу і наладжвае выпрабаваньне.

Фільм Андрэя Зьвягінцава — сэнсацыя міжнародных фэстываляў.

Вэнэцыянскі прыз 2003 году.

**Андрэй Расінскі**

## ВЫСТАВЫ

**«Натурморт»**
**28 ліпеня** а 17.00 у Палацы мастацтваў (Казлова, 3) вэрнісаж «Натурморт». У экспазыцыі — працы з фондаў Беларускага саюзу мастакоў, а таксама працы сучасных аўтараў.

**Шчамялёў**
У Менскай мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва, што на праспэкце Ракасоўскага, да **20 жніўня** працуе фотавыстава «Менск: аблічча гораду». Уваход вольны.

**Жыжаль**
Каля Бабруйску, у «Вярбках», базе адпачынку «ФанДАКу», **да 4 жніўня** праходзіць III Міжнародны пленэр па кераміцы «Art-жыжаль».

**Станюта**
**Да 1 верасьня** ў Музэі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (Музычны завулак, 5) працуе выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю Стэфаніі Станюты.

**Кашкурэвіч**
**Да 25 жніўня** ў Мастацкім музэі — выстава твораў Арлена Кашкурэвіча «Concerto Grosso».

## ТЭАТРЫ

**У Маладэчне**
Прэм'ера спэктаклю **Менскага абласнога драматычнага тэатру** (Маладэчна, вул.Чкалава, 7) «Фантазія ля-мінор» па п'есе Ўладзімера Драздова — псэўданім беларускага дыплямата Ўладзімера Шчаснага.
Спэктакль распавядае пра жыцьцёвы шлях знакамітага палітыка й кампазытара Міхала Клеафаса Агінскага.
22 ліпеня — а 19-й, 23 і 24 ліпеня а 17-й.
Даведкі праз тэлефон: 8-01773-5-24-17.

**Купалаўскі тэатар**
**21, 22** (чц, пт) — «Чычыкаў».

**Тэатар імя Горкага**
**21** (чц) — «Дзядзечкаў сон».
**22** (пт) — «Суцяшальнік удоў».
**23** (сб) — «Анджэла і іншыя».

**Тэатар-студыя кінаактора**
**21, 22** (чц, пт) — «Поле бітвы».
**23, 24** (сб, ндз) — «Пігмаліён».
**25, 26** (пан, аўт) — «Майстар і Маргарыта».

## СПОРТ

**24—26 ліпеня** у Горках пройдзе Адкрыты турнір па конным спорце (пераадольваньне перашкод) памяці майстра спорту А.Зелянка.

## ФЭСТ



**«Вудсток» пад Полацкам**
29—30 ліпеня пад Полацкам, ля вёскі Лучна на беразе Дзьвіны, пройдзе музычны фэст «АЯ-САМР» з удзелам больш чым 20 гуртоў, у тым ліку «Крамы» і «Indiga». Абяцаецца сучаснае сьвятлавое афармленьне і відэапраектар з экранам, даезд удзельнікаў зьлёту зь Менску і Полацку, вызны гандаль. Пажадана прыяжджаць са сваімі намётамі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# І кола замкнулася

У **Музэі гісторыі беларускае літаратуры** (вул. Багдановіча, 15) праходзіць **выстава «Кола часу»**. Гэта ўнікальная экспазыцыя прыватнае калекцыі прадпрымальніка з Бабруйску Сяргея Шылы. Тут можна ўбачыць больш за восем сотняў самых розных рэчаў, што некалі служылі нашым продкам — вяскоўцам і месьцічам.

Тутака і прасы, вагою пад 10 кг, і шавецкія машынкі, і нажніцы, начоўкі, косы, сярпы, пралкі, часалкі. Можна таксама паслухаць старасьвецкія патэфоны з грамафонамі. Назва выставы паходзіць ад вялікае калекцыі колаў, калёсаў, калаўротаў, кружэлак ды іншых круглых рэчаў, што калекцыянэр зьбіраў цягам 15 гадоў. Ён і аформіў выставу, выявіўшы дызайнэрскі густ і немалы цяслярскі досьвед.

Знаёмства з гэтай выставаю можа натхніць любога, хто мае дзе складаваць такія вялікія рэчы. Азірніцеся навокал — можа, дзе ў вас пад лаваю й знойдзецца старая сякера, бацькавы кросны ці дзедава люлька. Кожная з гэткіх рэчаў можа зьмяніць сьвет вашых захапленьняў і стаць пачаткам яшчэ аднаго музэйнага збору...

**СХ**

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**X-Ray** (223-93-55)
**22** (пт), 23.00 — «Fabulous Fashion»: dj Devon Collins (Riga), LP aka Paliony.
**23** (сб), 22.00 — dj-bar.

**Bronx** (288-10-61, GSM «Velcom»: 103 і 105)
**22** (пт), 21.45 — «Acoustic Band» /dj Bergamo.
**23** (сб), 22.00 — dj Mitya, dj Laurel.
**29** (пт), 22.00 — «Acoustic Band».

**Ізюм** (206-66-18, 605-25-25)
**22** (пт), 22.00 — «Love party»: dj Lexa.
**23** (сб), 22.00 — «Fusion party»: dj Jerry B.

**Белая вежа** (284-69-22, 239-16-00)
**22** (пт), 23.00 — «Acoustic Band» /dj Dee, dj Mixell.
**23** (сб), 1.00 — dj Mixell, dj Alex.
**24** (ндз), 23.00 — «Acoustic Band».
**31** (ндз), 23:00 — «Acoustic Band».

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Бэтмэн: пачатак» (прэм'ера): **22—24** (пт—ндз) 13.20 (іл), 16.00, 18.30, 21.10.
«Гарэлка-лімон» («Кінафармат 4х4»): **22** (пт) 17.00, 19.00, 21.00.
«Ікаўка» («Кінафармат 4х4»): **23** (сб) 17:00, 19.00, 21.00.
«Ключы ад машыны» («Кінафармат 4х4»): **24** (ндз) 17:00, 19:00, 21:00.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Жмуркі»: **22** (пт) 14.00, 19.00 (іл), 21.10; **23, 24** (сб, ндз) 14.00, 19.00, 21.10.
«Адзін у цемры»***: **22** (пт) 16.30 (іл); **23, 24** (сб, ндз) 16.30.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Вайна сусьветаў»: **22— 24** (пт—ндз) 18.00 (іл), 21.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Бэтмэн: пачатак» (прэм'ера): **22** (пт) 15.50, 18.20, 21.00; **23, 24** (сб, ндз) 13.20 (іл), 15.50, 18.20, 21.00.

**«Масква»** (203-14-48)
«Бэтмэн: пачатак» (прэм'ера): **22** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **23, 24** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Мір»** (288-22-33)
«Жмуркі»: **22—24** (пт—ндз) 21.20.
«Вайна сусьветаў»: **22, 23, 24** (пт, сб, ндз) 15.00, 17.10, 19.10.
«Ключы ад машыны» («Кінафармат 4х4»): **22** (пт) 16.20, 18.30, 20.40.
«Гарэлка-лімон» («Кінафармат 4х4»):**23** (сб) 16.20, 18.30, 20.40.
«Мора ўсярэдзіне» («Кінафармат 4х4»): **24** (ндз) 16.20, 18.30, 20.40.

**«Перамога»** (203-77-66)
«Жмуркі»: **23** (сб) 14.40 (іл); **24** (ндз) 15.00 (іл).
«Ікаўка» («Кінафармат 4х4»): **22** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
«Мора ўсярэдзіне» («Кінафармат 4х4»): **23** (сб) 16.40 (іл) 19.00 21.15.
«Гарэлка-лімон» («Кінафармат 4х4»): **24** (ндз) 17.00 (іл) 19.00 21.00.

**«Піянэр»** (227-64-87)
«Містэр і місіс Сьміт» (2с): **22—24** (пт—ндз) 16.00, 18.30, 21.00.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Вайна сусьветаў»: **22** (пт) 11.30, 13.50, 16.10; **23, 24** (сб, ндз) 12.00 (іл), 14.20, 16.40.
«Мора ўсярэдзіне» («Кінафармат 4х4»): **22** (пт) 18.30 21.00.
«Ключы ад машыны» («Кінафармат 4х4»): **23** (сб) 19.00, 21.00.
«Ікаўка» («Кінафармат 4х4»): **24** (ндз) 19.00 21.00.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## КІНО ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**«Аўрора»**
«Тарзан»: **22** (пт) 10.30; **23, 24** (сб, ндз) 15.00.

**«Берасьце»**
«Кевін у Краіне драконаў»: **22** (пт) 11.00; **23, 24** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**
«Полі»: **22** (пт) 10.30; **23, 24** (сб, ндз) 13.00.
«Я — Цэзар»: **22** (пт) 13.00; **23** (сб) 15.00; **24** (ндз) 11.00.
«Падводная братва»: **22, 24** (пт, ндз) 15.00, **23** (сб) 11.00.

**«Мір»**
«Алёша Мяповіч і Тугарын Зьмей»: **22** (пт) 10.30.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **22—24** (пт—ндз) 14.00.

**«Піянэр»**
«Дунечка»: **22** (пт) 10.20; **23, 24** (сб, ндз) 14.00.
«Лебядзінае возера»: **22—24** (пт—ндз) 12.20.
«Кніга джунгляў-2»: **22** (пт) 14.00; **23, 24** (сб, ндз) 10.20.

## КІНО НА DVD

**Master Records**
«Пякельны ліфт»
Фантасмагорыя-трылер з элемэнтамі антыўтопіі, Японія, 2004, рэж. **Хірокі Ямагучы.**
У ролях: **Лючына Фуджысакі, Ёшыічы Каўада.**
У падземным ліфце разам са звычайнымі пасажырамі перавозяць двух небясьпечных маньякаў. Ліфт ламаецца...
Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Хто там шнуруе ля вежы



«Бэтмэн: пачатак» («Batman Begins»)
ЗША, 2005, каляровы, 140 хв.

**Жанр:** псыхалягічны комікс, трылер, прыгоды.
**Адзнака:** 5,5 (з 10).

Пасьля гатычных коміксаў Тыма Бёртана кінасэрыял «Бэтмэн» выдыхнуўся — і на рэанімацыю супэргероя запрасілі таленавітага рэжысэра Крыстафэра Нолана, які праславіўся выкшталцоным трылерам «Памятай». Ролю Бэтмэна прапанавалі актору Крыстафэру Бэйлу, які мае неблагі досьвед у стварэньні характараў з «двайным дном» («Амэрыканскі псыхапат», «Машыніст»).

Падобны выбар забясьпечыў коміксу нечаканую псыхалягічную глыбіню і змрочна-рэалістычную, псыхіятрычна-фантазійную атмасфэру.

У карціне «Бэтмэн: пачатак» апавядаецца, як мільярдэр Брус Уэйн дайшоў да начнога жыцьця, пачаўшы лётаць над горадам Готхамам. Прычына — траўма дзяцінства, калі бацькі Ўэна былі забітыя ліхадзеем, а хлопчык быў напалоханы рукакрылымі.

У недаравальна нудным пачатку фільму Брус Уэйн аднаўляе справядлівасьць (у турме), пакутуе — і трапляе ў Лігу ценяў, дзе навучаецца розным фокусам. Але толькі кінуўшы кампанію ніндзяпсыхапатаў (на чале з Лаямам Нісанам), герой знаходзіць сябе, вяртаецца ў Готхам — і распачынаецца сапраўднае дзеяньне.

Пакараньне крымінальнікаў, наркотыкі, дзіўная зброя і інтрыгі па атручваньні гарадзкой каналізацыі, бэтмамабіль-танк — і мудры Морган Фрымэн у якасьці геніяльнага вынаходніка. Цікава, што Геры Олдман засьвяціўся ў нязвыклай для сябе ролі добрага паліцэйскага. Маецца й рамантычная лінія, але цікавейшыя псыхіятрычныя кашмары і ўвасобленыя жахі.

Некаторыя сцэны даволі відовішчныя, а эпізод з кажанамі ў пячоры, калі іх ліхаманкавая чарада абляпляе Крыстафэра Бэйла, — проста выдатны.

Амэрыканцы, як зацятыя індывідуалісты, ад карціны ў захапленьні. Для беларускага гледача гэта трохі чужое сьвята, але кіношнае і зусім ня сумнае.

**Андрэй Расінскі**

# Базар канцэпцый

ЛЕВЫМ ВОКАМ



«Славянскі базар» як fucktap сусьветнай культуры.
Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Самае прыкольнае ў гісторыі віцебскага фэстывалю «Славянскі базар» — амаль штогадовая зьмена канцэптаў. Калі верыць афіцыйнаму сайту мерапрыемства, фэстываль пачынаўся як звычайны камэрцыйны праект, потым стаў гештальтам саюзу Беларусі і Расеі (2002), потым — сымбалем «мірнай садружнасьці славянскіх народаў» (2004).

Сёлета — чарговыя перамены. Як адзначыў Выдатны Канфэрансье, адкрываючы сьвята ў Віцебску, «Славянскі базар» разьмяняў статус — быў прымітыўна шэрым «сапраўды славянскім сымбалем», а цяпер трансфармуецца не ў якое-небудзь хухры-мухры, а ў «фактар сусьветнай культуры». Цяпер яго галоўная фішка — антыглябалізм: «Як да чыстай крыніцы, зьвернуты да фэстывалю погляды славянаў і нашых народаў-сяброў, якія не жадаюць раствараццца ў моры глябалізацыі», — адзначыў найлепшы сябар беларускіх каняводаў.

Самае цікавае, што ядро сталых удзельнікаў віцебскага шоў застаецца амаль тым самым — расейскія і беларускія папсавікі. Рэпэртуар іх таксама ня вельмі мяняецца, і яны добра ўсьведамляюць, пад што падпісваюцца.

Такім чынам, словы Саладухавай песьні «Пацалаваць так хочацца дочкі маёй глаза» ў сярэдзіне 1990-х трэба было ўспрымаць як адкрытае жаданьне чыста нашаткаваць капусты, у 2002 г. — як праяву афіцыйнай сымпатыі да расейска-беларускага сяброўства, у 2004 г. — як заклік да славянаў жыць у згодзе. Нарэшце, сёньня — як праяву салідарнасьці з антыглябалістамі. Сапраўды, было б вельмі файна, каб апошнія, пратэстуючы супраць вайны ў Іраку, кінулі ленанаўскую «Give peace a chance» і перайшлі на «Здравствуй, чужая милая».

Ня менш цікавы тэзіс пра тое, што фэстываль становіцца фактарам сусьветнай культуры.

Прызнаюся, я ведаю толькі адзін спосаб, як «Віцебскі базар» можа стаць фактарам сусьветнай культуры. Нейкая нецьвярозая камэта або астэроід-ліхач, рухаючыся па Мілкіўэй, захоча падрэзаць нашу плянэту, вынікам чаго стане касьмічнае ДТЗ. Як вынік, пасажыры Зямлі абыдуцца лёгкім Армагедонам. Праз колькі стагодзьдзяў чалавецтва неяк ачухаецца і пачне шукаць свае гістарычныя карані. На руінах былога Віцебску археолягі знойдуць амфітэатар «Славянскага базару» і цудам захаваную фанаграму Руслана Аляхно. Радасьці нашых нашчадкаў ня будзе ліміту: гэта адзіныя ў сьвеце музычныя запісы пачатку XXI ст., што захаваліся! Натуральна, запісы Аляхно ўключаць у рэпэртуар усіх кансэрваторый і будуць ставіць іх студэнтам калы, калі тыя неназавуць, у якой па ліку «Фабрыцы зорак» Аляхно быў удзельнікам.

Будзем мець надзею, што да гэтага жудаснага сцэнару справа ня дойдзе, і ў 2006 годзе канцэпцыя сьвята набудзе менш глябальныя контуры. І той жа Саладуха прысьвеціць сваю «Чужую милую» чарговаму абстрактнаму адзінству славянскай расы.




**Старшыня Камітэту дзяржкантролю Анатоль Тозік адрапартаваў аб выніках сваёй дзейнасьці ў якасьці старшыні Дзяржаўнай камісіі па кантролі за прыёмнымі іспытамі ў ВНУ. Нягледзячы на па-эўрапейску пазытыўныя вынікі, на прэс-канфэрэнцыі А.Тозік выглядаў па-савецку панурым.**

## ЖАРТ

Размова дваіх дзяцей:
— Твае бацькі мульцікаў баяцца?
— Не.
— А мае баяцца. Як толькі мульцікі пачынаюцца — лезуць з галавой пад коўдру ды так дрыжаць!
*http://dt.home.by*

**24 ліпеня (нядзеля)**
па маршруце: Менск—Горадня—Сьвяцак—Аўгустоўскі канал—Менск.
**Т.: 232-54-58; 622-57-20 (Зьміцер)**
**264-12-38; 776-24-35 (Павал)**

Ліцэнзія №02310100189 ад 24 траўня 2001 году
**АЛЬТУС ПЛЮС**
Наведайце разам з намі
Самыя прыгожыя замкі Ўкраіны
**Камянец-Падольскі і Хоцін**
**19—22 жніўня**
**Праграма туру**
Адпраўленьне зь Менску а 18-й.
**1-шы дзень**
Прыбыцьцё ў Камянец-Падольскі;
Разьмяшчэньне ў гатэлі турклясы;
Паездка ў **«Крышталёвыя пячоры»**;
Экскурсія ў **Хоцінскую крэпасьць**;
**2-гі дзень**
Аглядная пешаходная экскурсія па старажытным Камянцы;
Экскурсія ў Катэдральны касьцёл;
Экскурсія ў Старую крэпасьць;
**Прыбыцьцё ў Менск зранку**
Кошт туру 45 у.е. + 22 000 рублёў.
У кошт уваходзяць транспартныя паслугі, пражываньне ў гатэлі турклясы, экскурсійнае абслугоўваньне.
Уваходныя квіткі аплачваюцца дадаткова.
Адрас: Менск, вул.Кастрычніцкая, 5-320
Т.: 222-46-51

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Віншуем дзядзьку **Антона Шукелойця** з 90-годзьдзем. Зычым моцнага здароўя і аптымізму.

Нашаніўцы

### ВІТАНЬНІ

**Зьмітра Дашкевіча,** лідэра «Маладога фронту», з днём нараджэньня віншуюць яго сябры па змаганьні за Беларусь. Заставайся заўжды рашучым, упэўненым і ня траць веры!

**Са сьвятам,** дарагі Дзіма Дашкевіч! Мы цябе вельмі любім, ганарымся і паважаем. Жадем, каб усе твае мары зьдзейсьніліся. Твае сябры Барыс, Артур, Павал, Алесь, Кірыл, Аляксей, Наста, Кастусь…

### КАНТАКТЫ

**Мужчына 25 год** пазнаёміцца зь беларускамоўнай дзяўчынай. Зь яскравай зьнешнасьцю і агнявым характарам. 20—30-ці год. Т.: 753-27-03. Андрэй

**Шукаю** адзіную, непаўторную і самую прыгожую беларусачку! Пра сябе: Алесь, 23/180, мянчук, шчыры беларус; пішу вершы, цікаўлюся гісторыяй. Чакаю лістоў: e-mail: a.kushner@tut.by

**Шукаем** беларускамоўнага тамаду на вясельле. Т.: 680-71-52

**Прывітаньне** ўсім нясьвіскім «кратам» з Горадні: што не зрабілі швэды ў Нясьвіжы ў 1706-м — зробім мы ў 2005-м! Ружовы крот

**«Малады фронт»** за Беларусь! Далучайся да эўрапейскай моладзі! www.mfront.net, т.755-69-90, 708-02-99

### КНІГІ

**Кнігаабмен**: 753-91-96

**Новыя ды рэдкія кнігі**, часопісы, кнігі для дзяцей; фільмы на CD, мультфільмы на касэтах; беларуская музыка; значкі, налепкі на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак — пятніца (16.30—19.30) Т.: 707-40-01

Прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна даслаць поштай (а/с 537, 220050, Менск), праз e-mail на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на с. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 $см^2$ — 650 руб.

Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.

На зваротным баку блянка паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

**Даведкі праз т. (017) 284-73-29**

Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
**Наклад** 3293. **Газэта выдаецца 48 разоў на год**.
Нумар падпісаны ў друк 20.00 20.07.2005.
Замова № 4152.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а